



## Ад укладальніка

Шаноўныя сябры! Вы трымаеце ў руках унікальны беларускі каляндар-даведнік. Канцэпцыя яго складання досыць простая — каб ён быў прыдатны ў кожны каляндарны год. Цягам дзесяцігоддзя аўтар натаваў славутыя і трагічныя даты беларускай гісторыі, адметныя падзеі і з’явы, дні нараджэння і смерці айчынных дзяржаўна-палітычных, рэлігійных і культурных дзеячаў, знакамітых людзей, якіх звязаў лёс з беларускай зямлёй і тых, што апынуліся за межамі роднай краіны, асобаў, што ў розных сферах праславілі Беларусь, паўстанцаў розных нацыянальна-вызваленчых чынаў і сціплых малавядомых рупліўцаў беларушчыны, імёны якіх, на жаль, яшчэ не змяшчаюць энцыклапедычныя выданні. У календары пададзены таксама некаторыя дзеячы іншых краінаў, што спрыялі беларускаму культурнаму ці нацыянальна-вызваленчаму руху. Пазначаны і розныя сусветныя і міжнародныя дні.

Безумоўна, выбар датаў і персаналій мае ў значнай ступені суб’ектыўны характар. Галоўным крытэрыем адбору асобаў служыла прыналежнасць да беларускага руху ў розных яго праяўленнях (удзел у нацыянальна-вызваленчых паўстаннях, падпольных рухах, палітычных, грамадскіх, рэлігійных, культурных арганізацыях; асветніцкая, душпастырская, навуковая, пісьменніцкая, публіцыстычная дзейнасць; спартыўныя дасягненні). У дачыненні да часоў сярэднявечча аўтар кіраваўся, так бы мовіць, “ліцвінскім патрыятызмам” (дачыненнем да Вялікага княства Літоўскага). Што датычыць падзей, то яны адбіраліся найперш паводле агульнанацыянальнай гістарычнай значнасці. Прытым каляндар змяшчае

і розныя падзеі лакальнага характару, якія, на думку аўтара, яшчэ не ацэненыя належна на агульнанацыянальным узроўні. Пададзены тут таксама даты адкрыцця розных музеяў і навучальных устаноў, выхаду з друку грамадска-палітычных выданняў, дні найбольш масавых мітынгаў і дэманстрацый навейшага часу, адметных культурных падзеяў, важкіх дасягненняў беларускіх спартсменаў.

Разам з тым, у календары не знайшлі адлюстравання многія значныя падзеі айчыннай гісторыі, найперш з прычыны адсутнасці зафіксаванай даты, “прывязкі” да канкрэтнага дня ці дзён. Тое ж датычыць і асобаў, даты нараджэння і смерці якіх невядомыя. Няма тут і жывых беларускіх дзеячаў, якія працягваюць працаваць у нашы дні.

У даведніку падаецца агульная і сціслая інфармацыя пра падзеі ці асобы. Пры разыходжанні звестак, пададзены альбо розныя версіі, альбо найбольш верагодныя даты і назвы мясцовасцяў. Акрамя дат змешчаны дакладныя ці прыблізныя месцы нараджэння і смерці людзей, калі яны вядомыя, а таксама месцы пахавання. Адно з найважнейшых заданняў календара — “прывязаць” падзеі і асобаў да канкрэтных мясцінаў. Даты падаюцца толькі паводле новага (грыгарыянскага) стылю. Калі дакладная дата нараджэння ці смерці невядомая, падаецца месяц і год альбо толькі год; калі невядомы і год, альбо ён выклікае сумненне — стаіць пытальнік. Пры адсутнасці дакладных звестак змешчаны прыблізныя (напрыклад, 1920-я гг.) або абмежавальныя (пасля 1940 г.). Вельмі верагодна, што ў каляндар не патрапілі пэўныя важныя падзеі і некаторыя вартыя ўшанаванні асобы. Дакладныя даты нараджэння і смерці многіх дзеячаў, на жаль, да гэтага часу невядомыя. Дадатковую складанасць часта стварае блытаніна старога і новага стыляў у розных крыніцах. Аўтар будзе ўдзячны ўсім за дасланыя ўдакладненні, папраўкі, прапанаваныя дадаткі, якія змогуць быць улічаны ў наступных выданнях. Ліставаць просьба на адрас: 230023, г. Гродна, а/с № 121, альбо праз электронную пошту: khilmanovich@tut.by.

У канцы 1990-х адна з пачатковых версій календара ў выглядзе цягам колькіх гадоў выходзіла ў тэлевізійным варыянце ў аўтарскай праграме “Кронан” па Гродзенскаму тэлебачанню.

Каляндар-даведнік адрасаваны перш за ўсё зацікаўленым у беларушчыне і нацыянальным Адраджэнні людзям — настаўнікам, краязнаўцам, навукоўцам, работнікам культурных установаў, сябрам грамадскіх арганізацыяў.

Хачу выказаць шчырую падзяку за прадастаўленыя матэрыялы і выданні, каштоўныя парады і сяброўскую падтрымку **Таццяне Казак** з Рыгі, **Алене Глагоўскай** з Гданьска, **Яўгену Вапу** і **Марціну Рэмбачу** з Беластоку, **Хведару Нюньку** з Вільні, **Віктару Сазонаву**, **Аркадзю Жукоўскаму**, **Янку Трацяку** і **Андрэю Чарнякевічу** з Гродна, **Лявону Карповічу** з Луны, **Сяргею Чыгрыну** са Слоніма, **Алене Макоўскай**, **Алегу** і **Наталлі Гардзіенкам**, **Сяргею Яршу** з Мінска.

*Уладзімір Хільмановіч*

# БЕЛАРУСКІ

## КАЛЯНДАР–ДАВЕДНІК



## НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

Вільня, Gudas, 2007

УДК [274/278+94] (476)
ББК 63.3 (4 Беи)
Б 43

У к л а д а л ь н і к

*Уладзімір Хільмановіч*

Каляндар выдадзены па заказу Міжнароднага грамадскага аб’яднання «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына».

Міжнароднае грамадскае аб’яднанне “Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына” і ўкладальнік Уладзімір Хільмановіч выказваюць шчырую падзяку за дапамогу ў выданні календара-даведніка Ірэне Калядзе-Смірновай, кіраўніку дабрачыннага фонду “Ethnic Voice of America”, ЗША.

ISBN 998-6952-02-2

© Хільмановіч У., укладанне, 2007
© МГА «ЗБС «Бацькаўшчына», 2007

KAMUNIKAT.org

# СТУДЗЕНЬ

## 1 студзеня

**1467** Нарадзіўся **Жыгімонт I Стары**, кароль польскі і вялікі князь літоўскі (1506–1548).

**1831** Расійскія ўлады адмянілі дзеянне Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях.

**1861** Нарадзіўся **Яўхім Карскі** (в. Лаша, цяпер Гродзенскі р-н *), філолаг-славіст, мовазнавец, літаратуразнавец, фалькларыст, этнограф, палеограф, археограф, бібліёграф, педагог, заснавальнік навуковага беларусазнаўства.

**1904** Нарадзіўся **Мечыслаў Багаткевіч** (маёнт. Крыкалы, цяпер Пастаўскі р-н), каталіцкі рэлігійны дзеяч. Расстраляны гестапаўцамі, пазней беатыфікаваны.

**1919** У Смаленску абвешчана Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь.

**1919**(?) У Вільні заснавана беларуская гімназія.

**1920** Нарадзіўся **Барыс Рагуля** (в. Турэц, цяпер Карэліцкі р-н), дзеяч нацыянальнага руху ў 1940-х гг., намеснік прэзідэнта Беларускай Цэнтральнай Рады на Навагрудскую акругу (1944), дзеяч эміграцыі ў Бельгіі і Канадзе, віцэ-прэзідэнт Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

**1927** Нарадзіўся **Кастусь Рамановіч** (в. Лозкі, цяпер Навагрудскі р-н), удзельнік падпольнага Саюза Вызвалення Беларусі ў Навагрудку, вязень савецкіх канцлагераў.

**1929** У Мінску адкрылася Беларуская Акадэмія Навук (з 1991 г. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі).

**1932** Нарадзіўся **Часлаў Цыбоўскі** (г. Смаргонь), удзельнік антыкамуністычнага падпольнага вучнёўскага руху ў Смаргонях ў 1949–1950 гг. Памёр у польскім г. Дзержанюў (Dzierżaniów), дзе і пахаваны (1978).

**1933** У Вільні выйшаў першы нумар газеты “Родны край”, орган Таварыства Беларускай Асветы (выдавалася да 29 лістапада 1936 г.).

**1961** Нарадзіўся **Ігар Гермянчук** (в. Стракавічы, Светлагорскі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, галоўны рэдактар газетаў “Свабода” (1991–1997), “Навіны” (1998–1999), часопіса “Кур’ер” (2000–2002).

---

* Усе месцы па магчымасці падаюцца паводле сённяшняга адміністрацыйнага падзелу.



Пячатка Сафіі Юр’еўны Алелькаўны, князёўны слуцкай

## 2 студзеня

**1864** У Вільні павешаны **Ігнат Здановіч** і **Мечыслаў Дарманоўскі**, удзельнікі кіраўніцтва вызваленчага паўстання 1863–1864 гг.

**1880** Памёр **Бранiслаў Залескі**, мастак, пісьменнік, удзельнік вызваленчага руху, палітычны ссыльны.

**1920** У Янагрудзе на Полаччыне памёр **Францішак Будзька**, каталіцкі святар.

**1928** Нарадзіўся **Уладзімір Цвірка** (да 1945 г. **Вадзім Сурко**; в. Беражное, цяпер Карэліцкі р-н), дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі, Бельгіі і Нямеччыне, журналіст.

**1946** У Бутырскай турме (Масква) закатаваны **Фабіян Абрантовіч**, пралат, уніяцкі святар, грамадска-культурны дзеяч, філосаф, педагог.

**1981** Заснавана беларускае выдавецтва для дзяцей “Юнацтва”.

**1986** Памёр **Уладзімір Тарасевіч**, рэлігійны і грамадскі дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**2000** У Мінску скончыла жыццё самагубствам **Таццяна Самусенка**, фехтавальшчыца, трохразовая алімпійская чэмпіёнка (1960, 1968, 1972).

## 3 студзеня

**1779** Нарадзіўся **Францішак Дзержынскі** (г. Орша), рэлігійны дзеяч, адзін з пачынальнікаў адукацыйнай сістэмы каталіцкай царквы, заснавальнік універсітэтаў у ЗША.

**1905** Нарадзіўся **Уладзімір Хадыка** (в. Цітава, цяпер Пухавіцкі р-н), паэт, перакладчык.

**1908** Нарадзіўся **Мікола Нікан** (Варшава), настаўнік, вайсковец, дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі і Аўстраліі.

**1918** Рада Усебеларускага з’езда абрала Выканаўчы камітэт.

**1924** У Шаркоўшчыне памёр **Зянон Якуць**, каталіцкі святар.

**1938** Расстраляны **Мікалай Багародскі**, гісторык і краязнавец.

**1944** Нарадзіўся **Міхась Раманюк** (в. Кавалі, цяпер Брагінскі р-н), мастак, мастацтвазнавец, этнограф.

**1956** Памёр **Павел Трамповіч**, грамадскі дзеяч, лекар, вязень савецкіх турмаў.

## 4 студзеня

**1729** Нарадзіўся **Яўхім Храптовіч** (маёнт. Ясянец, цяпер Баранавіцкі р-н), грамадска-палітычны, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, публіцыст, паэт, перакладчык.

**1869** Нарадзіўся **Ядвігін Ш** (сапр. **Антон Лявіцкі**; маёнт. Добасня, цяпер Кіраўскі р-н), пісьменнік, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч.

**1975** Памёр **Юрка Віцьбіч** (сапр. **Серафім Шчарбакоў**, на эміграцыі — **Юры Стукаліч**), пісьменнік,

грамадска-культурны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахаваны на беларускіх могілках у Саўт-Рыверы (Нью-Джэрсі, ЗША).

## 5 студзеня

**1810** Памёр **Казімір Рагоўскі**, тэолаг-езуіт, філосаф, педагог.

**1875** Памёр **Адам Завадскі**, віленскі друкар і выдавец.

## 6 студзеня

**1610** Памёр **Андрэй Волан**, грамадскі дзеяч, філосаф, правазнавец, пісьменнік. Пахаваны ў Біюцішках. Нарадзіўся ў маёнт. Біюцішкі, цяпер Ашмянскі р-н (1530).

**1892** Нарадзіўся **Адам Станкевіч** (в. Арляняты, цяпер Смаргонскі р-н), рымска-каталіцкі святар, грамадска-культурны дзеяч, асветнік, культуролаг, літаратуразнавец, выдавец, публіцыст.

**1914** Нарадзіўся **Тодар Лебяда** (сапр. **Пятро Шырокаў**, г. Віцебск). Пісьменнік, дысідэнт, вязень ГУЛАГу. Памёр у пач. 1970 г., пахаваны ў пасёлку Воршава (Пуцяцінскі р-н, Разанская вобл., Расія).

**1919** Нарадзілася **Аўгіння Каранеўская** (дзявоч. **Воўк-Леванові**ч; маёнт. Ясны Лес на Бабруйшчыне), настаўніца, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

**1943** У Мінску ў турме памёр **Антон Неманцэвіч**, уніяцкі святар, царкоўны дзеяч, вязень савецкіх і фашысцкіх турмаў.

**1945** У Швейцарыі памерла **Магдалена Радзівіл**, дзеяч культурнага руху, мецэнатка.

**1963** У Падмаскоўі памёр **Андрэй Александровіч**, пісьменнік, вязень савецкіх канцлагераў. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**2004** У Нью-Йорку памёр **Янка Юхнавец**, пісьменнік, дзеяч эміграцыі ў ЗША. Паводле ягонага тастаменту, цела было спалена, а попел развеяны ў Нью-Йорку.

## 7 студзеня

Каляды (Раства Хрыстова) па праваслаўным (юльянскім) календары

**1896** Нарадзіўся **Яўхім Кіпель** (в. Байлюкі, цяпер Глускі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1916** Нарадзіўся **Уладзімір Сіўко** (Мінск), дзеяч нацыянальнага руху, вязень ГУЛАГу, паэт.

**1917** Нарадзіўся **Святаслаў Коўш** (мяст. Ілья, цяпер Вілейскі р-н), праваслаўны святар, пісьменнік, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1921** Нарадзіўся **Яўген Кавалеўскі** (Масква), драматург, культурны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Францыі. Памёр у Парыжы (1963).

**1929** У Мінску пачалася Другая ўсебеларуская краязнаўчая канферэнцыя (доўжылася да 12 студзеня, прысутнічалі 72 дэлегаты), дзе вызначаны прыярытэты краязнаўчай працы.

**1950** У Сіднеі (Аўстралія) пачаў працаваць першы Беларускі Клуб.

**1964** Памёр **Янка Журба** (сапр. **Івашын**), паэт, перакладчык. Пахаваны на Ксавер'еўскіх могілках у Полацку.

**1976** У Ельску адкрыўся краязнаўчы музей.

**1991** Памёр **Кандрат Крапіва** (сапр. **Атраховіч**), драматург, паэт, мовазнавец. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**1995** У Нью-Йорку памёр **Мікола Панькоў**, журналіст, бібліяфіл, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

## 8 студзеня

**1879** Нарадзіўся **Флягонт Валынец** (г. Вілейка), дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху.

**1894** Нарадзіўся **Максіміліян Кольбэ** (г. Здуньска Воля, цяпер Лодзінскае ваяв., Польшча), рэлігійны дзеяч, святы каталіцкай царквы, замучаны ў фашысцкім канцэнтрацыйным лагеры. У 1922–1927 гг. служыў у Гродзенскім кляштары францішканцаў.

**1911** Нарадзіўся **Уладзімір Дудзіцкі** (сапр. **Гуцька**; в. Дудзічы, цяпер Пухавіцкі р-н), пісьменнік, журналіст, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Венесуэле і ЗША. Паводле некаторых звестак, у 1976 г. вярнуўся ў СССР і бясследна знік.

**1936** Нарадзіўся **Генадзь Каханоўскі** (в. Дамашы, цяпер Маладзечанскі р-н), гісторык, краязнавец, літаратуразнавец.

**1943** У савецкім канцлагеры памёр **Янка Бабровіч**, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, публіцыст.

**1980** Памёр **Кастусь Кіслы**, кампазітар, музыкант, дырыжор, дзеяч эміграцыі ў Бельгіі і ЗША. Пахаваны на праваслаўных могілках у Беластоку-Выгодзе.

## 9 студзеня

**1747** Памёр **Ігнат Кульчынскі**, уніяцкі царкоўны дзеяч, гісторык. Нарадзіўся ў Гродне (1707).

**1801** Нарадзіўся **Восіп Кавалеўскі** (г. п. Вялікая Бераставіца, цяпер райцэнтр Гродзенскай вобл.), гісторык, філамат, адзін з заснавальнікаў манголазнаўства.

**1897** (ці 1 студзеня) Нарадзіўся **Васіль Шашалевіч** (в. Мхінічы, цяпер Краснапольскі р-н), драматург, вязень ГУЛАГу.

**1902** Нарадзіўся **Антон Жэбрак** (в. Збляны, цяпер Зэльвенскі р-н), генетык, селекцыянер, грамадскі дзеяч, акадэмік.

**1921** Расстраляны **Павел Чайка**, вайсковец, удзельнік Слуцкага

паўстання. Нарадзіўся ў в. Лютавічы, цяпер Капыльскі р-н (1889).

## 10 студзеня

**1897** Нарадзілася **Юлія Бібіла** (мяст. Поразава, цяпер Свіслацкі р-н), бібліёграф, майстрыха мастацкага ткацтва.

**1927** У Брэсце пачаўся так званы “працэс 31-га” — суд над групай дзеячаў Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі, арганізаваны польскімі ўладамі (доўжыўся да 17 студзеня).

**1949** Трагічна загінуў **Міхаіл Сазыка**, вайсковец, спявак, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне.

**1996** **Сямён Шарэцкі** абраны на пасаду старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

**2004** Памёр **Алесь Усюкевіч**, настаўнік, адзін з кіраўнікоў Саюза Вызвалення Беларусі ў Навагрудку, вязень савецкіх турмаў. Нарадзіўся ў 1925 г.

## 11 студзеня

**1864** У Вільні расстраляны **Цітус Далеўскі**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1924** У Вільні выйшаў першы нумар газеты “Беларуская доля”, органа Беларускага Пасольскага Клубу (выдавалася да 22 траўня 1925 г., выйшла 36 нумароў, забаронена польскімі ўладамі). Рэдактар **Антон Пракапенка**.

**1995** Міністр замежных спраў Беларусі **Уладзімір Сянько** падпісаў у Бруселі дакумент праграмы НАТО “Партнёрства дзеля міру”.

**1996** У Вільні ўстаноўлена памятная дошка **Вацлаву Ластоўскаму**.

## 12 студзеня

**1888** Нарадзіўся **Дамінік Аніська** (в. Слойнікі, цяпер Сакольскі пав. Падляскага ваяв., Польшча), ідэолаг і ўдзельнік хрысціянскага руху, публіцыст, дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі.

**1894** Нарадзіўся **Казімір Смулька** (в. Пруднікі, цяпер Міёрскі р-н), каталіцкі святар ордэна марыянаў, манах.

**1906** Нарадзіўся **Язэп Малецкі** (в. Якузы, цяпер Міёрскі р-н), грамадскі дзеяч, публіцыст, мемуарыст, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

**1919** Нарадзіўся **Васіль Хомчанка** (в. Канічы, цяпер Касцюковіцкі р-н), пісьменнік.

**1989** У СССР прайшоў перапіс насельніцтва, паводле якога ў Беларусі — 10 200 200 чалавек.

**1994** На 151-ым прадпрыемстве Беларусі адбылася агульнанацыянальная забастоўка з эканамічнымі і палітычнымі патрабаваннямі.

**2002** У Мінску памёр **Яўген Кулік**, мастак-графік, грамадскі дзеяч.

## 13 студзеня

**1593** У Вішневе (Валожынскі р-н) памёр (паводле іншых звестак быў забіты) **Сымон Будны**, мысляр эпохі Адраджэння, асветнік, друкар. Нарадзіўся каля 1530 г.

**1654** Памёр **Януш Кішка**, вайсковы і дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага. Нарадзіўся ў 1568 г.

**1660** Маскоўскае войска захапіла Берасце. Горад быў амаль цалкам спалены, а жыхары пагалоўна знішчаны.

**1706** Пачалася двухмесячная аблога шведскім войскам Гародні, у выніку якой расійскі гарнізон адступіў, а шведы занялі горад.

**1841** Нарадзіўся **Ігнат Здановіч** (г. Вільня), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1885** Памёр **Іван Хруцкі**, мастак.

**1891** Нарадзіўся **Іпаліт Поляк** (в. Валянцей, цяпер Шаркаўшчынскі р-н), грамадскі дзеяч, педагог.

**1991** У ноч на 13 студзеня савецкія войскі захапілі Віленскую тэлевежу і шэраг урадавых будынкаў, забіўшы 14 і параніўшы каля 700 цывільных абаронцаў свабоды і незалежнасці Літвы, сярод якіх былі і беларусы.

## 14 студзеня

**1893** Нарадзілася **Канстанцыя Буйло** (па мужу **Калечыц**; г. Вільня), паэтэса.

**1894** Нарадзіўся **Пётр Юргялевіч** (мяст. Трабы, цяпер Іўеўскі р-н), мовазнавец, педагог, вязень савецкіх канцлагераў.

**1916** Нарадзіўся **Уладзіслаў Чарняўскі** (засц. Амбружын, цяпер Ашмянскі р-н), каталіцкі святар, перакладчык літургічных тэкстаў на беларускую мову.

**1927** Нарадзіўся **Янка Філістовіч** (в. Паняцічы, цяпер Вілейскі р-н), дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху. Расстраляны саветамі ў 1953 г.

**1989** У Вільні на Другім вальным сейме беларускіх суполак (доўжыўся два дні) заснавана Канфедэрацыя беларускіх маладзёжных суполак (66 арганізацый).

**1995** У Нясвіжы адкрыўся гісторыка-краязнаўчы музей.

## 15 студзеня

**1582** У г. Ям-Запольскі падпісаны мір на 10 гадоў паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай, які, фактычна, скончыў Лівонскую вайну.

**1742** Нарадзіўся **Францішак Нарвойш** (Вількамірскі павет), асветнік, багаслоў, філосаф, матэматык.

**1881** Нарадзіўся **Тадэвуш Грабоўскі**, польскі даследчык-славіст, які ў сваіх навуковых працах даказваў самабытнасць беларускага народа.

**1885** Памёр **Антон Адынец**, паэт, філамат, перакладчык, выдавец.

**1926** У Заходняй Беларусі выйшаў першы нумар сатырычнага часопіса “Маланка” (выдаваўся ў Вільні да 26 снежня 1928 г., выйшлі 43 нумары).

**1927** Памёр **Давід Яноўскі**, адзін з мацнейшых шахматыстаў свету канца XIX – пач. XX ст., нараджэнец Ваўкавыска, які з 23 гадоў жыў у Францыі.

**1933** Нарадзіўся **Арнольд Чарнушэвіч** (Мінск), фехтавальшчык-спартсмен і трэнер, бронзавы прызёр алімпійскіх гульняў (1960).

**1959** У СССР прайшоў перапіс насельніцтва, паводле якога на Беларусі — 8 054 648 чалавек.

**1968** Памёр **Язэп Стаброўскі**, археолаг, краязнавец.

**1970** У СССР прайшоў перапіс насельніцтва, паводле якога на Беларусі — 9 002 300 чалавек.

**1979** Памёр **Алесь Якімовіч**, дзіцячы пісьменнік, паэт. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**1985** У Гродне адкрыўся Рэспубліканскі музей атэізму і гісторыі рэлігіі (з верасня 1989 г. — Беларускі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі).

**1994** Памёр **Генадзь Каханоўскі**, гісторык, краязнавец, літаратуразнавец. Пахаваны ў в. Насілава (Маладзечанскі р-н).

**1994** У Мінск з афіцыйным візітам прыехаў прэзідэнт ЗША **Біл Клінтан**. Гэта быў першы прыезд кіраўніка ЗША ў незалежную Беларусь.

## 16 студзеня

**1826** Нарадзіўся **Рамуальд Траўгут** (в. Шастакова, цяпер Камянецкі р-н), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1829** Нарадзіўся **Уладзімір Спасовіч** (г. Рэчыца), беларуска-расійска-польскі юрыст, публіцыст, літаратуразнавец.

**1916** Нямецкі фельдмаршал Гіндэнбург выдаў загад аб наданні беларускай мове раўназначных правоў з іншымі краёвымі мовамі на акупаваных кайзераўскімі войскамі тэрыторыях.

**1919** У Гродне арганізаваны беларускі клуб “Наша хатка”.

**1919** ЦК РКП (б) прыняў пастанову пра ўваход Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў у склад РСФСР і рэкамендаваў стварыць Літоўска-Беларускую ССР.

**1966** У Таронта створаны Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады: увайшлі Згуртаванне Беларусаў Канады, Беларускае Нацыянальнае Аб’яднанне, Беларуская Самапомач.

**1998** У Мінску выйшаў першы нумар газеты “Навіны” (працяг газеты “Свабода” пасля яе закрыцця). Рэдактар **Ігар Гермянчук**.

**2000** У Гродне адбылася агульнабеларуская сустрэча ветэранаў нацыянальна-вызваленчага руху — вязеняў сталінскіх канцлагераў.

## 17 студзеня

**1732** Нарадзіўся **Станіслаў Аўгуст Панятоўскі** (маёнт. Воўчын, цяпер Камянецкі р-н), апошні кароль Рэчы Паспалітай і вялікі князь літоўскі (1764–1795).

**1904** Нарадзіўся **Алесь Якімовіч** (в. Чурылава, цяпер Уздзенскі р-н), дзіцячы пісьменнік, паэт.

**1921** У Сянно памёр **Андрэй Зязюля** (сапр. **Аляксандр Астрамовіч**), каталіцкі святар, паэт.

**1926** У Мінску адбыўся Першы з'езд даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі (доўжыўся два дні).

**1979** У СССР прайшоў перапіс насельніцтва, паводле якога на Беларусі — 9 560 000 чалавек.

**1999** У в. Бездзеж (Драгічынскі р-н) адкрыўся музей народнай творчасці "Бездзежскі фартушок".

**2004** Памёр **Віталь Кажан**, грамадскі і вайсковы дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахаваны ў Стэмфардзе (Канектыкут, ЗША)

## 18 студзеня

**1401** У Вільні падпісаны дакумент аб заключэнні дзяржаўна-палітычнай уніі паміж Вялікім княствам Літоўскім і Каралеўствам Польскім (Віленска-Радамская унія).

**1884** Нарадзіўся **Адам Лісоўскі** (в. Каранды, цяпер Смаргонскі р-н), рэлігійны дзеяч, каталіцкі святар.

**1895** Нарадзіўся **Лявон Більдзюкевіч** (мяст. Івянец, цяпер Валожынскі р-н), педагог, матэматык, грамадскі дзеяч.

**1912** Нарадзіўся **Пётр Сыч** (в. Батурына, цяпер Вілейскі р-н), пісьменнік, аўтар аповесці "Смерць і салаўі" пра бітву пад Монтэ-Касіна, публіцыст, вязень савецкіх канцлагераў, журналіст, дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі і Нямеччыне.

**1947** У Лондане пачаўся (доўжыўся два дні) Першы з'езд Згуртавання Беларусаў Вялікай Брытаніі (ЗБВБ).

**2003** Памёр **Уладзімір Сіўко**, дзеяч нацыянальнага руху, вязень канцлагераў, паэт.

## 19 студзеня

**1862** Памёр **Міхаіл Без-Карніловіч**, гісторык, краязнавец, этнограф.

**1865** У Екацерынбургу, па дарозе на катаргу ў Сібір, памёр **Отан Грабніцкі**, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1926** Нарадзіўся **Віктар Сянкевіч** (в. Гірстуны, цяпер Глыбоцкі р-н), грамадскі дзеяч, гісторык, журналіст, дзеяч эміграцыі ў Іспаніі, Вялікабрытаніі і ЗША.

**1944** Каля Беластока польскімі падпольшчыкамі жорстка закатаваны **Мікола Чарнецкі**, публіцыст, педагог, грамадскі дзеяч.

## 20 студзена

**1886** Нарадзіўся **Фабіян Акінчыц** (в. Акінчыцы, цяпер у межах Стоўбцаў), грамадска-палітычны дзеяч, юрыст, журналіст.

**1891** Нарадзіўся **Фабіян Ярэміч** (в. Дуляўцы, цяпер Ваўкавыскі р-н), грамадска-культурны дзеяч.

**1892** Нарадзіўся **Браніслаў Тарашкевіч** (засц. Мацюлішкі, Віленскі пав., цяпер Літва), грамадска-палітычны і асветны дзеяч, мовазнавец, публіцыст, перакладчык, літаратуразнавец.

**1892** Нарадзіўся **Рыгор Шырма** (в. Шакуны, цяпер Пружанскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, харавы дырыжор, фалькларыст, публіцыст.

**1905** (ці 25 студзеня) Нарадзіўся **Ян Пятроўскі** (г. Слуцк), рэлігійны дзеяч, літаратар, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Аўстрыі і ЗША. Памёр (2002) у Гейнсвіле (Фларыда, ЗША).

**1955** У Гданьску памёр **Лукаш Дзекуць-Малей**, грамадскі і рэлігійны дзеяч.

**1994** У Вільні ўстаноўлена памятная дошка **Рыгору Шырму**.

**2005** Памёр **Ян Новак-Езяранскі** (паходзіў з Гарадзеншчыны), польскі грамадска-палітычны дзеяч, публіцыст, журналіст, які спрыяў беларускаму нацыянальнаму руху.

## 21 студзена

**1818** Нарадзіўся **Адам Кіркор** (в. Слівіна, цяпер Манастыршчынскі р-н Смаленскай вобл., Расія), гісторык, этнограф, археолаг, публіцыст, грамадскі дзеяч.

**1840** Нарадзіўся **Станіслаў Ляскоўскі** (Меншчына), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Пасля паражэння паўстання жыў у Бельгіі.

**1871** Памёр **Аляксандр Герцэн**, расійскі грамадскі дзеяч, пісьменнік, публіцыст, філосаф. Выступаў за нацыянальнае самавызначэнне беларусаў, падтрымоўваў вызваленчае паўстанне 1863–1864 гг.

**1938** У савецкім канцлагеры памёр (ці быў расстраляны) **Янка Туміловіч**, настаўнік, паэт.

**1978** Памёр **Алесь Салавей** (сапр. **Альфрэд Радзюк**, на эміграцыі **Альберт Кадняк**), паэт, дзеяч эміграцыі ў Аўстрыі і Аўстраліі. Пахаваны на беларускай частцы могілак Фолкнер ў Мельбурне (Аўстралія).

## 22 студзена

**1863** Пачалося нацыянальна-вызваленчае паўстанне.

**1890** Нарадзіўся **Ільдэфонс Бобіч** (в. Дзедзіна, цяпер Міёрскі р-н), рымска-каталіцкі святар, выдавец.

**1894** Нарадзіўся **Зянон Якуць** (в. Скурацішкі Новааляксандраўскага пав., цяпер Браслаўскі р-н), каталіцкі святар.

**1906** Нарадзіўся **Андрэй Александровіч** (Мінск), пісьменнік, вязень савецкіх канцлагераў.

**1975** Памёр **Тадэвуш Грабоўскі**, польскі даследчык-славіст, які ў сваіх навуковых працах прызнаваў самабытнасць беларускага народа.

## 23 студзеня

**1884** Нарадзіўся **Францішак Будзька** (в. Вознаўшчына, цяпер Вілейскі пав.), каталіцкі святар.

**1889** У Чылі памёр **Ігнат Дамейка**, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху, філамат, геолаг, мінеролаг, нацыянальны герой Чылі.

**1938** У Саратаве расстраляны **Вацлаў Ластоўскі**, грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, мовазнавец, літаратуразнавец, публіцыст, этнограф.

**1960** Нарадзіўся **Віктар Янушэўскі** (Мінск), футбаліст, чэмпіён СССР (1982).

**1981** Памерла **Вера Маслоўская**, грамадска-палітычны дзеяч, настаўніца.

**1994** У Адэляйдзе (Паўднёвая Аўстралія) памёр **Янка Ролсан** (сапр. **Гадзіцкі Янка**), грамадска-культурны дзеяч, паэт, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

## 24 студзеня

**1797** Нарадзіўся **Цімафей Ліпінскі** (мяст. Дзярэчын, цяпер Зэльвенскі р-н), гісторык, географ, філолаг, калекцыянер, краязнавец.

**1810** Нарадзіўся **Уладзіслаў Брахоцкі** (в. Гаўя, цяпер Іўеўскі р-н), грамадскі дзеяч, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Памёр у 1896 г.

**1827** Нарадзіўся **Аляксандр Далеўскі** (фальв. Кункулка, цяпер Лідскі пав.), адзін са стваральнікаў Братняга саюза літоўскай моладзі, удзельнік вызваленчага руху.

**1897** У Кракаве памёр **Альфрэд Ромер**, мастак, скульптар, медальер, мастацтвазнавец, этнограф, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1904** Нарадзіўся **Янка Шутовіч** (в. Шутавічы, цяпер Смаргонскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, выдавец, літаратуразнавец, вязень савецкіх канцлагераў.

**1909** Нарадзіўся **Пятрусь Граніт** (сапр. **Іван Івашэвіч**; в. Зачэпічы, цяпер Дзятлаўскі р-н), паэт, педагог. Памёр 14 ці 24 студзеня 1980 г.

**1911** У Відзах Лаўчынскіх (Браслаўскі р-н) памёр **Аляксандр Аскерка**, грамадскі дзеяч, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Пахаваны ў Вільні. Нарадзіўся ў маёнт. Рудакова Рэчыцкага пав. (1830).

## 25 студзеня

**1804** Нарадзіўся **Антон Адынец** (в. Гейстуны, цяпер Ашмянскі р-н), польскі паэт, філамат, перакладчык, выдавец.

**1869** Нарадзіўся **Адам Гурыновіч** (фальв. Кавалькі, цяпер Мядзельскі р-н), паэт, фальклярыст.

**1938** У Празе памёр **Тамаш Грыб**, грамадска-палітычны і культурны дзеяч.

## 26 студзеня

**1564** Войскі гетманаў **Мікалая Радзівіла** і **Рыгора Хадкевіча** разбілі маскоўскія войскі на Чашніцкіх палях ля мястэчка Ула (цяпер Бешанковіцкі р-н).

**1874** У Пратуліне (цяпер Люблінскае ваяв., Польшча) расійскія войскі забілі сялянаў-уніятаў. 6 кастрычніка 1996 г. 13 падляшскіх пакутнікаў былі беатыфікаваны папам **Янам Паўлам II**.

**1907** Нарадзіўся **Мікалай Лапіцкі** (в. Грэлікі, цяпер Вілейскі р-н), праваслаўны святар, рэлігійна-грамадскі дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1913** Выйшаў першы нумар каталіцкай газеты "Bielarus" (выходзіла да жніўня 1915 г.). Першы рэдактар **Адам Бычкоўскі**.

**1918** У Львове памёр **Антон Баранцэвіч**, вайсковец, палявы камандзір паўстання 1863–1864 гг., мемуарыст. Нарадзіўся ў в. Кірклішкі, цяпер Ашмянскі р-н (каля 1837).

**1990** Вярхоўны Савет БССР абвясціў беларускую мову адзінай дзяржаўнай у Беларусі.

**1994** У Маскве памёр **Алесь Адамовіч**, пісьменнік, грамадскі дзеяч. Пахаваны ў в. Глуша Бабруйскага р-на.

**1994** **Станіслаў Шушкевіч** адклікаdebны з пасады старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

## 27 студзеня

**1527** У бітве ля ракі Альшаніца (пад Кіевам) паміж войскамі Вялікага княства Літоўскага і крымскіх татараў, апошнія былі разбіты.

**1927** Памёр **Юры Матулевіч** (**Матулайціс**), рымска-каталіцкі рэлігійны дзеяч Заходняй Беларусі і Літвы, благаслаўлёны.

**1927** У Вільні выйшла газета "Наш голас", орган БСРГ (выдавалася да 28 лютага 1927 г. двойчы на тыдзень).

**1976** У Мінску створана Беларускае таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за мяжой "Радзіма" (старшыня **Рыгор Шырма**).

## 28 студзеня

**1577** Мазыр атрымаў самакіраванне паводле магдэбургскага права і герб.

**1588** Зацверджаны Трэці Статут Вялікага княства Літоўскага.

**1597** Памёр **Мікалай Дарагастайскі**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага. Нарадзіўся каля 1530 г.

**1712** Нарадзіўся **Удальрык Крыштаф Радзівіл**, дзяржаўны дзеяч

Вялікага княства Літоўскага, пісьменнік.

**1777** Памёр **Антоні Скарульскі**, рэктар Навагрудскага езуіцкага калегіума ў 1760–1764 гг.

**1889** Нарадзіўся **Язэп Мамонька** (в. Залессе, цяпер Слуцкі р-н), палітычны дзеяч.

**1922** Нарадзіўся **Янка Жамойцін** (в. Клімавічы, цяпер Лідскі р-н), грамадскі дзеяч, публіцыст, беларускі дзеяч у Польшчы.

**1948** У Буэнас Айрэсе заснавана Згуртаванне Беларусаў у Аргенціне. Першы старшыня **Кастусь Мярляк**.

**1982** Памерла **Алена Лябецкая**, дзеяч Таварыства Беларускай Школы.

**1994** Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь абраны **Мечыслаў Грыб**.

**2002** У ЗША ў доме для састарэлых памёр **Пётр Манькоўскі**, публіцыст, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Нарадзіўся на Віленшчыне (1916).

## 29 студзеня

**1717** Нарадзіўся **Людвік Грынцэвіч**, архітэктар эпохі позняга барока.

**1720** Нарадзіўся **Францішак Багамолец** (Віцебшчына), польскі драматург, публіцыст, выдавец.

**1878** Нарадзіўся **Уладзімір Самойла** (Мінск), публіцыст, літаратурны крытык, філосаф. Забіты ў чэрвені 1941 г.

**1884** Нарадзіўся **Антон Луцкевіч** (г. Шаўлі, цяпер Шаўляй, Літва), грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, публіцыст, старшыня ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі.

**1946** Памерла **Баляслава Лямант**, манашка, якая працавала ў Беларусі, а пазней была беатыфікавана.

**1999** У Мінску адбыўся Першы кангрэс дэмакратычных сіл Беларусі (больш 600 удзельнікаў). Утворана Каардынацыйна-кансультатыўная рада дэмакратычных сілаў.

## 30 студзеня

**1667** Заключана Андрусаўскае перамір'е (ля Мсціслаўля) паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй, якім скончылася вайна 1654–1667 гг.

**1922** У Мінску заснаваны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт).

**1935** У Мінску нарадзіўся **Эрнст Ляўкоў**, геолаг, краязнавец.

**1963** У Пінску арыштаваны **Мікалай Лагодзіч** за публічную праваабарончую дзейнасць. 11 красавіка 1963 г. ён быў асуджаны да трох гадоў савецкіх канцлагераў.

**1992** Беларусь прынята ў сябры Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ).

# 31 студзеня

**1833** Нарадзіўся **Станіслаў Сільвестровіч** (в. Гожа, цяпер Гродзенскі р-н), удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Памёр у 1910 г.

**1913** Памёр **Баляслаў Русецкі**, мастак, які працаваў у Беларусі.

**1913** У Гродне выйшаў альманах вучнёўскай беларускай моладзі "Колас беларускай нівы".

**1930** Памёр **Бенедыкт Дыбоўскі**, заолаг, прыродазнавец, лекар, публіцыст, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Пахаваны ў Львове (Украіна).

**1957** У Мінску быў заснаваны Беларускі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей (з 13 лістапада 1964 г. Дзяржаўны музей БССР, з 1992 г. — Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі).

**1990** Створана Гомельская праваслаўная епархія.

**2005** У Пінску памёр **Кастусь Рамановіч**, удзельнік падпольнага Саюза Вызвалення Беларусі ў Навагрудку, вязень савецкіх канцлагераў.

KAMUNIKAT.ORG

# ЛЮТЫ

## 1 лютага

**1411** У г. Торунь (цяпер Польшча) падпісаны мір паміж Каралеўствам Польскім і Вялікім княствам Літоўскім з аднаго боку і Тэўтонскім ордэнам з другога, якім была завершана “Вялікая вайна” 1409–1411 гг.

**1563** Пачалася двухтыднёвая аблога Полацка маскоўскім войскам **Івана IV Жахлівага**.

**1717** “Нямы сейм” фактычна пагадзіўся на пратэктарат Расіі над Рэччу Паспалітай.

**1788** Памёр **Ясон Смагаржэўскі**, уніяцкі царкоўны дзеяч Рэчы Паспалітай. Нарадзіўся каля 1714 г.

**1811** Нарадзіўся **Рамуальд Зянькевіч** (Завілейскі павет), беларускі фальклярыст, этнограф, археолаг, педагог.

**1863** Літоўскі правінцыйны камітэт (створаны летам 1862 г.) абвясціў сябе Часовым правінцыйным урадам Літвы і Беларусі.

**1874** Нарадзіўся **Кастусь Бялецкі** (мяст. Лунна, цяпер Мастоўскі р-н), грамадска-палітычны дзеяч.



Пячатка
Яна Сымона
Алелькавіча,
князя
слуцкага

**1918**(?) Заснавана Віленская беларуская гімназія. Дзейнчала да чэрвеня 1944 г.

**1927** Нарадзілася **Юзэфа Найдзюк** (дзяв. **Брэчка**; в. Мазуркі, цяпер Ляхавіцкі р-н), удзельніца нацыянальна-вызваленчага руху, сябар СБМ, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Памерла ў 2005 г.

**1991** У Мінску памёр **Станіслаў Шушкевіч**, паэт, празаік, вязень савецкіх канцлагераў. Пахаваны ў в. Шчытомірычы Мінскага р-на.

## 2 лютага

Сусветны дзень воднабалотных нетраў

**1348** Перамога войск Вялікага княства Літоўскага над крыжакамі на рацэ Стрэва (прыток Нёмана). У бітве загінуў князь **Нарымонт**, другі сын **Гедыміна**. Нарадзіўся каля 1294 г.

**1589** Кароль **Жыгімонт III Ваза** пацвердзіў ўсе прывілеі Гродну.

**1746** Памёр **Мікалай Фаўстын Радзівіл**, дзяржаўны і вайсковы дзеяч ВКЛ .

**1861** Памёр **Міхаіл Гамаліцкі**, лекар, педагог, гісторык. Пахаваны ў Вільні.

**1838** Нарадзіўся **Кастусь Каліноўскі** (в. Мастаўляны, цяпер Беластоцкі пав. Падляскага ваяв., Польшча),

дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1892** У Варшаве памёр **Люцыян Крашэўскі**, мастак, фатограф, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1902** (ці 23 лютага 1901) Нарадзіўся **Станіслаў Грынкевіч** (мяст. Новы Двор, цяпер Сакольскі пав. Падляскае ваяв., Польшча), грамадска-палітычны і культурны дзеяч, літаратар, псіхіятр, адзін з лідэраў Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі.

**1919** У Гродне выйшаў першы нумар газеты “Беларускі народ”, выдаванай Міністэрствам беларускіх спраў.

**1932** Нарадзілася **Людміла Махнюк** (дзяв. **Каліноўская**; мяст. Скідаль, цяпер Гродзенскі р-н), дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1938** Нарадзілася **Таццяна Самусенка** (дзяв. **Пятрэнка**; в. Астрашыцкі Гарадок, цяпер Мінскі р-н), фехтавальшчыца, трохразовая алімпійская чэмпіёнка (1960, 1968, 1972).

**1945** У савецкім зняволенні загінуў Валянцін Рамановіч, мастак.

**1968** Адкрыўся літаратурна-этнаграфічны музей у в. Гудзевічы Мастоўскага р-на.

**1983** Пры пажары трагічна загінуў Мікола Прашковіч, дысідэнт, літаратуразнавец, перакладчык. Пахаваны на могілках у в. Асмолаўка Бярэзінскага р-на.

**1996** У Мінску памёр **Алесь Звонак**, пісьменнік, перакладчык, вязень сталінскіх турмаў.

**2006** Памёр **Пётр Марціноўскі**, педагог, краязнавец, літаратуразнавец, кіраўнік Зэльвенскага літаратурнага аб’яднання.

## 3 лютага

**1926** У Вільні выйшаў першы нумар газеты “Беларускае слова”, выданне Часовай беларускай рады, потым Беларускай нацыянальнай рады (выдавалася да 9 лютага 1928 г.).

**1964** Памёр **Станіслаў Станкевіч**, паэт, кнігавыдавец. Нарадзіўся ў в. Арляняты, цяпер Смаргонскі р-н (1886).

**1995** У Мельбурне (Аўстралія) памёр **Уладзімір Шнэк** (псеўд. **Случанскі**), вайсковы, грамадскі дзеяч, пісьменнік, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Аўстраліі.

## 4 лютага

**1515** Нарадзіўся **Мікалай Радзівіл Чорны** (г. Нясвіж), палітычны, культурны і рэлігійны дзеяч Вялікага княства Літоўскага.

**1808** Нарадзіўся **Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч** (фальв. Панюшкавічы, цяпер Бабруйскі р-н), паэт, драматург, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры.

**1894** Памёр **Адам Гурыновіч** (фальв. Крыстынопаль, цяпер

Смаргонскі р-н), паэт, фальклярыст.

**1929** Нарадзіўся **Лявон Баразна** (в. Новае Сяло, цяпер Талачынскі р-н), мастак, дысідэнт.

**1931** У Мінску, пасля допытаў у АДПУ, скончыў жыццё самагубствам **Усевалад Ігнатоўскі**, гісторык, першы прэзідэнт Беларускай Акадэміі навук.

**1950** Памёр **Ян Булгак**, фотамастак, этнограф, краязнавец.

**1957** Памёр **Браніслаў Ямант**, мастак, педагог.

**1978** У Нясвіжы памёр **Аркадзь Куляшоў**, паэт, перакладчык. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**1989** У Вільні адбыўся ўстаноўчы з'езд Таварыства Беларускай Культуры.

## 5 лютага

**1637** У Вільні памёр **Язэп Вельямін Руцкі**, царкоўна-палітычны дзеяч, уніяцкі мітрапаліт, пісьменнік-палеміст. Пахаваны ў Святатраецкім манастыры. Нарадзіўся ў в. Рутка Навагрудскага р-на (1573 ці 1574).

**1916** Нарадзілася **Валянціна Пашкевіч** (дзяв. **Жукоўская**), дзеяч эміграцыі ў Канадзе, аўтар беларускіх падручнікаў і адна з аўтараў "Ангельска-беларускага слоўніка".

**2001** У Глен Коў (Нью-Йорк, ЗША) памёр **Масей Сяднёў**, літаратар, вязень савецкага канцлагеру, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахаваны на беларускіх могілках у Саўт-Рыверы (Нью-Джэрсі, ЗША).

## 6 лютага

**1898** Нарадзіўся **Леў Акіншэвіч** (Санкт-Пецярбург), беларуска-украінскі гісторык, дзеяч эміграцыі ў ЗША. Памёр у Нью-Йорку (1980).

**1906** Нарадзіўся **Тамаш Падзява** (в. Пярхулёва Дзісьненскага пав.), каталіцкі святар-марыянін, філосаф, тэолаг, публіцыст, рэлігійна-культурны дзеяч, вязень савецкіх канцлагераў.

**1914** Нарадзіўся **Аркадзь Куляшоў** (в. Саматэвічы, цяпер Касцюковіцкі р-н), паэт, перакладчык.

**1920** У Слуцку выйшаў першы нумар газеты "Наша каляіна", органа арганізацыі "Папараць-кветка" (выдавалася да 4 сакавіка 1920 г.). Рэдактар **А. Бараноўскі**.

**1995** У Мінску памёр **Валянцін Рабкевіч**, літаратуразнавец, перакладчык, паэт. Пахаваны ў в. Аксаміты Капыльскага р-на.

## 7 лютага

**1546** Нарадзіўся **Фёдар Еўлашоўскі** (мяст. Ляхавічы), грамадскі дзеяч Вялікага княства Літоўскага, пісьменнік. Памёр у першай палове 1619 г.

**1881** Нарадзіўся **Рамуальд Зямкевіч** (Варшава), бібліяфіл, бібліёграф, публіцыст, краязнавец,

перакладчык. Загінуў у канцлагеры Асвенцім (1943 ці 1944).

**1891** Памёр **Вінцэнт Каратынскі**, беларускі і польскі паэт, публіцыст, перакладчык.

**1892** Нарадзіўся **Антон Сокал-Кутылоўскі** (в. Красная Горка, цяпер Лунінецкі пав.), вайсковы і грамадскі дзеяч, адзін з кіраўнікоў антысавецкага Слуцкага паўстання, вязень ГУЛАГу.

**1893** Нарадзіўся **Рыгор Рак** (мяст. Дукора, цяпер Пухавіцкі р-н), краязнавец.

**1926** У Мінску адбыўся Першы ўсебеларускі краязнаўчы з'езд (доўжыўся да 11 лютага 1926 г.).

**1992** Адбыўся Устаноўчы з'езд (доўжыўся два дні) Беларускай асацыяцыі ахвяраў палітычных рэпрэсій.

## 8 лютага

**1708** Пад час Паўночнай вайны расійскае войска разрабавала і спустошыла Гародню.

**1810** Нарадзіўся **Іван Хруцкі** (мяст. Ула, цяпер Бешанковіцкі р-н), мастак.

**1826** Нарадзіўся **Аляксандр Валіцкі** (г. Вільня), выдавец, музычны крытык, спявак, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1866** Нарадзіўся **Васіль Дружчыц** (**Друшчыц**; в. Блудзень, цяпер в. Першамайская Бярозаўскага р-на), гісторык.

**1887** Нарадзіўся **Уладзіслаў Талочка** (г. Гродна), рэлігійны і культурна-асветны дзеяч, культуролаг, гісторык, літаратуразнавец.

**1891** Нарадзіўся **Каспар Валадкевіч** (в. Слабада, цяпер Віленскі пав.), рымска-каталіцкі святар, грамадскі дзеяч. Памёр у 1970 г.

**1893** Нарадзіўся **Антон Неманцэвіч** (Санкт-Пецярбург), уніяцкі святар, царкоўны дзеяч, вязень савецкіх і фашысцкіх турмаў.

**1914** Нарадзіўся **Валянцін Таўлай** (г. Баранавічы), паэт, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху.

**1921** Нарадзіўся **Іван Мележ** (в. Глінішча, цяпер Хойніцкі р-н), пісьменнік, грамадскі дзеяч.

**1938** Расстраляны **Мікалай Гуткоўскі**, грамадскі дзеяч, юрыст.

**2004** Перамога тэніснай дружыны Беларусі над Расіяй у 1/8 фінале Кубка Дэвіса (матчы ішлі ў Мінску 6–8 лютага).

## 9 лютага

**1913** У Вільні адбылася першая пастаноўка п'есы Янкі Купалы "Паўлінка".

**1990** У Вільні адбылося адкрыццё беларускай нядзельнай школкі.

**1999** У в. Валеўка Навагрудскага р-на памёр **Уладзімір Урбановіч**, краязнавец, педагог, культуролаг.

## 10 лютага

**1452** Памёр **Свідрыгайла**, вялікі князь літоўскі (1430–1432). Нарадзіўся каля 1370 г.

**1868** Нарадзіўся **Карусь Каганец** (сапр. **Казімір Кастравіцкі**; г. Табольск, Расія), паэт, пісьменнік, перакладчык, мастак, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху.

**1882** Нарадзіўся **Францішак Умястоўскі** (г. Вільня), пісьменнік, публіцыст-“нашанівец”. Загінуў у траўні 1940 г., верагодна ў Катыні.

**1883** Нарадзіўся **Станіслаў Булак-Балаховіч** (маёнт. Мейшты, цяпер Браслаўскі р-н), вайскова-палітычны дзеяч, кіраўнік паўстання супраць савецкай улады. Загінуў у верасні 1939 г. пры абароне Варшавы.

**1909** Памёр **Эдвард Паўловіч**, мастак, асветнік, удзельнік паўстання 1863–1864 гг., мемуарыст.

**1927** У Мінску пачаўся Другі ўсебеларускі краязнаўчы з’езд (доўжыўся да 13 лютага).

**1938** У Вязьме (Смаленская вобл., Расія) расстраляны **Максім Гарэцкі**, пісьменнік, літаратуразнавец, фалькларыст, лексікограф, мысляр.

**1980** Памёр **Браніслаў Ржэўскі**, літаратуразнавец, педагог, дысідэнт, палітычны вязень. Пахаваны ў Гродне.

**1990** У Мінску з ініцыятывы Беларускага Народнага Фронту адбыўся Усебеларускі Дэмакратычны Форум, на якім утвораны перадвыбарчы Беларускі дэмакратычны блок.

**1994** У Гродне, пасля збіцця невядомымі, памёр **Антон Сцяпура**, дзеяч нацыянальнага руху, сябар Беларускага Народнага Фронту. Пахаваны на могілках на прасп. Касманаўтаў у Гродне.

## 11 лютага

**1661 (ці 1 лютага)** Жыхары Магілёва здзейснілі вызваленчае паўстанне супраць расійскай адміністрацыі. Маскоўскі гарнізон быў знішчаны, а Магілёву нададзены новы герб.

**1807** Нарадзіўся **Напалеон Орда** (в. Варацэвічы, цяпер Іванаўскі р-н), піяніст, кампазітар, мастак, удзельнік паўстання 1830–1831 гг.

**1877** Нарадзіўся **Антон Неканда-Трэпка** (Мінск), грамадска-палітычны дзеяч, педагог.

**1883** Нарадзіўся **Язэп Белагаловы** (Санкт-Пецярбург), грэка-каталіцкі святар. Памёр у 1928 г.

**1952 (або 13 ці 21 лютага)** У савецкім канцлагеры памёр **Андрэй Цікота**, рэлігійны і грамадска-культурны дзеяч, генерал ордэна марыянаў.

**1989** У Беластоку створаны Беларускі клуб (старшыня **Юры Туронак**), які даў пачатак беларускаму палітычнаму руху ў Польшчы.

## 12 лютага

**1746** У Косаўскім касцёле ахрышчаны **Тадэвуш Касцюшка**, дзяржаўны і вайсковы дзеяч, кіраўнік паўстання 1794 г.

**1798** Памёр **Станіслаў Аўгуст Панятоўскі**, апошні кароль Рэчы Паспалітай і вялікі князь літоўскі (1764–1795). Пахаваны ў касцёле Св. Кацярыны на Неўскім праспекце (Санкт-Пецярбург). Перапахаваны ў Воўчынскім касцёле (цяпер Камянецкі р-н, красавік 1938 г.), а потым у кафедральным касцёле (Варшава).

**1799** У Навагрудку ў Фарным касцёле ахрышчаны **Адам Міцкевіч**.

**1882** Нарадзіўся **Леў Дашкевіч** (Мінск), фотамастак, навуковец, педагог. Памёр 9(?) снежня 1957 г. у Мінску.

**1910** У Вільні адбылася першая беларуская тэатральная пастаноўка.

**1942** Па дарозе з сібірскага лагера ў 2-гі Польскі корпус (Армію Андэрса) памёр **Антон Неканда-Трэпка**, грамадска-палітычны дзеяч, педагог.

**1863** Беларускія паўстанцы захапілі Пружаны.

**1903** Нарадзіўся **Серафім Татарын** (в. Вострава, цяпер Зэльвенскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, актывіст Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады і Таварыства Беларускай Школы.

**1919** (ці 13 сакавіка) Памёр **Аляксандр Грыкоўскі**, грамадскі дзеяч, педагог. Нарадзіўся ў в. Корнін, цяпер Гайнаўскі пав. Падляскага ваяв., Польшча (1893).

**1974** У Будславе (Мядзельскі р-н) памерла **Паўліна Мядзёлка**, актрыса, дзеяч культуры. Пахавана ў Будславе.

**1984** У Інаўроцлаве (Куяўска-Паморскае ваяв., Польшча) памёр **Язэп Найдзюк**, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, выдавец, гісторык.

**1994** У Лілехамеры (Нарвегія) Беларусь дэбютавала на зімовых Алімпійскіх гульнях як суверэнная дзяржава. У выніку, па колькасці медалёў (два срэбных) заняла 12-е месца з 67 краінаў-удзельніц.

## 13 лютага

**1705** Нарадзілася **Францішка Уршуля Радзівіл** (г. Чартарыйск, цяпер Валынская вобл., Украіна), пісьменніца, драматург.

**1806** Нарадзіўся **Юльян Корсак** (г. Слонім), паэт, перакладчык.

## 14 лютага

**1800** (ці 1799) Нарадзіўся **Валенці Ванькові̌ч** (в. Калюжыца, цяпер Бярэзінскі р-н), мастак.

**1906** Нарадзіўся **Мікола Улашчык** (в. Віцкаўшчына, цяпер Дзяржынскі р-н), гісторык, археограф, археолаг, этнограф, краязнавец, літаратар.

**1907** Нарадзіўся **Алесь Звонак** (Мінск), пісьменнік, перакладчык, вязень сталінскіх турмаў.

**1914** Нарадзіўся **Павел Масленікаў** (в. Нізкая Вуліца, цяпер Магілёўскі р-н), жывапісец, тэатральны мастак, педагог.

**1924** У Вільні выйшаў першы нумар газеты "Голас Беларуса" (выходзіла да 16 красавіка 1924 г.). Рэдактар-выдавец **Мікола Шыла**.

**1937** У в. Вялікая Лябёдка (цяпер Шчучынскі р-н) памёр **Напалеон Чарноцкі**, публіцыст, перакладчык.

**1937** У в. Сычын (цяпер Слаўгарадскі р-н) нарадзіўся **Міхась Стральцоў**, пісьменнік, крытык, перакладчык.

**1948** У Рыдзе (Аўстрыя) на сходзе беларусаў лагера для перамешчаных асобаў (ДП) было створана Згуртаванне Беларусаў у Аўстрыі. Першы старшыня **Аляксандр Яцэвіч** (**Змагар**).

**1989** У Канадзе памёр **Вінцэнт Жук-Грышкевіч**, педагог, гісторык, літаратуразнавец, дзеяч эміграцыі ў Італіі, Вялікабрытаніі, Нямеччыне і Канадзе, старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (1970–1982). Пахаваны на беларускіх могілках у Іст-Брансвіку (Нью-Джэрсі, ЗША).

## 15 лютага

**1563** Маскоўскае войска штурмам узяло Полацк, дзе ўчыніла масавыя забойствы і палон гараджанаў.

**1824** Нарадзіўся **Антон Залескі** (Варшава), мастак, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1863** У бітве каля в. Рэчыца (Пружанскі пав.) загінуў **Станіслаў Сангін**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Нарадзіўся каля 1818 г.

**1915** Памёр **Раман Рагінскі**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1926** Нарадзіўся **Мікола Ягаўдзік** (Слонімшчына), вайсковец, дзеяч эміграцыі ў Бельгіі і ЗША.

**1937** Нарадзіўся **Валянцін Рабкевіч** (в. Аксаміты, цяпер Капыльскі р-н), літаратуразнавец, перакладчык, паэт.

**1958** Памёр **Язэп Рэшаць**, рэлігійны і культурны дзеяч, тэолаг, публіцыст. Нарадзіўся ў 1890 г.

**1998** У Мінску адбыўся ўстаноўчы з'езд партыі Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада.

## 16 лютага

**1758** Нарадзіўся **Юльян Нямцэвіч** (в. Скокі, цяпер Берасцейскі р-н), пісьменнік, палітычны дзеяч, гісторык, удзельнік паўстання 1794 г.

**1895** Нарадзіўся **Франц Кушаль** (в. Пяршаі, цяпер Валожынскі р-н), вайсковец, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1895** Памёр **Тамаш Булгак**, удзельнік паўстанняў 1830–1831 гг. і 1863–1864 гг. Нарадзіўся ў фальв. Міцкевічы Навагрудскага пав. (1801).

**1905** Памёр **Павел Баброўскі**, гісторык, этнограф.

**1956** (ці 16 студзеня) Арыштаваны і пазней асуджаны на 7 гадоў зняволення, паводле абвінавачвання ў беларускім нацыяналізме, выкладчык Гродзенскага педінстытута **Браніслаў Ржэўскі**.

## 17 лютага

**1806** Нарадзіўся **Канстанцін Тышкевіч** (г. Лагойск), гісторык, краязнавец, адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі.

**1837** Нарадзіўся **Канстанцін Ельскі** (в. Ляды, цяпер Чэрвеньскі р-н), падарожнік, заолаг, географ, геолаг.

**1888** Нарадзіўся **Янка Вярсоцкі** (мяст. Гальшаны, цяпер Ашмянскі р-н), рымска-каталіцкі святар, грамадскі дзеяч.

**1916** Памерла **Цётка** (сапр. **Алаіза Пашкевіч**, па мужу **Кайрыс**), грамадска-палітычны дзеяч, паэтэса, асветніца, выдавец. Пахавана ў Старым Двары (Шчучынскі р-н).

**1943** У Росіцы (цяпер Верхнядзвінскі р-н) фашысты спалілі каля 30 чалавек. Сярод іншых загінулі **Антон Ляшчэвіч** і **Юры Кашыра**, святарымарыяне, якія засталіся з вернікамі і самі пайшлі на смерць. Пазней блаславёныя.

## 18 лютага

**1845** Памёр **Ігнат Анацэвіч**, гісторык, археограф, педагог.

**1893** Нарадзіўся **Максім Гарэцкі** (в. Малая Багацькаўка, цяпер Мсціслаўскі р-н), пісьменнік, літаратуразнавец, фалькларыст, лексікограф, мысляр.

**1918** Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда ўзяў у свае рукі ўладу ў Мінску.

**1956** Памёр **Янка Быліна** (сапр. **Ян Семашкевіч**), каталіцкі святар, пісьменнік, паэт. Пахаваны ў в. Бомбля (Сакольскі пав., Падляскае ваяв., Польшча).

**1966** У Рабэрціне (Пясэчынскі пав., Мазавецкае ваяв., Польшча) памёр **Вячаслаў Аношка**, грэка-каталіцкі святар, сябар Рады Беларускага Экзархату Грэка-каталіцкай Царквы. Пахаваны на могілках ля Рабэрціна. Нарадзіўся на Магілёўшчыне ў 1899 г.

**1979** Памёр **Юрка Гаўрук**, перакладчык, паэт, вязень ГУЛАГу.

## 19 лютага

**1767** Нарадзіўся **Юзаф Пешка** (г. Кракаў), жывапісец, творчасць якога звязана з Беларуссю.

**1861** На тэрыторыі Расійскай імперыі адменена прыгоннае права.

**1864** Нарадзіўся **Вячаслаў Адамовіч** (Віленская губерня), дзеяч нацыянальнага руху.

**1890** Нарадзіўся **Казімір Сваяк** (сапр. **Канстанцін Стаповіч**; в. Барані, цяпер Астравецкі р-н), каталіцкі святар, паэт.

**1901** Нарадзіўся **Сяргей Бусел** (в. Сухоўчыцы, цяпер Капыльскі р-н), нацыянальны дзеяч, адзін з кіраўнікоў Слуцкага паўстання. Загінуў у савецкіх канцлагерах пасля 1940 г.

**1905** У Вене памёр **Якуб Наркевіч-Ёдка**, прыродазнавец, вынаходнік, медык. Пахаваны ў сваім маёнт. Над-Нёман на Уздзеншчыне.

**1908** Нарадзіўся **Станіслаў Шушкевіч** (в. Бакінава, цяпер Дзяржынскі р-н), паэт, празаік, вязень савецкіх канцлагераў.

**1910** Нарадзіўся **Палікарп Манькоў** (г. Рэчыца), грамадскі дзеяч, кіраўнік СБМ на Слуцкую акругу, журналіст, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Памёр 16 кастрычніка 1998 г.

**1910**(?) У Гродне адбылася першая беларуская вечарына.

**1915** Нарадзіўся **Анатоль Бярозка** (сапр. **Мітрафан Рэпкаў-Смаршчок**; в. Падлессе, цяпер Ляхавіцкі р-н), лекар, паэт, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1979** Памёр **Янка Геніюш**, грамадскі дзеяч, бібліяфіл, доктар, вязень ГУЛАГу. Пахаваны ў Зэльве.

**1989** У Мінску на стадыёне “Дынама” адбыўся 45-тысячны мітынг апазіцыі ў падтрымку Беларускага Народнага Фронту.

## 20 лютага

**1387** Вялікі князь **Ягайла** выдаў у Вільні прывілей, які зацвярджаў феадальныя правы баяраў, што прымалі каталіцтва.

**1810** Памёр **Марцін Пачобут Адляніцкі**, асветнік, астраном, педагог.

**1940** У Гродне адкрыўся настаўніцкі інстытут — першая ў Заходняй Беларусі вышэйшая навучальная ўстанова.

**1988** Памёр **Павел Каруза**, грамадска-палітычны дзеяч, кампазітар, этнамузыказнавец, вязень савецкіх канцлагераў.

**2002** На зімовай Алімпіядзе ў Солт-Лэйк-Сіці (ЗША) хакейная зборная Беларусі ў чвэрці фінала перамагла Швецыю (4:3) і ўпершыню ў сваёй гісторыі выйшла ў паўфінал алімпійскіх спаборніцтваў. У выніку заняла 4-е месца.

## 21 лютага

Міжнародны дзень роднай мовы

**1881** Памёр **Іосіф Ходзька**, навуковец-геадэзіст, падарожнік, тапограф.

**1918** Абвешчана Першая ўстаўная грамата Беларускай Народнай Рэспублікі і створаны першы беларускі ўрад — Беларускі Народны Сакратарыят.

**1939** У Вільні памёр **Вячаслаў Адамовіч**, дзеяч нацыянальнага руху,

адзін з заснавальнікаў сялянскай партыі “Зялёны дуб”.

**1974** Памёр **Лявон Савёнак**, пісьменнік, журналіст, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахаваны на беларускай частцы могілак у Іст Брансвіку (Нью-Джэрсі, ЗША).

## 22 лютага

**1862** Памёр **Вікенці Дмахоўскі**, жывапісец, майстар гістарычнага жанру, удзельнік паўстання 1830–1831 гг. Нарадзіўся ў в. Нагародавічы, цяпер Дзятлаўскі р-н (1805 ці 1807).

**1889** Нарадзіўся **Мікола Байкоў** (г. Бежацк Цвярской губ., Расія), мовазнавец, літаратуразнавец.

**1918** Памерла **Соф’я Кавалеўская**, фалькларыстка, этнограф, пісьменніца. Нарадзілася ў в. Малыя Бакшты, цяпер Маладзечанскі р-н (1853).

**1989** У Беластоку заснаваны першы гурток Беларускага Аб’яднання Студэнтаў (БАС). Першы старшыня **Юрка Каліна**.

## 23 лютага

**1766** У Люнэвілі (Францыя) памёр **Станіслаў Ляшчынскі**, кароль Рэчы Паспалітай і вялікі князь літоўскі (1704–1709, 1733).

**1891** Нарадзіўся **Міхаіл Піятуховіч** (в. Алексінічы, цяпер Сеннецкі р-н), літаратуразнавец, педагог.

**1903** Нарадзіўся **Вінцэнт Жук-Грышкевіч** (мяст. Будслаў, цяпер Мядзельскі р-н), педагог, гісторык, літаратуразнавец, дзеяч эміграцыі ў Італіі, Вялікабрытаніі, Нямеччыне і Канадзе, старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1970–1982 гг.

**1907** Нарадзіўся **Станіслаў Станкевіч** (в. Арляняты, цяпер Смаргонскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, літаратуразнавец, публіцыст, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1919** У Маскве Беларускі нацыянальны камісарыят і Маскоўская беларуская секцыя РКП(б) стварылі асветны клуб “Беларус”.

**1928** У Вільні пачаўся так званы “працэс 56-ці” — суд, арганізаваны польскай уладай над дзеячамі БСРГ (доўжыўся да 22 траўня 1928 г.).

**1944** Генеральны камісар акупаванай немцамі Беларусі даў дазвол на арганізацыю Беларускай Краёвай Абароны (БКА).

**1975** У Касцюковічах адкрыўся краязнаўчы музей.

**1991** У Мінску адбыўся ўстаноўчы сход Беларускай Сялянскай Партыі.

## 24 лютага

**1579** Мястэчка Мір атрымала магдэбурскае права.

**1595** Нарадзіўся **Мацей Сарбеўскі** (фальв. Сарбева каля г. Плоньска,

цяпер Польшча), беларускі і польскі лацінамоўны паэт, літаратуразнавец, тэолаг.

**1760** Памёр **Мацей Догель**, гісторык-археограф, правазнавец.

**1839** Адбыўся Полацкі царкоўны сабор, які ліквідаваў уніяцкую царкву на Беларусі.

**1902** Нарадзіўся **Янка Геніюш**, грамадскі дзеяч, бібліяфіл, доктар, вязень ГУЛАГу.

**1922** Памёр **Ядвігін Ш** (сапр. **Антон Лявіцкі**), пісьменнік, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч. Пахаваны на могілках Росы ў Вільні.

**1972** Памёр **Алесь Вініцкі**, грамадска-культурны дзеяч, гісторык, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1975** Памёр **Віктар Казлоўскі**, паэт. Пахаваны ў в. Мрочкі Уздзенскага р-на.

## 25 лютага

**1879** У Мінску нарадзіўся **Гасан Канапацкі**, дзеяч вайсковага і нацыянальнага руху.

**1906** Нарадзіўся **Павел Каруза** (в. Ваўкалата, цяпер Докшыцкі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, кампазітар, этнамузыказнавец, вязень савецкіх канцлагераў.

**1909** Нарадзіўся **Сяргей Дарожны** (сапр. **Серада**; г. Слонім), пісьменнік, перакладчык.

**1959** У Вільні памёр **Клаўдзій Дуж-Душэўскі**, палітычны дзеяч. Пахаваны ў Коўне.

**1984** Памёр **Язэп Пітушка**, вайсковец, дзеяч эміграцыі ў Канадзе. Пахаваны на могілках Парк-Лон ў Таронта (Канада). Нарадзіўся на Браслаўшчыне ў 1913 г.

**1986** Памёр **Ізыдар Гуткоўскі** (сапр. **Плашчынскі**), грамадскі дзеяч, літаратуразнавец, перакладчык, публіцыст. Нарадзіўся ў в. Каралішчавічы, цяпер Мінскі р-н (1908).

**1990** У Мінску на плошчы Леніна адбыўся выбарчы мітынг Беларускага Народнага Фронту, на якім прысутнічалі да 100 тыс. чалавек. Мітынг скончыўся паходам да будынка рэспубліканскага тэлебачання, кіраўніцтва якога па патрабаванні народа было вымушана прадаставіць прамы эфір лідэрам Фронту.

## 26 лютага

**1625** Нарадзіўся **Багуслаў Казімір Маскевіч** (в. Сэрвач, цяпер Карэліцкі р-н), вайсковы і грамадскі дзеяч Вялікага княства Літоўскага, пісьменнік-мемуарыст.

**1821** Нарадзіўся **Аляксандр Гінтаўт-Дзевалтоўскі** (мяст. Вайшканы Ковенскай губ.), рэлігійны дзеяч, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху на Гарадзеншчыне.

**1891** Нарадзіўся **Язэп Лагіновіч** (в. Заўшыцы, цяпер Салігорскі р-н), дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, удзельнік Слуцкага паўстання.

**1928** У Мінску створаны Камітэт абароны Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады на чале з **Янкам Купалам**.

**1932** Выйшаў першы нумар газеты "Літаратура і мастацтва".

**1976** У Паставах адкрыўся краязнаўчы музей.

## 27 лютага

**1667** Нарадзілася **Людвіка Караліна Радзівіл**, асветніца, мецэнатка.

**1864** Пасля няўдалага нападу паўстанцаў на г. Апатаў (цяпер Польшча) быў схоплены і павешаны **Людвік Звяждоўскі**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Нарадзіўся ў Вільні (снежань 1829 г.).

**1888** Нарадзіўся **Яфім Бялевіч** (Мінск), дзеяч нацыянальнага руху. Верагодна, загінуў у савецкіх канцлагерах пасля 1937 г.

**1919** Створаны ўрад Літоўска-Беларускай ССР са сталіцай у Вільні.

**1923** У Празе створаны клуб "Беларускі сакол" — патрыятычна-спартыўная арганізацыя беларускіх студэнтаў (дзейнічала да канца 1924 г.).

## 28 лютага

**1616** Памёр **Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, падарожнік-мемуарыст.

**1913** Нарадзіўся **Аляксей Шудзейка** (г. Мітава, цяпер Елгава, Латвія), дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1916**(?) У Вільні выйшаў першы нумар беларускай грамадска-палітычнай і літаратурнай газеты "Гоман" ("Homan"), выдавалася лацінкай і кірыліцай да канца 1918 г.

**1942** У Ленінградзе ад голаду памёр **Канстанцін Пушкарэвіч** беларускі і расійскі славіст, літаратуразнавец, педагог.

## 29 лютага

**1468** Вялікі князь **Казімір Ягелончык** на сейме выдаў Судзебнік — першы кодэкс крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага права Вялікага княства Літоўскага.

**1768** Шляхта Рэчы Паспалітай стварыла Барскую канфедэрацыю (г. Бар, цяпер Вінніцкая вобл., Украіна), скіраваную супраць караля **Станіслава Аўгуста Панятоўскага** і Расіі і яе ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржавы, за аднаўленне рэальнай незалежнасці.

**1840** Нарадзіўся **Раман Рагінскі**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1872** Нарадзіўся **Вітольд Бялыніцкі-Біруля** (маёнт. Крынкі, цяпер Бялыніцкі р-н), мастак.



# САКАВІК

## 1 сакавіка

**1566** Набыў законную сілу Другі Статут Вялікага княства Літоўскага.

**1581** Створаны Галоўны літоўскі трыбунал — вышэйшая судовая і апеляцыйная ўстанова ў Вялікім княстве Літоўскім.

**1903** Нарадзіўся **Алесь Змагар** (сапр. **Аляксандр Яцэвіч**; в. Цароўка, цяпер у межах Слуцка), удзельнік Слуцкага паўстання, літаратар, настаўнік, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Аўстрыі, Францыя і ЗША. Памёр у Фларыдзе, ЗША (1995).

**1918** У Маскве выйшаў першы нумар газеты “Дзянніца”, органа Беларускага нацыянальнага камісарыята (выдавалася да 24 лютага 1919 г.).

**1933** У ссылцы памёр **Уладзімір Жылка**, паэт, перакладчык, публіцыст. Пахаваны ў г. Уржум (цяпер Ніжагародская вобл., Расія).

**1960** Памёр **Віктар Шутовіч**, каталіцкі святар, культурны дзеяч, вязень савецкіх канцлагераў. Пахаваны на каталіцкіх могілках у Барысаве.

## 2 сакавіка

**1562** Нарадзіўся **Крыштаф Мікалай Дарагастайскі**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, заснавальнік друкарні мяст. Ашмяна Мураваная (цяпер Муравана-Ашмянка, Ашмянскі р-н).

**1896** Нарадзіўся **Станіслаў Глякоўскі** (мяст. Поразава, цяпер Свіслацкі р-н), каталіцкі духоўнік, грамадска-культурны дзеяч, выдавец, публіцыст. Загінуў у Бухенвальдзе.

**1978** У Нью-Йорку памёр **Уладзіслаў Рыжы-Рыскі**, грамадскі і рэлігійны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Бельгіі, Італіі, Іспаніі і ЗША. Нарадзіўся ў в. Латыгаль, цяпер Глыбоцкі р-н (1923).

**1994** Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прагаласаваў за прэзідэнцкую форму кіравання краінай. Парламенцкая апазіцыя байкатавала галасаванне.

**2003** Памерла сястра супольнасці Сясцёр ад Анёлаў **Ванда Банішэўская**, носьбітка стыгматаў, вязень ГУЛАГу.

## 3 сакавіка

**1067** На рацэ Няміга адбылася бітва паміж войскамі паўднёва-рускіх князёў і полацкага князя **Усяслава Брачыслававіча (Чарадзея)**.



Пячатка земскага наваградскага суддзі Ізідора Галаўні. *XVI ст.*

**1767** Памёр **Ёган Глаўбіц**, архітэктар, які працаваў на Беларусі. Нарадзіўся ў 1700 г.

**1913** Памёр **Зыгмунт Пуслоўскі**, мецэнат, калекцыянер.

**1918** У Брэсце падпісана мірная дамова паміж Савецкай Расіяй і Нямеччынай, паводле якой Беларусь страціла значную частку сваёй тэрыторыі.

**1923** У Вільні выйшла газета "Новае жыццё" (выдавалася да 21 траўня 1923 г., закрытая польскімі ўладамі пасля 13-га нумара). Рэдактар **Язэп Лагіновіч**.

**1944** Забіты **Францішак Аляхновіч**, нацыянальны дзеяч, драматург. Пахаваны на могілках Росы ў Вільні.

## 4 сакавіка

**1484** У Гродне памёр князь **Казімір**, сын вялікага князя літоўскага **Казіміра IV Ягелончыка**, патрон Гродзенскага біскупства. Пахаваны ў кафедральным саборы (капліца Св. Казіміра) у Вільні. Кананізаваны ў 1521 г. Дзень Святога Казіміра.

**1503** Падпісаны мір на 6 гадоў паміж Вялікім княствам Літоўскім і Масковіяй, паводле якога да Масквы адышло 29 гарадоў і 70 валасцяў, у тым ліку Чарнігаў, Бранск, Старадуб, Гомель.

**1609** Двухтысячнае войска на чале з гетманам **Янам Хадкевічам** штурмам узяло горад Пярну (цяпер Эстонія), які абараняў шведскі гарнізон.

**1685** Памёр **Якуб Суша**, рэлігійны і грамадскі дзеяч Вялікага княства Літоўскага, пісьменнік. Нарадзіўся ў 1610 г.

**1812** Памёр **Яўхім Храптовіч**, грамадскі і палітычны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, публіцыст, паэт, перакладчык.

**1890** Нарадзіўся **Вінцук Адважны** (сапр. **Язэп Германовіч**; мяст. Гальшаны, цяпер Ашмянскі р-н), каталіцкі святар, пісьменнік, паэт, дзеяч эміграцыі ў Італіі і Вялікабрытаніі.

**1911** Нарадзіўся **Васіль Стома** (маёнт. Лужкі, цяпер Шаркоўшчынскі р-н), пісьменнік, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1927** Нарадзіўся **Міхась Дубянецкі** (в. Востраў, цяпер Пінскі р-н), грамадскі дзеяч, кнігавыдавец, публіцыст, перакладчык.

**1942** Каля в. Беразвечча (цяпер у межах г. Глыбокае) расстраляны гестапаўцамі 20 парафіянаў, а таксама **Мечыслаў Багаткевіч**, **Уладзіслаў Мацьковяк** і **Станіслаў Пыртак**, каталіцкія рэлігійныя дзеячы. Беатыфікаваныя 13 чэрвеня 1999 г.

**1956** У Беластоку выйшаў першы нумар газеты "Ніва", тыднёвіка беларусаў у Польшчы.

**2004** У Вільпенце пад Парыжам памёр **Міхась Наўмовіч**, мастак, дзеяч эміграцыі ў Францыі.

**2005** Памёр **Карлас Шэрман**, пісьменнік, перакладчык, грамадскі дзеяч.

## 5 сакавіка

**1863** У выніку смяротнай раны, атрыманай у бітве, загінуў **Андрэй Патабня**, удзельнік паўстання. Пахаваны ў г. Пясковая Скала (цяпер Кракаўскі пав., Малапольскае ваяв., Польшча).

**1895** Нарадзіўся **Аляксандр Каваленя** (в. Кашанцы, цяпер Бераставіцкі р-н), археолаг.

**1896** Нарадзіўся **Кандрат Крапіва** (сапр. **Атраховіч Кандрат**; в. Нізок, цяпер Уздзенскі р-н), драматург, паэт, мовазнавец.

**1912** Нарадзіўся **Яўген Калубовіч** (на эміграцыі **Каханоўскі**; в. Ціхінічы, цяпер Рагачоўскі р-н), гісторык, грамадска-палітычны дзеяч, літаратуразнавец, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1940** У Ленінградзе памёр **Аляксандр Сержпутоўскі**, этнограф і фальклярыст.

**1985** У Гданьску памёр **Тодар Куніцкі**, лекар, адзін з заснавальнікаў Беларускага Студэнцкага Саюза ў Вільні і Беларускага Сялянскага Саюза.

**2000** У Мінску трапіў пад машыну і загінуў **Мікола Ермаловіч**, гісторык, літаратуразнавец.

**2000** У Рыме беатыфікаваныя 11 сёстраў-назарэцянак, расстраляных гітлераўцамі ў 1943 г. каля Навагрудка.

## 6 сакавіка

**1833** Нарадзіўся **Іван Бялькевіч** (в. Варонічы, цяпер Слонімскі р-н), мовазнавец, педагог, аўтар слоўнікаў.

**1944** Выдадзены загад аб стварэнні Беларускай Краёвай Абароны (БКА).

**1961** У Брусэлі памёр **Барыс Вількіцкі**, даследчык Арктыкі, гідрограф-геадэзіст беларускага паходжання.

**1972** У Мінску заснавана выдавецтва “Мастацкая літаратура”.

**1999** Памёр **Міхаіл Петрыкевіч**, краязнавец, музеязнавец, педагог. Пахаваны ў Вільні.

## 7 сакавіка

**1886** (ці 8 сакавіка 1887) Нарадзіўся **Усевалад Фальскі** (в. Лошыца, цяпер у межах Мінска), акцёр, тэатральны і грамадскі дзеяч. Рэпрэсіраваны, дата і месца смерці невядомыя.

**1931** Памёр **Павел Дземідовіч**, этнограф, фальклярыст, краязнавец, педагог.

**1943** У Мінску савецкімі партызанамі забіты **Фабіян Акінчыц**, грамадска-палітычны дзеяч, журналіст.

**1967** У Сопаце (Польшча) памёр **Караль Румель**, коннік-спартсмен,

першы алімпіец з Беларусі (на Алімпійскіх гульнях 1912 г. у Стакгольме).

**1983** У Шчэціне (Польшча) памёр **Антон Сокал-Кутылоўскі**, вайсковы і грамадскі дзеяч, адзін з кіраўнікоў антысавецкага Слуцкага паўстання, вязень ГУЛАГу.

**1985** Віцебскі абласны суд асудзіў **Міхася Кукабаку** паводле артыкула "антысавецкая прапаганда і агітацыя" да пазбаўлення волі тэрмінам на 6 гадоў.

## 8 сакавіка

**1901** Нарадзіўся **Аляксандр Карповіч** (в. Трашчычы, цяпер Карэліцкі р-н), выдавец, актывіст Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі.

**1910** Нарадзіўся **Пётр Конюх** (в. Турэц, цяпер Карэліцкі р-н), спявак, дзеяч эміграцыі ў Італіі, Бельгіі, ЗША і Канадзе.

**1928** Памёр **Пётр Крачэўскі**, грамадска-палітычны дзеяч, літаратар, гісторык, старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. Пахаваны на Альшанскіх могілках у Празе.

**1929** Нарадзіўся **Факунда Несцяровіч** (в. Юшкавічы, цяпер Мядзельскі р-н), удзельнік антыкамуністычнага падпольнага вучнёўскага руху на Мядзельшчыне, вязень савецкіх канцлагераў.

**1930** Нарадзіўся **Яраслаў Пархута** (в. Мілейкі, цяпер Івацэвіцкі р-н), празаік, паэт, краязнавец.

**1946** У Паставах створана падпольная антысавецкая арганізацыя "За Беларусь".

**1978** Памёр **Герман Бокун**, адзін з заснавальнікаў беларускай фехтавальнай школы.

**1989** Памёр **Мікола Ягаўдзік**, вайсковец, дзеяч эміграцыі ў Бельгіі і ЗША.

**1992** Памёр **Міхась Ракевіч**, удзельнік патрыятычнага падполля 1946–1947 гг. у Заходняй Беларусі, вязень савецкіх турмаў і канцлагераў. Пахаваны ў в. Клепачы Слонімскага р-на. Нарадзіўся ў в. Ваўчкі, цяпер Слонімскі р-н (1927).

## 9 сакавіка

**1659** Маскоўскі гарнізон у Гродне разам з ваяводам здаўся войску гетмана **Паўла Стафана Сапегі**.

**1814** Нарадзіўся **Тарас Шаўчэнка** (в. Морынцы, цяпер Звянігародскі р-н Чаркаскай вобл., Украіна), украінскі пісьменнік, мастак, заснавальнік новай украінскай літаратуры. У 1829–1831 гг. жыў у Вільні. Падтрымоўваў беларускі рух.

**1838** Памёр **Язафат Булгак**, уніяцкі мітрапаліт, базыльянін. Пахаваны на праваслаўных могілках Сергіевай Пустыні паблізу Пецяргофа (цяпер Ленінградская вобл., Расія).

**1883** Нарадзіўся **Францішак Аляхновіч** (г. Вільня), нацыянальны дзеяч, драматург.

**1918** Абвяшчэнне Другой Устаўной граматы Беларускай Народнай Рэспублікі Выканаўчым камітэтам Рады Усебеларускага з'езду.

**1953** У Лювене (Бельгія) памёр **Мікола Равенскі**, кампазітар, фальклярыст, аўтар музыкі беларускага гімна "Магутны Божа", дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Бельгіі.

## 10 сакавіка

**1711** (ці 12 сакавіка) Нарадзіўся **Міхал Антоні Сапега**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, перакладчык, літаратар.

**1781** У Мінску памёр **Міхаіл Карыцкі**, паэт, грамадскі дзеяч, педагог.

**1861** Памёр **Тарас Шаўчэнка**, украінскі пісьменнік, мастак, заснавальнік новай украінскай літаратуры. У 1829–1831 гг. жыў у Вільні. Падтрымоўваў беларускі рух.

**1889** Нарадзіўся **Уладзімір Пігулеўскі** (г. Гродна), грамадскі дзеяч, пісьменнік.

**1942** Нарадзіўся **Міхась Ткачоў** (г. Мсціслаў), грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, археолаг, педагог.

**2005** Памёр **Апанас Цыхун**, краязнавец, педагог, пісьменнік. Пахаваны на могілках на прасп. Касманаўтаў у Гродне.

## 11 сакавіка

**1839** У Вільні расстраляны **Шыман Канарскі**, удзельнік паўстання 1830–1831 гг., дзеяч вызваленчага руху.

**1887** Нарадзіўся **Алесь Гарун** (сапр. **Прушынскі**; фальв. Новы Двор, цяпер Мінскі р-н), дзеяч нацыянальнага руху, паэт.

**1903** Нарадзіўся **Тодар Кляшторны** (в. Парэчча, цяпер Лепельскі р-н), паэт.

**1911** Нарадзіўся **Леў Гарошка** (в. Трашчыцы, цяпер Карэліцкі р-н), уніяцкі рэлігійны дзеяч, асветнік, гісторык, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Францыі і Вялікабрытаніі.

**1913** У Пецярбургу памёр **Андрэй Вількіцкі**, падарожнік, гідрограф-геадэзіст.

**1941** У савецкім зняволенні (ст. Марыінск Кемераўскай вобл., РСФСР) загінуў **Аляксандр Уласаў**, грамадска-культурны дзеяч, выдавец, публіцыст.

**1954** Нарадзілася **Тамара Лазаковіч** (пас. Сяўское Калінінградскай вобл., Расія), гімнастка, чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў (1972).

**1990** У Мінску адслужана першая ў навейшай гісторыі грэка-каталіцкая літургія па беларуску.

## 12 сакавіка

**1569** Падляскае ваяводства Вялікага княства Літоўскага інкарпаравана ў межы Каралеўства Польскага.

**1722** Нарадзіўся **Бенедыкт Дабшэвіч** (ваколіцы Навагрудка), тэолаг-езуіт, філосаф. Памёр у 1799 г.

**1829** Нарадзіўся **Отан Грабніцкі** (маёнт. Арэхаўна Лепельскага пав.), удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1851** Памёр **Ян Баршчэўскі**, пісьменнік, выдавец, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры. Пахаваны ў г. Чуднаў на Валыні.

**1914** Нарадзіўся **Уладзімір Клішэвіч** (в. Краснадворцы, цяпер Салігорскі р-н), паэт, публіцыст, вязень савецкіх турмаў, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1963** У Гайнаўцы (Падляскае ваяв., Польшча) адкрыўся Беларускі музей (27 кастрычніка 1990 г. у новым будынку адкрыўся як Беларускі этнаграфічны музей).

**1986** У Гродне створаны гісторыка-культурны клуб "Паходня".

## 13 сакавіка

**1797** Памёр **Юзаф Пац**, вайсковы дзеяч Вялікага княства Літоўскага, удзельнік паўстання 1794 г. Нарадзіўся ў 1736 г.

**1890** Нарадзіўся **Аляксандр Савіч** (в. Лапеніца, цяпер Ваўкавыскі р-н), гісторык, апалагет Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы.

**1917** У Петраградзе загінуў **Уладзімір Хлябцэвіч**, удзельнік нацыянальнага грамадска-літаратурнага руху пачатку XX ст. Пахаваны ў Сызрані (Самарская вобл., Расія).

**1989** У Чыкага памёр **Іван Касяк**, грамадскі дзеяч, публіцыст, гісторык, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахаваны на беларускіх могілках у Саўт-Рыверы (Нью-Джэрсі, ЗША).

## 14 сакавіка

**1863** На Гродзенскім чыгуначным вакзале адбыўся бой паўстанцаў з расійскім войскам.

**1943** Памёр **Васіль Захарка**, грамадска-палітычны дзеяч, старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (1928–1943). Пахаваны на Альшанскіх могілках у Празе.

**1954** Памёр **Людамір Рагоўскі**, польскі і беларускі кампазітар і дырыжор.

**1995** У Нью-Йорку памёр **Уладзімір Сядура (Глыбінны)**, пісьменнік, літаратуразнавец, вязень савецкага канцлагера, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахаваны на могілках манастыра Святой Тройцы ў Джорданвіле (Нью-Йорк, ЗША)

## 15 сакавіка

**1410** Адбыўся напад крыжацкіх палкоў на Ваўкавыск з мэтай забойства князя **Вітаўта**.

**1850** (ці 1849) Нарадзіўся **Вайніслаў Савіч-Заблоцкі** (маёнт. Панчаны, цяпер Міёрскі р-н), паэт, празаік, публіцыст. Памёр пасля 1893 г.

**1881** Нарадзіўся **Аляксей Назарэўскі** (в. Сіняўка, цяпер Клецкі р-н), дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, вязень ГУЛАГу. Памёр ці быў расстраляны пасля верасня 1941 г.

**1992** Памёр **Уладзімір Цвірка** (да эміграцыі **Вадзім Сурко**), журналіст, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Вялікабрытаніі і Бельгіі. Пахаваны на могілках Вэстфрайдгоф у Мюнхене (Нямеччына).

**1994** У Мінску на сесіі Вярхоўнага Савета 12-га склікання прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

**1997** У Мінску адбыліся дэманстрацыя і мітынг у абарону Канстытуцыі 1994 года.

## 16 сакавіка

**1853** У Паставах памёр **Канстанцін Тызенгаўз**, асветнік, прыродазнавец.

**1908** Нарадзіўся **Васіль Кендыш** (в. Чарапы Нясвіжскага пав.), грамадскі дзеяч, настаўнік, праваслаўны святар, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1919** У Гродне выйшаў першы нумар газеты “Бацькаўшчына” (выдавалася да 28 сакавіка).

**2003** У Мінску адбыўся Першы Усебеларускі сход інтэлігенцыі (больш 600 чалавек). Створана Рада беларускай інтэлігенцыі.

## 17 сакавіка

**1569** У Заблудаве (цяпер Беластоцкі пав., Падляскае ваяв., Польшча) скончаны друк “Вучыцельнага Эвангелля”.

**1597** Віцебск атрымаў магдэбургскае права.

**1808** Нарадзіўся **Шыман Канарскі** (в. Дабкішкі, цяпер Аўгустоўскі пав. Падляскага ваяв., Польшча), удзельнік паўстання 1830–1831 гг., дзеяч вызваленчага руху.

**1910** Нарадзіўся **Хведар Ільяшэвіч** (г. Вільня), пісьменнік, гісторык, журналіст, педагог, грамадска-культурны дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне. Загінуў у аўтакатастрофе ў 1948 г., пахаваны на могілках у Галендорфе (Ніжняя Саксонія, Нямеччына).

**1922** Нарадзіўся **Лявон Луцкевіч** (г. Вільня), грамадска-палітычны і культурны дзеяч, вязень савецкіх канцлагераў.

**1951** Памёр **Альберт Паўловіч**, паэт-гумарыст, драматург. Пахаваны на Маскоўскіх могілках у Курску (Расія).

## 18 сакавіка

**1758** Памёр **Тамаш Жаброўскі**, асветнік, архітэктар, астраном, матэматык.

**1791** Прыняты закон "Аб вольных гарадах у Рэчы Паспалітай".

**1894** Нарадзіўся **Альбін Стаповіч** (в. Барані, цяпер Астравецкі р-н), грамадска-культурны дзеяч, кампазітар, музычны педагог, публіцыст.

**1921** Паміж РСФСР і Польшчай падпісана Рыжская дамова, якая тэрытарыяльна падзяліла Беларусь.

**1967** Памёр **Аляксандр Ільінскі**, артыст тэатра.

**1969** У Мядзелі адкрыўся музей народнай славы (заснаваны ў 1967 г.).

**1992** Вярхоўны Савет Беларусі загадаў ураду пачаць фарміраванне нацыянальных Узброеных сіл.

## 19 сакавіка

**1612** Памерла **Соф'я Алелька-Радзівіл**, асветніца, прылічана да ліку Святых.

**1768** Нарадзіўся **Адам Храптовіч** (Шчорсы, цяпер Навагрудскі р-н), асветнік, мецэнат, удзельнік паўстання 1794 г.; заснавальнік буйной пачатковай школы ў Шчорсах.

**1862** У Парыжы памёр **Аляксандр Валадковіч**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1830–1831 гг.

**1887** У Жэневе (Швейцарыя) памёр **Юзаф Ігнацы Крашэўскі**, пісьменнік, гісторык, грамадскі дзеяч.

**1895** Нарадзіўся **Тамаш Грыб** (в. Паляны, цяпер Смаргонскі р-н), палітычны і культурны дзеяч.

**1917** У Мінску адбылася маніфестацыя ў гонар перамогі Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі.

**1918** У Мінску створана выдавецкае кааператыўнае таварыства "Заранка" (дзейнічала да чэрвеня 1920 г.).

**1921** Нарадзіўся **Язэп Юхо** (Мінск), юрыст, гісторык права, сябар Кансерватыўна-Хрысціянскай Партыі Беларускі Народны Фронт.

**1932** У Асташыне (цяпер Навагрудскі р-н) адбыўся бунт сялян супраць падатковага прыгнёту польскіх уладаў.

**1974** Памёр **Эдуард Сташкевіч**, удзельнік антыкамуністычнага падпольнага вучнёўскага руху ў Смаргонях у 1949–1950 гг. Пахаваны ў Солах Смаргонскага р-на.

**1990** Памёр **Аляксандр Смаль**, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Аўстраліі. Нарадзіўся ў 1903 г.

**2006** У Беларусі адбыліся прэзідэнцкія "выбары", пачаліся масавыя акцыі пратэсту ў Мінску і іншых гарадах краіны.

## 20 сакавіка

**1440** У выніку змовы забіты **Жыгімонт Кейстутавіч**, вялікі князь

літоўскі (1432–1440). Нарадзіўся каля 1365 г.

**1875** На Украіне памёр **Януар Сухадольскі**, жывапісец-баталіст, удзельнік паўстання 1830–1831 гг.

**1922** Памёр **Алесь Бурбіс**, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху.

**1952** Нарадзіўся **Алесь Емельянаў** (в. Забалоцце Чавускага р-на), паэт, адзін з заснавальнікаў Беларускага Народнага Фронту “Адраджэнне”.

**1976** У Маскве памёр **Уладзімір Дубоўка**, паэт, перакладчык.

**1988** У Мінску адбыўся мітынг у абарону гістарычнага Верхняга горада, супраць будаўніцтва станцыі метро “Няміга” на месцы мінскага замчышча.

**1988** У Польшчы памёр **Зыгмунт Абрамовіч**, акцёр.

**1992** У Мінску памерла **Тамара Чабан**, літаратуразнавец. Пахавана ў Ракаве Валожынскага р-на.

**1995** У Полацку выйшаў першы нумар грэка-каталіцкай газеты “Царква”. (Першыя 10 нумароў выйшлі ў Полацку, з 1996 г. выдаецца ў Брэсце).

**1996** Памёр **Яраслаў Пархута**, празаік, паэт, краязнавец.

**1999** У Маладзечне памёр **Мікола Трухан**, тэатральны рэжысёр, акцёр. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

## 21 сакавіка

**1608** Памёр **Канстанцін Астрожскі**, палітычны, вайсковы і культурны дзеяч Вялікага княства Літоўскага. Нарадзіўся ў маёнт. Дубна на Валыні (цяпер Ровенская вобл., Украіна) у 1527 г.

**1840** Нарадзіўся **Францішак Багушэвіч** (фальв. Свіраны, цяпер Вільнюскі пав., Літва), паэт, празаік, публіцыст, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1849** У турме памёр **Аляксандр Незабытоўскі**, засуджаны да 20 гадоў катаргі за перавоз нелегальнай літаратуры, беларускі і польскі пісьменнік, філосаф, гісторык.

**1913** Нарадзіўся **Станіслаў Пыртак** (мяст. Быстра Падгалянска, цяпер Сускі пав. Малапольскага ваяв., Польшча), рымска-каталіцкі святар, блаславёны.

**1987** У Мінску памёр **Адам Русак**, паэт-песеннік. Пахаваны ў в. Пясочнае Капыльскага р-на.

## 22 сакавіка

**1786** Нарадзіўся **Яўхім Лялевель** (Варшава), гісторык, вучоны, грамадскі дзеяч, ідэолаг паўстання 1830–1831 гг.

**1864** У Вільні на Лукішскім пляцы павешаны **Кастусь Каліноўскі**, кіраўнік нацыянальна-вызваленчага паўстання. Магіла знаходзілася паблізу сённяшняй вежы Гедыміна.

**1882** Нарадзіўся **Эдзюк (Эдвард) Будзька** (мяст. Будслаў, цяпер Мядзельскі р-н), паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч, заснавальнік каапэратыўнага руху. Памёр у ЗША (1956).

**1921** У Вільні выйшаў першы нумар газеты “Беларускі звон” (выходзіла да 24 лютага 1923 г.). Рэдактар-выдавец **Францішак Аляхновіч**.

**1943** Разам з жыхарамі спалена вёска Хатынь (142 чалавекі).

## 23 сакавіка

Сусветны метэаралагічны дзень

**1695** Памерла **Людвіка Караліна Радзівіл**, асветніца, мецэнатка.

**1716** Створана Віленская канфэдэрацыя літоўскай і беларускай шляхты, якая выступіла супраць караля Аўгуста II Моцнага. У выніку былі пашыраны правы шляхты.

**1865** Нарадзіўся **Стары Улас** (сапр. **Уладзіслаў Сівы-Сівіцкі**; г. Валожын), паэт.

**1895** Нарадзіўся **Васіль Сташэўскі** (в. Свінка, цяпер в. Лугавая Капыльскага р-на), пісьменнік, грамадскі дзеяч, удзельнік Слуцкага паўстання.

**1918** Рада Беларускай Народнай Рэспублікі абвясціла Гарадзеншчыну беларускай тэрыторыяй.

**1927** Нарадзіўся **Уладзімір Шнэк** (Мінск), вайсковы і грамадскі дзеяч, пісьменнік, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Аўстраліі.

**1933** Памёр **Уладзімір Пянткевіч**, кіраўнік Усходняй місіі, супэрыёр законнага дому айцоў езуітаў у Альбярціне каля Слоніма.

**1942**(?) У савецкім канцлагеры на лесапавале загінуў (паводле іншай версіі быў расстраляны) **Сяргей Ракіта** (сапр. **Законнікаў Сяргей**), паэт. Пахаваны на ст. Сухабязводнае (Горкаўская вобл., Расія).

**1978** Памёр **Рыгор Шырма**, грамадска-культурны дзеяч, харавы дырыжор, фальклярыст, публіцыст. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**1990** У Мінску створаны Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі.

**1991** У Мінску пачаўся (доўжыўся два дні) II з’езд Беларускага Народнага Фронту “Адраджэнне”.

## 24 сакавіка

**1794** Пачалосявызваленчаепаўстанне на чале з **Тадэвушам Касцюшкам**.

**1896** Нарадзілася **Вера Маслоўская** (в. Агароднічкі, цяпер Беластоцкі пав. Падляскага ваяв., Польшча), грамадска-палітычны дзеяч, настаўніца.

**1919** У Гомелі пачалося антыбальшавіцкае паўстанне (доўжылася да 29 сакавіка 1919 г.).

**1990** З ініцыятывы Беларускага Народнага Фронту скліканы ІІ Усебеларускі дэмакратычны форум, на якім створана “Дэмакратычная плынь” у Вярхоўным Савеце БССР.

**1994** У Вільні ўстаноўлена памятная дошка **Кастусю Каліноўскаму**.

**1996** У Мінску адбылося шэсце апазіцыі і мітынг супраць аб’яднання Беларусі з Расіяй (удзельнічалі каля 30 тысяч чалавек).

## 25 сакавіка

Дзень Волі

**1717** Нарадзіўся **Альбрыхт Радзівіл** (мяст. Дзятлава), дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага. Памёр пасля 1790 г.

**1905** Нарадзіўся **Алесь Вечар** (в. Машчыцы, цяпер Слуцкі р-н), біяхімік, паэт.

**1905** Нарадзіўся **Браніслаў Ржэўскі** (в. Добрыцкае, цяпер Барысаўскі р-н), літаратуразнавец, педагог, дысідэнт, палітычны вязень.

**1917** У Мінску пачаўся з’езд беларускіх нацыянальна-дэмакратычных арганізацыяў (доўжыўся да 27 сакавіка), заснаваны Беларускі нацыянальны камітэт (БНК).

**1918** У Мінску абвешчана Трэцяя ўстаўная грамата Беларускай Народнай Рэспублікі.

**1928** Нарадзіўся **Аляксандр Дзікі** (в. Кузьмічы, цяпер Мядзельскі р-н), удзельнік паўстанцкай маладзёжнай арганізацыі Саюз Беларускіх Патрыётаў, вязень савецкіх канлагераў.

**1937** У Вільні памёр **Зыгмунт Нагродскі**, культурны дзеяч, паэт. Нарадзіўся ў в. Зулова Свянцянскага пав., цяпер Літва.

**1946** У в. Рамелькі (Пастаўскі р-н) створаны Саюз Беларускіх Патрыётаў — падпольная антысавецкая арганізацыя.

**1950** У Сіднеі адбыўся І з’езд сяброў Беларускага Аб’яднання ў Аўстраліі.

**1958** У г. Кан (Францыя) у шпіталі памёр **Аляксей Кабычкін**, нацыянальны дзеяч, удзельнік Слуцкага паўстання. Нарадзіўся ў 1891 г.

**1959** У кангрэсе ЗША ўніяцкі святар **Уладзімір Тарасевіч** адчытаў малітву за беларускі народ.

**1992** У Гродне выйшаў першы нумар газеты “Пагоня”. Выдавалася да 2001 г.

**1997** У Вільні выйшаў першы нумар газеты “Рунь”.

**1999** У аўтакатастрофе загінуў **Вячаслаў Чарнавіл**, украінскі палітычны дзеяч, дысідэнт, змагар за незалежнасць Украіны. Актыўна падтрымоўваў незалежнасць Беларусі.

**2000** У Мінску з удзелам 30 тысяч чалавек адбыўся “Марш свабоды”.

**2004** Памерла **Валянціна Пашкевіч**, дзеяч эміграцыі ў Канадзе, аўтар беларускіх падручнікаў і “Ангельска-беларускага слоўніка”.

**2006** У Мінску з удзелам каля 50 тысяч чалавек адбыліся акцыі пратэсту супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў.

## 26 сакавіка

**1896** Нарадзіўся **Казімір Кулак** (в. Кудзераўшчына, цяпер Сакольскі пав. Падляскага ваяв., Польшча), доктар тэалогіі, каталіцкі святар, грамадска-рэлігійны дзеяч. Памёр у 1989 г.

**1932** Памёр **Зыгмунт Лазінскі**, каталіцкі святар. Пахаваны ў крыпце кафедральнага касцёла ў Пінску.

**1988** У Беластоку падчас тайнага святкавання ўгодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі сфарміраваны заснавальніцкі камітэт Беларускага Аб'яднання Студэнтаў (БАС).

**2004** Памёр **Янка Баран**, дзеяч эміграцыі ў Канадзе.

## 27 сакавіка

Міжнародны дзень тэатра

**1851** Нарадзіўся **Аляксей Сапуноў** (мяст. Усвяты, цяпер Пскоўская вобл., Расія), гісторык, археограф, краязнавец.

**1891** (ці 26 красавіка) Нарадзіўся **Клаўдзій Дуж-Душэўскі** (г. Глыбокае), палітычны дзеяч.

**1899** Нарадзіўся **Аляксей Васіленя** (в. Малая Бераставіца, цяпер Бераставіцкі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Аўстраліі.

**1909** Нарадзіўся **Валерый Маракоў** (в. Акалонія, цяпер у межах Мінска), паэт.

**1979** У Вашынгтоне памёр **Рыгор Крушына** (**Казак**), пісьменнік, паэт, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1993** У Вільні на могілках Росы адкрыты помнік **Івану** і **Антону Луцкевічам**.

## 28 сакавіка

**1886** У Любяшове (цяпер Валынская вобл., Украіна) памёр **Уладзіслаў Борзабагаты**, лекар, мемуарыст, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1928** Нарадзіўся **Эдуард Сташкевіч** (в. Дэгісі, цяпер Смаргонскі р-н), удзельнік антыкамуністычнага падпольнага вучнёўскага руху ў Смаргонях у 1949–1950 гг.

**1953** Каля в. Запруды (Кобрынскі р-н) адбылася ўзброеная сутычка беларускага партызанскага атрада з аддзелам МГБ. У час яе загінуў **Сымон Міхальчук**, камандзір атрада, надлейтэнант, сябар Згуртавання Беларускіх Патрыётаў і Беларускага Вызваленчага Руху.

**1995** Памёр **Часлаў Найдзюк**, грамадскі дзеяч, юрыст, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

## 29 сакавіка

**1611** Задушэнне войскамі Гансеўскага паўстання гараджанаў супраць польска-беларускага гарнізона ў Маскве.

**1989** Памёр **Аляксандр Пракапенка**, футбаліст, чэмпіён СССР (1982), адзіны прадстаўнік Беларусі — бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў (1980). Пахаваны ў Бабруйскім р-не.

**1996** У Беларусі прайшла серыя акцый супраць інтэграцыі Беларусі і Расіі, у Мінску адбылося пікетаванне расійскай амбасады.

## 30 сакавіка

**1739** Нарадзіўся **Павел Брастоўскі** (**Бжастоўскі**) грамадскі і дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага.

**1927** У Вільні выйшла газета "Наша праўда" (выдавалася да 24 верасня 1927 г.).

**1953** Нарадзіўся **Валерый Маслюк** (в. Копцева Полацкага р-на), тэатральны рэжысёр.

**1968** У Перце (Аўстралія) адбылося ўрачыстае адкрыццё Беларускага Народнага Дома.

**1983** Памерла **Аўгіння Каранеўская** (дзяв. **Воўк-Леановіч**), настаўніца, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі. Пахавана на могілках Роквуд у Сіднеі (Аўстралія).

## 31 сакавіка

**1785** Памёр граф **Антоні Тызенгаўз**, дзяржаўна-грамадскі дзеяч Вялікага княства Літоўскага, мецэнат, рэфарматар. Пахаваны ў Жалудку (Шчучынскі р-н). Нарадзіўся ў Наваельні, цяпер Дзятлаўскі р-н (1733).

**1903** Нарадзіўся **Міхась Маскалік** (мяст. Гарадзея, цяпер Нясвіжскі р-н), грэка-каталіцкі святар, навуковец.

**1938** У Сібіры ў савецкім канцлагеры расстраляны **Фелікс Купцэвіч**, пісьменнік, крытык.

**1969** У Чыкага памёр **Мікола Шчаглоў** (на эміграцыі **Куліковіч**), кампазітар, музычны і тэатральны дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

# КРАСАВІК

## 1 красавіка

**1548** Памёр **Жыгімонт І Стары**, вялікі князь літоўскі і кароль польскі (1506–1548).

**1557** У Вялікім княстве Літоўскім прынята “Устава на валокі” — асноўны дакумент Вялікай аграрнай рэформы.

**1773** Нарадзіўся **Юстын Нарбут**, гісторык, удзельнік паўстання 1794 г., стрыечны брат **Тодара Нарбута**.

**1862** (ці 6 красавіка) Нарадзіўся **Адам Багдановіч** (мяст. Халопенічы, цяпер Крупскі р-н), этнограф, гісторык культуры, мемуарыст, удзельнік рэвалюцыйна-народніцкага руху, бацька Максіма Багдановіча.

**1877** Нарадзіўся **Васіль Захарка** (в. Дабрасельцы, цяпер Зэльвенскі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (1928–1943).

**1914** Нарадзіўся **Васіль Струмень** (сапр. **Аляксандр Лебедзеў**; в. Лявонцева, цяпер Мантураўскі р-н Кастрамской вобл., Расія), беларускі і ўкраінскі пісьменнік.

**1927** Нарадзіўся **Лявон Белы**, дысідэнт, вязень ГУЛАГу.

**1940** У саратаўскай турме памёр **Язэп Лёсік**, грамадска-палітычны дзеяч, мовазнавец, пісьменнік, педагог.

**1943** Расстраляны (ці памёр у Берлінскай турме) **Антон Неманцэвіч**, уніяцкі святар, царкоўны дзеяч, вязень савецкіх і фашысцкіх турмаў.

**1971** У Бельску (Польшча) памёр **Яраслаў Кастыцэвіч**, педагог, грамадскі і царкоўны дзеяч.

**1976** Памёр **Іван Тарасюк**, удзельнік патрыятычнага падполля на Слонімшчыне ў 1946–1947 гг. Пахаваны ў Слоніме.

**1989** У Гданьску (Польшча) заснаваны гурток Беларускага Аб’яднання Студэнтаў.

## 2 красавіка

**1640** У Варшаве памёр **Мацей Сарбеўскі**, беларускі і польскі лацінамоўны паэт, літаратуразнавец, тэолаг.

**1832** Нарадзіўся **Павел Баброўскі** (маёнт. Вака каля Вільні), гісторык, этнограф, краязнавец.

**1933** Нарадзіўся **Віктар Шымук** (в. Змяёўцы, цяпер Дзятлаўскі р-н), пісьменнік, перакладчык.



Пячатка Тэадора Скуміна Тышкевіча, ваяводы наваградскага і старасты гарадзенскага

**1968** У Бразіліі ў аўтакатастрофе загінулі атаман **Якуб Харэўскі** і яго ад'ютант **Кастусь Гук**, удзельнікі беларускага нацыянальнага партызанскага руху 1942–1948 гг. (**Якуб Харэўскі** нарадзіўся ў в. Харэва Пружанскага пав. у 1900 г., **Кастусь Гук** — у 1913 г.)

**1995** Памёр **Пімен Панчанка**, народны паэт Беларусі. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**1996** У Маскве падпісана дамова аб саюзе Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. У Мінску адбыліся масавыя акцыі пратэсту і іх жорсткі разгон.

**2006** У Кліўлендзе (ЗША) **Сяргей Ляховіч**, баксёр, выхаванец віцебскай школы стаў чэмпіёнам свету ў суперцяжкай вагавай катэгорыі, паводле версіі WBO.

## 3 красавіка

**1885** Нарадзіўся **Барыс Вількіцкі** (г. Пулкава пад Пецярбургам), даследчык Арктыкі, гідрограф-геадэзіст беларускага паходжання.

**1973** Памёр **Анатоль Марцінкевіч**, адзін з пачынальнікаў беларускага баскетбола.

**1980** У Стэмфардзе (Канектыкут) памёр **Леанід Галяк**, юрыст, журналіст, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1991** У Мінску пачалася забастоўка рабочых з эканамічнымі і палітычнымі патрабаваннямі (доўжылася два дні). Забастоўка адбывалася цягам красавіка ў розных гарадах (Мінску, Оршы, Салігорску).

**2003** Памёр **Алег Табола**, удзельнік маладзёжнага антысавецкага падполля ў Глыбокім, вязень ГУЛАГу.

## 4 красавіка

**1557** Нарадзіўся **Леў Сапега** (маёнт. Астроўна, цяпер Бешанковіцкі р-н), дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага.

**1682** Памёр **Міхаіл Казімір Пац**, дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага княства Літоўскага. Нарадзіўся ў 1624 г.

**1683** Памёр **Багуслаў Казімір Маскевіч**, вайсковы і грамадскі дзеяч Вялікага княства Літоўскага, пісьменнік-мемуарыст. Пахаваны ў дамініканскім касцёле ў Навагрудку.

**1794** Каля в. Рацлавіцы (пад Кракавам, цяпер Польшча) адбылася першая буйная бітва ў часе паўстання **Тадэвуша Касцюшкі**. Паўстанцкае войска перамагло.

**1863** У баі загінуў **Юльян Бакшанскі**, удзельнік вызваленчага руху, камандзір паўстанцкага атрада, публіцыст. Пахаваны ў в. Плябань, цяпер Маладзечанскі р-н.

**1887** Нарадзіўся **Фабіян Шантыр** (г. Слуцк), грамадска-палітычны дзеяч, публіцыст, пісьменнік, перакладчык.

**1893** (ці 1896 або 1897) Нарадзіўся **Мікола Шчаглоў** (на эміграцыі **Куліковіч**; Смаленшчына, ці Масква), кампазітар, музычны і тэа-

тральны дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1896** Нарадзіўся **Васіль Русак** (в. Ячава, цяпер Слуцкі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, адзін з кіраўнікоў Слуцкага Збройнага Чыну. Загінуў у савецкім канцлагеры (1946).

**1899** Нарадзіўся **Віталь Хамёнак** (в. Баяршчына, цяпер Лепельскі р-н), дзеяч хрысціянскага руху. Памёр у Скурцы Седлецкага пав. Мазавецкага ваяв., Польшча (1971).

**1904** Нарадзіўся **Юры Кашыра** (в. Аляксандрава, каля Дзісны), каталіцкі святар, блаславёны.

## 5 красавіка

**1940** Памёр **Мікалай Шчакаціхін**, мастацтвазнавец, педагог.

**1990** Вярхоўны Савет Беларусі абвясціў 26 красавіка Днём Чарнобыльскай трагедыі.

**1996** За верш “Забі прэзідэнта” органамі КДБ арыштаваны паэт **Славамір Адамовіч**. Пазней засуджаны да турэмнага зняволення.

## 6 красавіка

**1656** Памёр **Шыман Старавольскі**, гісторык і пісьменнік Вялікага княства Літоўскага. Нарадзіўся ў 1588 г.

**1812** Нарадзіўся **Аляксандр Герцэн** (Масква), расійскі грамадскі дзеяч, публіцыст, філосаф. Выступаў за нацыянальнае самавызначэнне беларусаў, падтрымоўваў вызваленчае паўстанне 1863–1864 гг.

**1893** Нарадзіўся **Язэп Гаўрылік** (в. Калодчына, цяпер Вілейскі р-н), дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, настаўнік.

**1904** Нарадзіўся **Мікола Хведаровіч** (г. Капыль), паэт, празаік, перакладчык, вязень ГУЛАГу.

**1948** Памёр **Мікола Шыла**, грамадскі дзеяч, нашанівец, журналіст, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне. Нарадзіўся ў Смаргонях (1888).

**1999** У Мінску пры загадкавых абставінах памёр **Генадзь Карпенка**, грамадска-палітычны дзеяч, вучоны.

## 7 красавіка

Сусветны дзень здароўя

**1410** У Кежмарку (цяпер Славаччына) крыжакі здзейснілі спробу забойства князя **Вітаўта**.

**1860** Памёр **Караль Падчашынскі**, асветнік, архітэктар, даследчык, педагог.

**1973** У Саратаве (Расія) памёр **Язэп Дыла**, грамадскі дзеяч, пісьменнік.

**1983** Памерла **Ларыса Геніюш**, паэтэса, вязень ГУЛАГу. Пахавана ў Зэльве.

**2006** Памёр **Кастусь Мыслівец**, грамадска-палітычны дзеяч, сябар Драгічынскага Беларускага Народнага Фронту.

## 8 красавіка

**1904** Памёр **Вацлаў Валодзька**, грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Нарадзіўся на Меншчыне (1831).

**1956** У Мінску адкрыўся Беларускі дзяржаўны тэатр юнага гледача.

## 9 красавіка

**1917** У Мінску прайшоў З'езд Беларускіх нацыянальных арганізацый (7–9 красавіка).

**1917** Нарадзіўся **Мікола Вярба** (сапр. **Сільвановіч**; в. Верадова, цяпер Маладзечанскі р-н), пісьменнік, грамадскі дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Канадзе. Памёр у 1975 г. у Вініпэгу (Канада).

**1946** У Міхельсдорфе (Нямеччына) з ініцыятывы **Наталлі Арсенневай** і **Юркі Віцьбіча** створана Беларускае літаратурнае згуртаванне "Шыпшына".

**1970** У Мінску адбыўся стыхійны маладзёжны мітынг, які быў разагнаны міліцыяй і ўнутранымі войскамі.

## 10 красавіка

Міжнародны дзень вызвалення вязеняў фашысцкіх канцлагераў

**1635** Памёр **Ян Станіслаў Сапега**, сын **Льва Сапегі**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага.

**1900** Нарадзіўся **Гаўрыла Гарэцкі** (в. Багацькаўка, цяпер Мсціслаўскі р-н), геолаг, географ, эканаміст, дэмограф, дзеяч нацыянальна-культурнага руху.

**1905** Нарадзіўся **Сцяпан Баркоўскі** (г. Слуцк), удзельнік Слуцкага паўстання, літаратуразнавец, этнограф, вязень ГУЛАГу.

**1982** У Памоне (Нью-Джэрсі) памерла **Апалонія Савёнак** (дзяв. **Раткевіч**), настаўніца, пісьменніца, дзеяч эміграцыі ў ЗША. Маці **Зоры Кіпель**.

## 11 красавіка

**1863** Каля вёскі Новы Двор (цяпер Шчучынскі р-н) адбылася бітва паміж паўстанцкім атрадам Людвіка Нарбута і расійскім войскам.

**1864** У Мінску расстраляны **Антон Алендскі**, палявы камандзір паўстання 1863–1864 гг. Нарадзіўся у Люблінскай губ. (каля 1843).

**1923** У Вільні пачаўся першы з'езд педагогаў беларускіх сярэдніх школ Заходняй Беларусі, скліканы Таварыствам Беларускай Школы (доўжыўся чатыры дні).

**1937** У Магілёве расстраляны (паводле іншых версій скончыў самагубствам ці памёр пасля катаванняў) **Цішка Гартны** (сапр. **Зміцер Жылуновіч**), дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, дзяржаўны дзеяч БССР, гісторык, пісьменнік, публіцыст. Пахаваны на ўскрайку Пячэрскага парка ў Магілёве.

## 12 красавіка

**1541** Нарадзіўся **Іпацій Пацей** (фальв. Ружанка Камянецкага пав., цяпер у Польшчы), царкоўны і дзяржаўны дзеяч, пісьменнік-палеміст.

**1890** Нарадзіўся **Янка Нёманскі** (сапр. **Іван Пятровіч**; в. Шчорсы, цяпер Навагрудскі р-н), пісьменнік, эканаміст.

**1926** У Вільні пачаўся так званы "працэс 94-х" — суд, арганізаваны польскімі ўладамі над дзеячамі заходнебеларускага нацыянальнага руху (доўжыўся да 22 красавіка 1926 г.).

**1969** У г. Пэнлей (Вялікабрытанія) памёр **Сяргей Малафееў**, медык, адзін з заснавальнікаў Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні, вязень савецкіх канцлагераў.

**1995** У ноч на 12 красавіка па загаду выканаўчай улады ў беларускім парламенце жорстка збіты дэпутаты Вярхоўнага Савета ад апазіцыі, якія напярэдадні абвясцілі галадоўку супраць незаконных загадаў прэзідэнта. Пачаўся антыканстытуцыйны пераварот.

## 13 красавіка

**1871** Нарадзіўся **Юры Матулевіч** (мяст. Лугіна Марыямпальскага пав., цяпер Літва), рымска-каталіцкі рэлігійны дзеяч Заходняй Беларусі і Літвы, блаславёны.

**1881** У Пецярбургу рэвалюцыянер-нарадаволец **Ігнат Грынявіцкі** бомбай забіў цара **Аляксандра II** і загінуў пры тым сам.

**1924** У Мінску выйшаў першы нумар літаратурна-мастацкага часопіса "Радавая рунь" (выдаваўся да 19 чэрвеня 1924 г.).

## 14 красавіка

**1101** Памёр полацкі князь **Усяслаў Брачыслававіч** (**Чарадзей**). Нарадзіўся каля 1029 г.

**1347** Павешаны **Антоній**, адзін з трох віленскіх пакутнікаў.

**1707** Памёр **Тодар Абуховіч**, дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага княства Літоўскага, мемуарыст. Нарадзіўся ў 1642 г.

**1835** Нарадзіўся **Валяр'ян Вільчэўскі** (в. Сянно, цяпер Навагрудскі р-н), лекар, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. у атрадзе **Францішка Юндзіла** (Слонімскі пав.).

**1880** У Слуцку нарадзіўся **Язэп Дыла**, грамадскі дзеяч, пісьменнік.

**1885** Нарадзіўся **Сымон Рак-Міхайлоўскі** (в. Максімаўка, цяпер Маладзечанскі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, сябар Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, публіцыст, заснавальнік і дырэктар настаўніцкай семінарыі ў Барунах (1920–1922).

**1920** Нарадзіўся **Аляксей Карпюк** (в. Страшава Беластоцкага пав. Падляскага ваяв., Польшча), пісьменнік, грамадскі дзеяч.

**1931** Памёр **Віктар Вальтар**, пісьменнік. Пахаваны на каталіцкіх могілках у Даўгаўпілсе (Латвія).

**2003** Памерла **Зора Кіпель** (дзяв. **Савёнак**), бібліёграф, літаратуразнавец, публіцыстка, грамадска-культурны дзеяч эміграцыі ў ЗША. Пахавана на беларускіх могілках у Іст-Брансвіку (Нью-Джэрсі, ЗША)

## 15 красавіка

**1852** Памёр **Тадэвуш Тышкевіч**, дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага княства Літоўскага, удзельнік паўстанняў 1794 і 1830–1831 гг. Быў пахаваны на могілках Пэр-Лашэз у Парыжы, перапахаваны ў Варшаве (1939).

**1900** Нарадзіўся **Уладзімір Тамашчык** (у манастве **Васіль**; в. Вялікія Азяранкі, цяпер Ваўкавыскі р-н), праваслаўны святар, архіепіскап Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы на эміграцыі.

**1919** У Мінску пры педагагічным інстытуце ўтворана Мінскае навуковае педагагічнае таварыства (дзейнічала да 1923 г.).

**1940** У Мінску ў турме памёр **Язэп Лагіновіч**, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, удзельнік Слуцкага паўстання.

## 16 красавіка

**1794** **Якуб Ясінскі** ўзначаліў вызваленчае паўстанне ў Вялікім княстве Літоўскім.

**1832** Нарадзіўся **Альфрэд Ромер** (г. Вільня), мастак, скульптар, медальер, мастацтвазнавец, этнограф, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1888** (ці 19 красавіка) У Кракаве памёр **Зыгмунт Урублеўскі**, навуковец-фізік, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1911** Нарадзілася **Зоя Коўш**, нацыянальны дзеяч ў Вільні, вязень ГУЛАГу.

**1940** Памёр **Адам Багдановіч**, этнограф, гісторык культуры, мемуарыст, удзельнік рэвалюцыйна-народніцкага руху, бацька **Максіма Багдановіча**. Пахаваны ў Яраслаўлі.

**1959** Памерла **Зінаіда Бандарына**, пісьменніца, паэтэса. Пахавана на Усходніх магілках у Мінску.

## 17 красавіка

**1863** У Коўне ў шпіталі ад ран памёр **Лявон Кульчыцкі**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. на Гарадзеншчыне. Нарадзіўся каля 1823 г.

**1880** Нарадзіўся **Кастусь Гадыцкі-Цвірка** (Мінск), педагог, грамадскі дзеяч. Забіты ў 1930-х гг.

**1891** Нарадзіўся **Язэп Варонка** (Сакольшчына, цяпер Падляскае ваяв., Польшча), палітычны дзеяч, журналіст, публіцыст, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1911** Нарадзіўся **Сымон Шаўцоў** (Случчына), дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Аўстраліі, пісьменнік.

**1973** Памёр **Пётр Юргялевіч**, мовазнавец, педагог, вязень савецкіх канцлагераў.

## 18 красавіка

Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцін

**1814** Нарадзіўся **Яўстах Тышкевіч** (г. Лагойск), гісторык, краязнавец, адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі.

**1827** Нарадзіўся **Якуб Гейштар** (маёнт. Мядэкшы, цяпер Кедайенскі пав., Літва), публіцыст, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1838** Нарадзіўся **Уладзіслаў Дыбоўскі** (маёнт. Адамарын, цяпер Маладзечанскі р-н), удзельнік паўстання 1863–1864 гг., заолаг, батанік, палеантолаг, мінералог, фальклaрыст.

**1847** Памёр **Станіслаў Юндзіл**, прыродазнавец, даследчык расліннага і жывёльнага свету Беларусі. Пахаваны ў в. Нача (цяпер Воранаўскі р-н).

**1887** Нарадзіўся **Анатоль Дзяркач** (сапр. **Анатоль Зіміёнка**; мяст. Турэц, цяпер Карэліцкі р-н), паэт, сатырык.

**1891** Нарадзіўся **Лявон Гмырак** (сапр. **Мечыслаў Бабровіч**; фальв. Пархвенава, цяпер Параф'янава Докшыцкага р-на), крытык, публіцыст, празаік.

**1898** Нарадзіўся **Антук Крыніца** (сапр. **Антон Ждановіч**; Мінск), акцёр.

**1903** Нарадзіўся **Платон Галавач** (в. Пабокавічы, цяпер Бабруйскі р-н), пісьменнік, грамадскі дзеяч.

**1909** Нарадзіўся **Лазар Ран** (г. Дзвінск, цяпер г. Даўгаўпілс, Латвія), мастак.

**1952** За адну ноч з Заходняй Беларусі на ўсход СССР вывезлі 1683 сям'і, што былі абвінавачаны ў "варожай дзейнасці супраць калгасаў".

**1981** Памёр **Баляслаў Слосканс**, рэлігійна-грамадскі дзеяч, Апостальскі візітатар для беларусаў-каталікоў, вязень савецкіх канцлагераў.

**1987** Памёр **Якуб Ермаловіч**, пісьменнік. Пахаваны ў в. Вяшэўка Бярэзінскага р-на.

**1990** Заснавана Гродзенская абласная краязнаўчая асацыяцыя.

## 19 красавіка

**1881** Нарадзіўся **Усевалад Ігнатоўскі** (в. Такары, цяпер Камянецкі р-н), гісторык, першы прэзідэнт Беларускай Акадэміі навук.

**1907** Нарадзіўся **Рыгор Акулевіч** (в. Вялікая Кракотка, цяпер Слонімскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, выдавец, публіцыст, актывіст Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады і Таварыства

Беларускай Школы, дзеяч эміграцыі ў Канадзе (Федэрацыя рускіх канадцаў).

## 20 красавіка

**1758** Нарадзіўся **Язафат Булгак** (Слонімскі пав.), уніяцкі мітрапаліт, базыльянін.

**1834** Нарадзіўся **Іосіф Жылінскі** (Віленшчына), даследчык Палесся, геадэзіст. Памёр у 1916 г.

**1910** Памёр **Сяргей Палуян**, публіцыст, празаік, літаратуразнавец, крытык. Пахаваны на Байкаўскіх могілках у Кіеве.

**1986** У Мінску на Траецкім прадмесці святкавалася Гуканне Вясны. На моладзь напалі ўдзельнікі аўганскай вайны, накіраваныя камсамолам і КДБ.

## 21 красавіка

**1833** Нарадзіўся **Віктар Каліноўскі** (в. Мастаўляны, цяпер Беластоцкі пав. Падляскага ваяв., Польшча), гісторык, археограф, адзін з ідэолагаў паўстання 1863–1864 гг.

**1835** Нарадзіўся **Ялегі Пранціш Вуль** (сапр. **Элегі Карафа-Корбут**; г. Віцебск), паэт, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Памёр у Варшаве (1880-я).

**1919** Польскія войскі занялі Вільню.

## 22 красавіка

**1787** Памёр **Станіслаў Радзівіл**, дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага княства Літоўскага.

**1863** Каля мяст. Азёры (цяпер Гродзенскі р-н) адбыўся бой паміж паўстанцкім атрадам **Аляксандра Лянкевіча** і расійскім войскам.

**1954** У Рызе памёр **Сяргей Сахараў**, культурны дзеяч, фалькларыст, этнограф, педагог.

**1994** У Мінску пачалася першая сустрэча беларускай моладзі свету (доўжылася два дні, 200 дэлегатаў з краін былога СССР і Польшчы).

**2005** У Лондане (Антарыё, Канада) памёр **Барыс Рагуля**, палітычны і вайсковы дзеяч, сябар ЦК Беларускай Незалежніцкай Партыі, дзеяч беларускай эміграцыі ў Нямеччыне, Бельгіі і Канадзе.

## 23 красавіка

**1657** Памёр **Сільвестар Косаў**, праваслаўны царкоўна-грамадскі дзеяч, пісьменнік, публіцыст. Нарадзіўся ў маёнт. Жаробычы, цяпер Шумілінскі р-н (канец XVI ст.).

**1794** Паўстанцы **Якуба Ясінскага** перамаглі ў Вільні (утрымоўвалі горад да 12 жніўня).

**1886** Нарадзіўся **Змітрок Бядуля** (сапр. **Самуіл Плаўнік**; мяст. Пасадзец, цяпер Лагойскі р-н), пісьменнік, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху.

**1923** Памёр **Ігнат Канчэўскі** (псеўд. **Ігнат Абдзіраловіч**), паэт, філосаф, публіцыст. Пахаваны ў Вільні. Нарадзіўся ў Вільні (травень 1896).

**1923** Нарадзіўся **Мікалай Рулінскі**, афіцэр Беларускай Краёвай Абароны, грамадскі дзеяч у Вільні.

**1991** У Штутгарце (Нямеччына) памёр **Дзмітрый Касмовіч**, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху і эміграцыі ў Бельгіі і Нямеччыне.

## 24 красавіка

Міжнародны дзень салідарнасці моладзі

**1347** Павешаны **Іаан**, адзін з трох віленскіх пакутнікаў.

**1784** Памёр **Францішак Багамолец**, польскі драматург, публіцыст, выдавец, ураджэнец Віцебшчыны.

**1794** Вільня вызвалена ад расійцаў, абвешчана Найвышэйшая літоўская рада — часовы ўрад Вялікага княства Літоўскага.

**1889** Нарадзіўся **Юры Сабалеўскі** (г. Стоўбцы), палітычны дзеяч, пасол польскага сейма, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1924** У Вільні памёр **Міхаіл Пліс**, грамадскі дзеяч, праваслаўны святар.

**1959** У Лідзе адкрыўся краязнаўчы музей.

**1995** Памёр **Міхась Зуй**, грамадска-палітычны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Аўстраліі, прэзідэнт Беларускай Цэнтральнай Рады (1987–1995). Пахаваны на беларуска-ўкраінскай секцыі могілак Роквуд у Сіднеі (Аўстралія).

**2006** У Нью-Йорку памерла **Вера Бартуль** (дзяв. **Касцюкевіч**), дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі і ЗША. Пахавана на беларускіх могілках у Іст-Брансвік (Нью-Джэрсі, ЗША).

## 25 красавіка

**1904** У Варшаве памёр **Францішак Далеўскі**, адзін са стваральнікаў Братняга саюза літоўскай моладзі, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Нарадзіўся ў фальв. Руднікі Лідскага пав. (1825).

**1946** У Рэгенсбургу (Баварыя, Нямеччына) адбыліся асвячэнне і першая багаслужба ў беларускай праваслаўнай царкве.

**1999** У Гродне прайшло шэсце патрыётаў з паходнямі, якое скончылася жорсткай сутычкай з міліцыянерамі на вуліцы Ажэшкі.

**2003** Па дарозе ў Беларусь памёр **Янка Жамойцін**, грамадскі дзеяч, публіцыст, дзеяч эміграцыі ў Польшчы. Пахаваны ў Варшаве.

**2004** Адбыўся Другі Усебеларускі сход інтэлігенцыі, які выказаўся за актыўны ўдзел у парламенцкіх выбарах.

## 26 красавіка

Дзень памяці ахвяраў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (1986)

**1589** У Магілёве створана праваслаўнае брацтва — адно з першых у Беларусі.

**1835** Памёр **Анёл Доўгірд**, філосаф, логік, педагог.

**1862** У Вільні пасля сібірскай катаргі памёр **Аляксандр Далеўскі**, адзін са стваральнікаў Братняга саюза літоўскай моладзі, удзельнік вызваленчага руху.

**1883** У Варшаве памёр **Напалеон Орда**, піяніст, кампазітар, мастак, удзельнік паўстання 1830–1831 гг.

**1964** У Маладзечне адкрыўся Мінскі абласны краязнаўчы музей (заснаваны 8 ліпеня 1959 г.).

**1996** Прайшоў 50-тысячны "Чарнобыльскі шлях", падчас якога адбыліся жорсткія сутычкі дэманстрантаў з АМОНам.

## 27 красавіка

**1613** У Жыровічах заснаваны уніяцкі кляштар.

**1878** Нарадзіўся **Станіслаў Любіч-Маеўскі**, грамадска-культурны дзеяч, педагог. Расстраляны фашыстамі ў снежні 1941 г.

**1917** У Варшаве памёр **Лазар Заменгоф**, лекар, вынаходнік мовы эсперанта, які нарадзіўся ў Беластоку і пэўны час жыў у Гродне.

**1919** Польскія войскі занялі Гродна, дзе знаходзіўся Урад Беларускай Народнай Рэспублікі і беларускае войска.

**1922** Нарадзілася **Яўгенія Шастак**, грамадскі дзеяч, лекар, вязень ГУЛАГу.

**1945** Беларусь прынята ў склад сяброў-заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН).

**1947** Памёр **Валянцін Таўлай**, паэт, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху. Пахаваны на Вайсковых могілках у Мінску.

**2006** У Нямеччыне памёр **Міхаіл Вітушка**, генерал, адзін з лідэраў Беларускай Незалежніцкай Партыі, кіраўнік беларускага супраціўлення ў другой палове 1940–1950-х гг.

## 28 красавіка

**1794** Жыхары Гародні далучыліся да паўстання **Тадэвуша Касцюшкі**.

**1883** У Маскве скончыў жыццё самагубствам **Уладзімір Кавалеўскі**, прыродазнавец, заснавальнік эвалюцыйнай палеанталогіі, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1900** У Кушлянах (цяпер Смаргонскі р-н) памёр **Францішак Багушэвіч**, паэт, празаік, публіцыст, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Пахаваны ў Жупранах (цяпер Ашмянскі р-н).

**1911** Нарадзіўся **Васіль Каляда**, актывіст Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі, настаўнік, у 1959–1969 гг — дырэктар Дома-музея **Адама Міцкевіча** ў Навагрудку.

**1918** Народны Сакратарыят Беларусі зацвердзіў беларускую мову ў якасці дзяржаўнай і абавязковай у Беларускай Народнай Рэспубліцы і прыняў пастанову аб адкрыцці ў Мінску універсітэта.

**1919** У Вільні пачала выдавацца газета "Беларуская думка" (выходзіла да 27 ліпеня 1919 г.). Рэдактары **І. Вайцяховіч**, **У. Знамяроўскі**, **Э. Падгайскі**.

**1944** У Іўі памёр **Ільдэфонс Бобіч**, рымска-каталіцкі святар, выдавец. Пахаваны каля івейскага касцёла.

**1945** На фронце пад час штурму г. Гдыня (Польшча) загінуў **Сяргей Крывец**, паэт. Нарадзіўся ў в. Сухінічы, цяпер Мастоўскі р-н (1909).

## 29 красавіка

**1386** Адбылася Мсціслаўская бітва паміж войскамі Вялікага княства Літоўскага і вялікага князя смаленскага **Святаслава Іванавіча**. Князь Святаслаў быў забіты, а ягоныя войскі пацярпелі паражэнне.

**1921** Нарадзіўся **Мікола Ермаловіч** (в. Малыя Навасёлкі, цяпер Дзяржынскі р-н), гісторык, літаратуразнавец.

**1931** Памёр **Яўхім Карскі**, філолаг-славіст, мовазнавец, літаратуразнавец, фальклярыст, этнограф, палеограф, археограф, бібліёграф, педагог, заснавальнік навуковага беларусазнаўства. Пахаваны ў Ленінградзе (Расія).

**1987** Пачалося беларуска-латышскае экалагічнае воднае ралі пратэсту супраць будавання Дзвінскай ГЭС "Дзвіна-Daugava-87" (доўжылася да 3 траўня).

**1990** У Ляймэне (Бадэн-Вюртэнберг, Нямеччына) памёр **Юры Попка**, грамадскі дзеяч, выдавец, пісьменнік, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне.

**2002** Памёр **Ігар Гермянчук**, грамадска-палітычны дзеяч, галоўны рэдактар газетаў "Свабода" (1991–1997), "Навіны" (1998–1999), часопіса "Кур'ер" (2000–2002).

## 30 красавіка

Сусветны дзень пароднёных гарадоў

**1632** Памёр **Жыгімонт III Ваза**, вялікі князь літоўскі і кароль польскі (1587–1632).

**1994** Набыла сілу Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, прынятая 15 сакавіка 1994 г.

**1998** (ці 29 красавіка) У Нью-Йорку памёр **Вітаўт Тумаш**, медык, грамадскі дзеяч, скарыназнаўвец, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахаваны на беларускай частцы могілак ў Іст-Брансвіку (Нью-Джэрсі, ЗША)

**2001** У Мінску ў сваёй кватэры бандытамі-маладзёнамі забіты **Алесь Каралёў**, актывіст нацыянальнага руху. Пахаваны ў в. Старыя Цярэшкавічы Гомельскага р-на.

# ТРАВЕНЬ

## 1 траўня

**1710** Салдаты расійскага цара **Пятра I** узарвалі Полацкі Сафійскі сабор.

**1881** Нарадзіўся **Янка Журба** (сапр. **Івашын**; в. Купніна, цяпер Чашніцкі р-н), паэт, перакладчык.

**1906** Нарадзілася **Аляксандра Бергман** (дзяв. **Кучкоўская**; г. Гродна), дзеяч Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі, даследчыца гісторыі, вязень савецкіх канцлагераў.

**1915** Нарадзіўся **Іван Любачка** (Полаччына), настаўнік, гісторык, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1922** Нарадзіўся **Алесь Салавей** (сапр. **Альфрэд Радзюк**, на эміграцыі **Альберт Кадняк**; в. Крысава, цяпер Дзяржынскі р-н), паэт, дзеяч эміграцыі ў Аўстрыі і Аўстраліі.

**1929** Нарадзіўся **Міхаіл Крыванасаў** (г. Крычаў), кідальнік молата, срэбны прызёр Алімпійскіх гульняў (1956), шматразовы рэкардсмен свету.

**1969** У Гомелі заснаваны ўніверсітэт (ад 1988 г. — Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя **Францыска Скарыны**).

**1986** Памёр **Сцяпан Александровіч**, літаратуразнавец, краязнавец. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

## 2 траўня

**1447** У Вільні вялікі князь літоўскі **Казімір IV Ягелончык** выдаў прывілей, які замацоўваў шырокія правы баяраў.

**1752** У Віцебску ўспыхнуў моцны пажар — згарэлі замак, Дабравешчанская царква, комплекс езуіцкіх будынкаў, гарадская забудова.

**1897** Нарадзіўся **Андрэй Капуцкі** (г. Маладзечна), пісьменнік, публіцыст, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху. Расстраляны верагодна ў 1935 г.

**1920** У Мінску выйшаў першы нумар часопіса "Рунь" (выдаваўся да 4 ліпеня 1920 г.). Рэдактар **Янка Купала**, выдавец **Вацлаў Іваноўскі**.

**1931** Нарадзіўся **Міхась Белы**, дысідэнт, вязень ГУЛАГу.

**1997** У Мінску, трапіўшы пад аўтамабіль, загінуў **Валерый Шаблюк**, гісторык.



Пячатка шляхціча Яна Галаўні з Астрожца

## 3 траўня

Сусветны дзень свабоды друку

**1722** Нарадзіўся **Станіслаў Радзівіл** (мяст. Дзятлава), дзяржаўны і

вайсковы дзеяч Вялікага княства Літоўскага.

**1791** Вялікі сейм Рэчы Паспалітай у Варшаве прыняў новую Канстытуцыю.

**1863** У баі каля в. Азярцы (цяпер Слуцкі р-н) загінуў **Уладзіслаў Машэўскі**, палявы паўстанцкі камандзір.

**1877** Нарадзіўся **Антон Грыневіч** (фальв. Іваноўшчына, цяпер Полацкі р-н), збіральнік музычнага фальклору, выдавец, педагог, кампазітар.

**1892** Нарадзіўся **Аляксандр Валькові́ч** (Мінск?), дзеяч нацыянальнага руху.

## 4 траўня

**1785** Нарадзіўся **Міхаіл Палінскі-Пэлка** (Мінская губ.), педагог, матэматык.

**1799** Нарадзіўся **Фларыян Бохвіц** (мяст. Мір), асветнік, філосаф, пісьменнік.

**1819** Нарадзіўся **Фларыян Міладоўскі** (Мінск), кампазітар, піяніст, педагог.

**1838** Нарадзіўся **Уладзімір Корсак** (Магілёўшчына), удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1863** У баі пад Дубічамі (цяпер Літва) загінуў **Людвік Нарбут**, адзін з кіраўнікоў вызваленчага паўстання 1863–1864 гг.

**1932** Нарадзіўся **Мікола Прашковіч** (в. Гарадзішча, цяпер Бярэзінскі р-н), дысідэнт, літаратуразнавец, перакладчык.

**1975** Заснаваны Мінскі інстытут культуры (адкрыўся 1 верасня 1975 г., ад 1993 г. — Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў).

**1985** (ці 4 красавіка) Памёр **Алесь Вечар**, біяхімік, паэт. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**1991** У Вільні на могілках Росы пастаўлены помнік **Францішку Аляхновічу**.

## 5 траўня

**1819** Нарадзіўся **Станіслаў Манюшка** (фальв. Убель, цяпер Чэрвеньскі р-н), кампазітар, дырыжор, педагог, класік польскай і беларускай оперы, вакальнай лірыкі.

**1831** Нарадзіўся **Уладзіслаў Борзабагаты** (маёнт. Рутка, цяпер Навагрудскі р-н), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг., лекар, мемуарыст.

**1900** Нарадзіўся **Адольф Клімовіч** (в. Клюшчаны, цяпер Астравецкі р-н), грамадскі дзеяч, журналіст, выдавец, вязень савецкіх канцлагераў.

**1910** Нарадзіўся **Апанас Цыхун** (в. Кунцаўшчына, цяпер Гродзенскі р-н), краязнавец, педагог, пісьменнік.

**1968** У Дзятлаве адкрыўся музей народнай славы.

**1978** Адкрыўся Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя **Янкі Купалы**.

## 6 траўня

**1434** Вялікі князь літоўскі **Жыгімонт Кейстутавіч** у Троках выдаў прывілей, які быў скіраваны на з'яднанне вакол яго феадалаў.

**1761** Нарадзіўся **Станіслаў Юндзіл** (в. Ясенцы, цяпер Воранаўскі р-н), прыродазнавец, даследчык раслiннага і жывёльнага свету Беларусі.

**1863** Паўстанцкі атрад **Людвіка Звяждоўскага** захапіў горад Горкі.

**1904** Нарадзіўся **Паўлюк Трус** (в. Нізок, цяпер Уздзенскі р-н), паэт.

**1905** Нарадзіўся **Юрка Гаўрук** (г. Слуцк), перакладчык і паэт, вязень ГУЛАГу.

**1926** Памёр **Казімір Сваяк** (сапр. **Канстанцін Стаповіч**), каталіцкі святар, паэт. Пахаваны на могілках Росы ў Вільні.

**1934** У Празе памёр **Мікалай Вяршынін** (сапр. **Верамей**), грамадска-палітычны дзеяч, консул Беларускай Народнай Рэспублікі ў Чэхаславакіі. Нарадзіўся ў мяст. Налібакі, цяпер Стаўбцоўскі р-н (1878).

**1938** На піярскім касцёле ў Лідзе ўстаноўлена дошка ў гонар **Людвіка Нарбута**.

## 7 траўня

Свята абраза Маці Божай Жыровіцкай

**1794** Выдадзены Паланецкі універсал **Тадэвуша Касцюшкі** — спроба рэфармавання становішча сялян у Рэчы Паспалітай.

**1794** Пад Палянамі (цяпер Ашмянскі р-н) адбылася бітва паміж паўстанцамі і расійскім войскам.

**1868** Нарадзіўся **Раман Скірмунт** (в. Парэчча, цяпер Пінскі р-н), палітычны, грамадскі дзеяч.

## 8 траўня

Сусветны дзень Чырвонага крыжа і Чырвонага паўмесяца

**1551** Памерла **Барбара Радзівіл**, вялікая княгіня літоўская, каралева польская.

**1674** Каралём Рэчы Паспалітай і вялікім князем ВКЛ абраны **Ян Сабескі** (быў ім да 1696 г.).

**1883** Нарадзіўся **Сцяпан Некрашэвіч** (в. Данілаўка, цяпер Светлагорскі р-н), мовазнавец, грамадскі дзеяч.

**1896** Нарадзіўся **Антон Дамброўскі**, грэка-каталіцкі дзеяч, філосаф, тэолаг. Памёр у 1947 г.

**1945** У Берліне падпісаны Акт аб капітуляцыі Нямеччыны — скончылася Другая сусветная вайна ў Еўропе.

**1999** У Сіднеі памёр **Сымон Шаўцоў**, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Аўстраліі, пісьменнік.

**2005** У Мінску памёр **Пятро Драчоў**, мастак-графік.

## 9 траўня

**1866** Нарадзіўся **Леў Бакст** (сапр. **Розенберг Леў**; г. Гродна), парыжскі жывапісец і графік, тэатральны мастак, заканадаўца моды.

**1892** Нарадзіўся **Міхаіл Мялешка** (в. Скары, цяпер Мядзельскі р-н), гісторык, этнограф, пісьменнік, публіцыст. Памёр ссыльным (красавік 1931 ці 1941 г.) у Бірску над Волгай (Расія).

**1953** У Мінску выйшаў першы нумар літаратурнага часопіса "Маладосць".

**1955** Нарадзіўся **Уладзімір Емяльянчык** (в. Вялікія Лукі Баранавіцкага р-на), гісторык, выкладчык, паэт.

**1995** У Мсціслаўлі адкрыўся гісторыка-археалагічны музей (заснаваны ў 1988 г.).

## 10 траўня

**1299** Памёр князь **Даўмонт**.

**1706** Шведскае войска на чале з **Карлам XII** заняло Нясвіж.

**1864** У Магілёве расстраляны **Міхаіл Аскерка**, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Нарадзіўся у Мінску (1836).

**1883** Нарадзіўся **Янка Маўр** (сапр. **Фёдараў Іван**; Лібава, цяпер Ліепая, Латвія), пісьменнік, перакладчык, адзін з пачынальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры.

**1905** У Галіцыі памёр **Баляслаў Длускі**, дзеяч вызваленчага руху, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1918** (ці 20 траўня) У в. Прымагілле (цяпер Дзяржынскі р-н) памёр **Карусь Каганец** (сапр. **Казімір Кастравіцкі**), паэт, пісьменнік, перакладчык, мастак, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху. Пахаваны ў в. Навасёлкі (цяпер Дзяржынскі р-н).

**1986** Памёр **Аляксандр Карповіч**, выдавец, актывіст Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі.

**1998** У Гродне памёр **Уладзімір Шурпа**, паэт, журналіст, педагог.

## 11 траўня

**1586** Нарадзілася **Соф'я Алелька-Радзівіл**, асветніца, прылічана да беларускіх праваслаўных святых.

**1953** У Быдгашчы (Польшча) памёр **Гасан Канапацкі**, дзеяч вайсковага і нацыянальнага руху.

**1855** Заснаваны Віленскі музей старажытнасцяў.

**1989** Памёр **Сяргей Гайка**, журналіст, вязень ГУЛАГу. Нарадзіўся ў 1912 г.

**1994** У Тураве ўстаноўлены помнік **Кірылу Тураўскаму**.

## 12 траўня

**1775** У Гродне заснавана Вышэйшая медыцынская акадэмія.

**1833** Нарадзіўся **Бенедыкт Дыбоўскі** (маёнт. Адамарын, цяпер Маладзечанскі р-н), заолаг, прыродазнавец, лекар, публіцыст, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1842** Памёр **Валенці Ваньковіч**, мастак. Пахаваны на могілках Манмартр у Парыжы.

**1863** Каб пазбегнуць палону, застрэліўся **Баляслаў Кульчыцкі**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863г.

**1954** Беларуская ССР прынята ў ЮНЕСКА — Арганізацыю Аб'яднаных Нацый па пытаннях асветы, навукі і культуры.

## 13 траўня

Свята Гродзенскай грэка-каталіцкай парафіі З'яўлення Маці Божай у Фаціме

**1622** Памёр **Іван Мялешка**, дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага княства Літоўскага. Нарадзіўся каля 1522 г.

**1840** Нарадзіўся **Цітус Далеўскі** (фальв. Кункулка, цяпер Лідскі пав.), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1870** Нарадзіўся **Аляксандр Турчыновіч** (маёнт. Ізабелін, цяпер Навагрудскі р-н), гісторык, краязнавец, педагог. Прапаў без вестак пасля 1917 г.

**1879** Нарадзіўся **Янка Серада** (в. Задзвеі, цяпер Баранавіцкі р-н), дзеяч нацыянальнага руху, старшыня прэзідыума Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. Прапаў без вестак пасля 19 лістапада 1943 г.

**1875** Нарадзіўся **Станіслаў Жукоўскі** (маёнт. Ендрыхаўцы, цяпер Ваўкавыскі р-н), беларускі і польскі мастак. Загінуў у гітлераўскім канцлагеры Прушкаў (жнівень 1944 г.).

**1895** Нарадзіўся **Уладзіслаў Паўлюкоўскі** (в. Ініца, цяпер Стаўбцоўскі р-н), паэт, празаік, этнограф, мастак, вязень савецкіх канцлагераў.

**1905** Нарадзілася **Стэфанія Станюта** (Мінск), актрыса.

**1921** Нарадзіўся **Аркадзь Качан** (в. Барсукі, цяпер Докшыцкі р-н), дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

**1922** Нарадзіўся **Леанід Кароль**, грамадскі дзеяч у Вільні.

**2000** Малады Фронт правёў у гарадах Беларусі грамадскую акцыю “Горад наш!”.

## 14 траўня

**1613** Мястэчка Жыровічы атрымала магдэбургскае права.

**1899** Нарадзіўся **Тодар Куніцкі** (Повязынь, цяпер Маладзечанскі р-н), лекар, адзін з заснавальнікаў Беларускага Студэнцкага Саюза ў Вільні і Беларускага Сялянскага Саюза.

**1939** У савецкім канцлагеры ў пасёлку Княж-Пагост (Комі АССР, цяпер Рэспубліка Комі, Расія) памёр **Па-**

**вел Жаўрыд**, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, адзін з кіраўнікоў Слуцкага паўстання.

**1995** У Беларусі адбыўся антыканстытуцыйны рэферэндум, які змяніў дзяржаўную сімволіку, надаў расійскай мове статус дзяржаўнай, зрабіў змены ў Канстытуцыі, надаўшы права прэзідэнту распускаць парламент, адобрыў пра эканамічную інтэграцыю з Расіяй.

**1996** У Мінску адбылася 5-тысячная дэманстрацыя супраць трымання пад арыштам удзельнікаў "Чарнобыльскага шляху".

## 15 траўня

**1845** Нарадзіўся **Іван Чэрскі** (фальв. Свольна, цяпер Верхнядзвінскі р-н), удзельнік паўстання 1863–1864 гг., геолаг, географ, даследчык Сібіры.

**1882** Нарадзіўся **Уладзіслаў Галубок** (станцыя Лясная, цяпер Баранавіцкі р-н), пісьменнік, рэжысёр, акцёр, тэатральны дзеяч, мастак.

**1909** Нарадзіўся **Язэп Найдзюк** (в. Бойдаты, цяпер Ваўкавыскі р-н), дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, выдавец, гісторык. Аўтар кнігі "Беларусь учора і сёння".

**1912** Нарадзіўся **Анатоль Іверс** (сапр. **Іван Міско**; в. Чамяры, цяпер Слонімскі р-н), паэт.

**1936** Нарадзіўся **Барыс Сачанка** (в. Вялікі Бор Хойніцкага р-на), пісьменнік, публіцыст.

**1944** Нарадзіўся **Антон Сцяпура** (в. Занюкі Шчучынскага р-на), дзеяч нацыянальнага руху ў Гродне, сябар Беларускага Народнага Фронту.

**1950** У Тураве адкрыўся краязнаўчы музей (заснаваны 2 снежня 1949 г.).

**1971** У Лондане адкрылася Беларуская бібліятэка і музей імя **Францыска Скарыны**.

**1979** У Мінску адкрыўся Музей старажытнабеларускай культуры (заснаваны 7 ліпеня 1977 г.).

**1993** У Гомелі створаны Музей-лабараторыя **Францыска Скарыны**.

## 16 траўня

**1657** У Янаве Палескім (цяпер Іванава, Берасцейскай вобл.) казакамі забіты **Андрэй Баболя**, рымска-каталіцкі дзеяч, місіянер, пазней прызнаны святым і кананізаваны. Пахаваны ў Пінску.

**1686** Паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй заключаны "вечны мір".

**1739** Памёр **Антоні Казімір Сапега**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага.

**1762** Нарадзіўся **Юзаф Копаць**, адзін з камандзіраў паўстання 1794 г., мемуарыст. Памёр у 1827 г.

**1911** Нарадзіўся **Васіль Вітка** (сапр. **Цімох Крысько**; в. Еўлічы, цяпер Слуцкі р-н), літаратар, дзіцячы пісьменнік.

**1916** Памёр **Валяр'ян Вільчэўскі**, лекар, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. у атрадзе **Францішка Юндзіла** (Слонімскі пав.).

**1921** Нарадзіўся **Міхась Мельнікаў** (г. Крычаў), краязнавец, вязень ГУЛАГу.

**1986** У Гродне адкрыўся Дом-музей **Максіма Багдановіча**.

**1996** У Вільні ўстаноўлена памятная дошка **Пётру Сергіевічу**.

**1999** У Таронта памёр **Міхась Ганько**, палітычны і грамадска-культурны дзеяч эміграцыі ў Аўстрыі і Канадзе.

## 17 траўня

**1845** Нарадзіўся **Мікалай Нікіфароўскі** (в. Вымна, цяпер Віцебскі р-н), этнограф і фалькларыст.

**1931** У Маскоўскай турме памёр мітрапаліт **Мелхіседэк** (**Міхаіл Паеўскі**), праваслаўны царкоўны дзеяч. Нарадзіўся ў в. Вітулін, цяпер Бельскі пав. Люблінскага ваяв., Польшча (верасень 1878 г.).

**1934** Расстраляны **Алесь Салагуб**, паэт, публіцыст.

**1960** У Мінску ў новым будынку пачаў працаваць музей **Янкі Купалы**.

## 18 траўня

Міжнародны дзень музеяў

**1910** Памерла **Эліза Ажэшка**, польска-беларуская пісьменніца, удзельніца паўстання 1863–1864 гг. Ад 1869 г. жыла ў Гродне, дзе і пахавана.

**1924** У Вільні выйшла газета "Сын беларуса" (выдавалася да 19 верасня 1924 г.), рэдактар **Мікола Шыла**.

**1906** У Пецярбургу заснавана беларуская выдавецкая суполка "Загляне сонца і ў наша аконца".

**1929** Нарадзіўся **Алег Табола** (в. Завазёрцы, цяпер Шаркоўшчынскі р-н), удзельнік маладзёжнага антысавецкага падполля ў Глыбокім, вязень ГУЛАГу.

## 19 траўня

Свята Слонімскай грэка-каталіцкай парафіі Святой Тройцы

**1780** Нарадзіўся **Людвік Міхаіл Пац**, вайсковы дзеяч, удзельнік паўстання 1830–1831 гг.

**1792** Каля Міра адбылася бітва беларуска-літоўскіх харугваў з расійскімі войскамі.

**1896** Памёр **Ян Козел**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Нарадзіўся ў маёнт. Сэрвач, цяпер Вілейскі р-н (1837).

**1934** Расстраляны **Міхаіл Кахановіч**, грамадска-палітычны дзеяч, педагог. Нарадзіўся ў Вялікіх Луках каля Баранавічаў (верасень 1882 г.).

## 20 траўня

**1299** Памёр **Даўмонт**, князь нальшчанскі і пскоўскі.

**1902** Нарадзіўся **Язэп Пушча** (сапр. **Плашчынскі Язэп**; в. Каралішчавічы, цяпер Мінскі р-н), паэт.

**1907** Нарадзілася сястра супольнасці Сясцёр ад Анёлаў **Ванда Банішэўская** (в. Новая Каменка, цяпер Навагрудскі р-н), носьбітка стыгматаў, вязень ГУЛАГу.

**1936** Нарадзіўся **Алег Караваеў** (Мінск), барэц грэка-рымскага стылю, алімпійскі чэмпіён (1960).

**1961** У Варшаве памёр **Язэп Гапановіч**, нацыянальны дзеяч, прадпрымальнік.

**1965** Памёр **Антон Жэбрак**, генетык, селекцыянер, грамадскі дзеяч.

**1994** У Жыровічах адсвяткаваны 500-я ўгодкі з часу з'яўлення Жыровіцкай Божай Маці і 520-я ўгодкі з часу заснавання манастыра.

**2006** Памёр **Уладзімір Плешчанка**, грамадскі дзеяч, старшыня Віцебскай абласной рады Кансерватыўна-Хрысціянскай Партыі Беларускі Народны Фронт. Пахаваны ў в. Вароны Віцебскага р-на.

## 21 траўня

**1688** Нарадзіўся **Мікалай Фаўстын Радзівіл**, дзяржаўны і вайскоўы дзеяч Вялікага княства Літоўскага.

**1797** Нарадзіўся **Дамінік Стафановіч**, музыкант, педагог, дырыжор. Памёр каля 1870 г.

**1841** Памёр **Юльян Нямцэвіч**, польскі пісьменнік, палітычны дзеяч, гісторык, удзельнік паўстання 1794 г.

**1898** Нарадзіўся **Кастусь Кіслы** (Леньцы, цяпер Беластоцкі пав. Падляскга ваяв., Польшча), музыкант, кампазітар, дырыжор, дзеяч эміграцыі ў Бельгіі і ЗША.

**1921** Нарадзіўся **Андрэй Сахараў** (Масква), вучоны, дысідэнт, змагар за правы чалавека ў СССР.

**1923** Нарадзіўся **Міхась Капцiловіч** (в. Равяцічы, цяпер Навагрудскі р-н), удзельнік Саюза Вызвалення Беларусі, вязень савецкіх канцлагераў.

**1983** Памёр мітрапаліт **Андрэй** (**Аляксандр Крыт**), рэлігійны і грамадскі дзеяч, педагог, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Вялікабрытаніі і ЗША. Пахаваны на беларускіх могілках у Гайленд-Парку (Нью-Йорк, ЗША).

## 22 траўня

**1762** Памёр **Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, мецэнат.

**1792** Ашмяны атрымалі герб.

**1863** У Вільні за падтрымку паўстанцаў расстраляны ксёндз **Станіслаў Ішора**.

**1863** Адбыўся пераможны бой паўстанцкіх атрадаў з расійскімі карнікамі ля вёскі Кадыш (цяпер Гродзенскі р-н).

**1899** Нарадзіўся **Мікола Чарнецкі** (в. Малыя Азяранкі, цяпер Ваўкавыскі р-н), публіцыст, педагог, грамадскі дзеяч.

**1900** Нарадзіўся **Мікалай Каспяровіч** (в. Ізабалёва, цяпер Пухавіцкі р-н), краязнавец, мастацтвазнавец, літаратуразнавец.

**2004** У Вільні ўстаноўлена памятная дошка **Наталлі Арсенневай**.

## 23 траўня

**1173** (ці 25 траўня) У Ерусаліме памерла **Ефрасіння Полацкая**, полацкая князёўна, беларуская святая. У 1187 г. яе мошчы былі перанесены ў Кіева-Пячорскую лаўру, а ў пачатку XX ст. — у Полацк. Нарадзілася ў Полацку каля 1100 г.

**1753** Памерла **Францішка Уршуля Радзівіл**, пісьменніца, драматург.

**1888** Нарадзіўся **Караль Румель** (г. Гродна), коннік-спартсмен, першы алімпіец з Беларусі (на Алімпійскіх гульнях 1912 г. у Стакгольме).

**1923** Нарадзіўся **Міхась Ганько** (в. Калядзіна Маладзечанскага пав.), палітычны і грамадска-культурны дзеяч эміграцыі ў Аўстрыі і Канадзе.

**1946** У мінскай турме НКУС памёр **Кастусь Езавітаў**, дзеяч нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння, публіцыст, перакладчык, педагог, гісторык.

**1967** У Чыкага (ЗША) памёр **Мікола Дзямідаў**, вайсковы і грамадска-палітычны дзеяч.

**1973** Памёр **Мікалай Каранеўскі**, інжынер, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі. Пахаваны на беларуска-ўкраінскай частцы могілак Роквуд у Сіднеі (Аўстралія).

**1980** У Гродне памёр **Мікалай Марцінчык**, грамадска-культурны дзеяч, лекар, вязень савецкіх канцлагераў.

**1992** У Гданьску (Польшча) адбыўся ўстаноўчы сход Беларускага культурнага таварыства "Хатка".

## 24 траўня

Дзень славянскай пісьменнасці

**1377** Памёр вялікі князь літоўскі **Альгерд**.

**1863** У Вільні, за чытанне ў Ваверскім касцёле (цяпер Лідскі р-н) маніфеста паўстання, расстраляны ксёндз **Раймунд Зямацкі**.

**1904** Нарадзіўся **Адам Русак** (в. Пясочнае, цяпер Капыльскі р-н), паэт-песеннік.

**1930** Нарадзілася **Галіна Русак** (дзяўоч. **Родзька**; г. Навагрудак), мастачка. Дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1963** Нарадзіўся **Зміцер Кісель** (г. Гродна), грамадскі дзеяч на Гродзеншчыне, журналіст.

**1996** У Гродне пачаўся Першы фестываль нацыянальных культур (доўжыўся тры дні).

## 25 траўня

**1792** Геранёны (цяпер Іўеўскі р-н) атрымалі герб.

**1868** Нарадзіўся **Давід Яноўскі** (г. Ваўкавыск), адзін з мацнейшых шахматыстаў свету канца XIX – пачатку XX ст., які з 23 гадоў жыў у Францыі.

**1905** Нарадзіўся **Сяргей Хмара** (сапр. **Сіняк**; мяст. Казлоўшчына, цяпер Дзятлаўскі р-н), грамадскі дзеяч, пісьменнік, паэт, журналіст, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Канадзе.

**1907** У Вільні адбыўся з'езд настаўнікаў, на якім створаны Беларускі настаўніцкі саюз.

**1917** Памёр **Максім Багдановіч**, паэт, перакладчык, крытык. Пахаваны на старых гарадскіх могілках у Ялце (цяпер Украіна).

**1937** Нарадзіўся **Сяргей Сідар** (в. Янаўшчына, цяпер Зэльвенскі р-н), географ, педагог.

**1942** У турэмным шпіталі ў Горкім (цяпер Ніжні Ноўгарад, Расія) пасля зняволення ў канцлагеры ў Комі АССР памёр **Іван Замоцін**, беларускі і расійскі літаратуразнавец, паэт.

**1968** Памёр генерал **Франц[ішак] Кушаль**, вайсковец, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1987** У Кліўлендзе (ЗША) памёр **Яўген Калубовіч** (на эміграцыі **Каханоўскі**), гісторык, грамадска-палітычны дзеяч, літаратуразнавец, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

## 26 траўня

**1863** У баі ля в. Парэчча (цяпер Талачынскі р-н) загінуў **Генрык Дмахоўскі**, скульптар, удзельнік паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг.

**1909** Нарадзіўся **Чеслаў Ханяўка** (г. Рыга), грамадскі дзеяч, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1926** Заснавана Беларускае літаратурна-мастацкае згуртаванне "Узвышша" (дзейнічала да снежня 1931 г.).

**1976** У Мінску ўстаноўлены мемарыяльны знак у гонар **Тараса Шаўчэнкі**.

**1977** Памёр **Янка Пачопка**, паэт, фальклярыст. Пахаваны ў в. Маліваўка Глыбоцкага р-на.

**1999** Памерла **Лідзія Ялоўчык** (у замужжы **Лісок**), пісьменніца, паэтэса, педагог.

## 27 траўня

**1835** Нарадзіўся **Антон Трусаў** (г. Барысаў), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Памёр каля 1886 г.

**1871** У Францыі версальцамі расстраляны **Канстанцін Далеўскі**, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Нарадзіўся ў фальв. Кункулка Лідскага пав. (1837).

**1900** Нарадзіўся **Уладзімір Жылка** (в. Макашы, цяпер Нясвіжскі р-н), паэт, перакладчык, публіцыст.

**1991** У Мінску створана Міжнародная асацыяцыя беларусістаў (25–27 траўня адбыўся кангрэс беларусістаў).

**1992** Створана Беларускае інфармацыйнае агенцтва (БЕЛІНФАРМ) — дзяржаўны інфармацыйны орган.

## 28 траўня

**1836** Нарадзіўся **Ян Карловіч** (в. Субартоніс, цяпер Варэнскі пав., Літва), лінгвіст, этнограф, фальклрыст, музыказнавец.

**1863** У баі каля в. Уладыкі (цяпер Вілейскі р-н) забіты **Вікенці Козел**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Пахаваны ў брацкай магіле (каля 70 чалавек), паводле некаторых звестак, пазней перапахаваны на радзіме ў Сэрвачы (цяпер Вілейскі р-н). Нарадзіўся ў 1838 г.

**1905** Першая публікацыя **Янкі Купалы** (верш “Мужык” у газеце “Северо-Западный край”).

**1918** Нарадзіўся **Канстанцін Маскалік** (мяст. Гарадзея, цяпер Нясвіжскі р-н), грэка-каталіцкі святар, супрацоўнік Беларускай секцыі Ватыканскага радыё.

## 29 траўня

**1565** Памёр **Мікалай Радзівіл Чорны**, палітычны, культурны і рэлігійны дзеяч Вялікага княства Літоўскага.

**1861** Памёр **Яўхім Лялевель**, гісторык, вучоны, грамадскі дзеяч, ідэолаг паўстання 1830–1831 гг.

**1920** Савецкімі ўладамі расстраляны **Фабіян Шантыр**, грамадска-дзяржаўны дзеяч, публіцыст, пісьменнік, перакладчык.

**1933** Нарадзіўся **Мікола Гайдук** (в. Кабылянка, цяпер Беластоцкі пав. Падляскга ваяв., Польшча), пісьменнік, публіцыст.

**1970** У Парыжы памёр **Мікола Абрамчык**, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Францыі, прэзідэнт Беларускай Народнай Рэспублікі (1947–1970).

**1986** У Мінску заснаваны клуб перакладчыкаў “Бабілён” — незалежны інтэлектуальны асяродак (дзейнічаў да 1989 г.).

**1993** У Мінску пачаўся III з’езд Беларускага Народнага Фронту (доўжыўся тры дні), створана партыя Беларускі Народны Фронт “Адраджэнне”.

## 30 траўня

**1826** Нарадзіўся **Зыгмунт Серакоўскі** (в. Лісавое, цяпер Маневіцкі р-н Валынскай вобл., Украіна), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1829** Памёр **Францішак Сапега**, удзельнік паўстання 1794 г.

**1999** Трагедыя на "Нямізе", у выніку якой у падземным пераходзе станцыі мінскага метрапалітэна "Няміга" загінулі 53 чалавекі, пераважна дзяўчаты і юнакі.

## 31 траўня

**1800** У Варшаве памёр **Міхал Казімір Агінскі**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага. Нарадзіўся ў 1728 або 1730 г.

**1924** У Познані памёр **Канстанцін Горскі**, кампазітар, музыкант-скрыпач.

**1952** Нарадзілася **Тамара Чабан** (в. Чабаны Глыбоцкага р-на), літаратуразнавец.

**1992** У Нью-Джэрсі памёр **Васіль Стома**, пісьменнік, грамадскі дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1979** У Амстэрдаме (Нью-Йорк) памёр **Францішак Чарняўскі**, каталіцкі святар, рэлігійна-асветны публіцыст, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Францыі, Бельгіі і ЗША.

**1996** У Іркуцку (Расія) створана Таварыства беларускай культуры імя **Івана Чэрскага**.

# ЧЭРВЕНЬ

## 1 чэрвеня

Міжнародны дзень абароны дзяцей

**1434** Памёр вялікі князь і кароль **Ягайла** (нарадзіўся каля 1348 г.).

**1836** Закладзены першы камень Берасцейскай крэпасці.

**1893** У Варшаве памёр **Аляксандр Валіцкі**, выдавец, музычны крытык, спявак, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1911** Нарадзіўся **Якуб Міско** (в. Чамяры, цяпер Слонімскі р-н), пісьменнік, журналіст.

**1911** Нарадзіўся **Анатоль Марцінкевіч** (г. Гродна), адзін з пачынальнікаў беларускага баскетбола.

**1916** Нарадзіўся **Мікола Гваздоў** (г. Полацк), паэт. Загінуў у савецкім канцлагеры пад Варкутой каля 1937 г.

**1916** У Вільні створаны Беларускі клуб.

**1954** Нарадзіўся **Алесь Асташонак** (Мінск), пісьменнік, перакладчык.

**1970** Памёр **Тадэвуш Іваноўскі** (**Тадас Іванаускас**), беларускі і літоўскі заолаг, педагог.



Пячатка графа Юрыя Іллініча, уладальніка Міра і Мірскага замка

## 2 чэрвеня

**1806** Нарадзіўся **Аляксандр Валадковіч** (каля мяст. Радашковічы, цяпер Маладзечанскі р-н), адзін з кіраўнікоў паўстання 1830–1831 гг.

**1863** У Мінску расстраляны **Міхаіл Цюндзявіцкі**, вайсковец, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Нарадзіўся ў Барысаўскім пав. (1836).

**1869** Нарадзіўся **Канстанцін Валасовіч** (в. Старчыцы, цяпер в. Акцябар, Салігорскага р-на), падарожнік, натураліст, геолаг, географ, хімік.

**1875** У Нясвіжы заснавана настаўніцкая семінарыя.

**1917** Нарадзіўся **Міхаіл Мацукевіч** (у манастве **Мікалай**; хутар Суяцін, Самарская губ., Расія), рэлігійны дзеяч, архіепіскап Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы.

## 3 чэрвеня

**1786** Нарадзіўся **Канстанцін Тызенгаўз** (мяст. Жалудок, цяпер Шчучынскі р-н), асветнік, прыродазнавец.

**1841** Нарадзіўся **Фелікс Клюкоўскі** (маёнт. Шчарбінава, цяпер Ляхавіцкі р-н), удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Памёр ад ран паміж 21 і 25 красавіка 1863 г. у Слуцку.

**1862** Нарадзілася **Баляслава Лямант**, манашка, якая працавала ў Беларусі, а пазней была беатыфікавана.

**1863** Ля вёскі Расолішкі (цяпер Іўеўскі р-н) адбыўся бой паміж паўстанцкім атрадам **Зыгмунта Мінейкі** і расійскім войскам.

**1863** Адбылася бітва пад Мілавідамі (цяпер Баранавіцкі р-н), у якой перамаглі паўстанцы.

**1924** Нарадзіўся **Іван Тарасюк** (в. Глоўсевічы, цяпер Слонімскі р-н), удзельнік патрыятычнага падполля на Слонімшчыне ў 1946–1947 гг.

**1988** У газеце "ЛіМ" надрукаваны артыкул **Зянона Пазняка** і **Яўгена Шмыгалёва** "Курапаты — дарога смерці", які выклікаў шырокі грамадска-палітычны рэзананс.

## 4 чэрвеня

**1847** Памёр **Стафан Грабоўскі**, вайсковы дзеяч, адзін з кіраўнікоў паўстання 1794 г.

**1872** Памёр **Станіслаў Манюшка**, кампазітар, дырыжор, педагог, класік польскай і беларускай оперы, вакальнай лірыкі.

**1948** У Канстанцы (Бадэн-Вюртэнберг, Нямеччына) пачаўся (доўжыўся два дні) Першы сабор Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы на эміграцыі, на якім гэтая царква была адноўлена.

**1952** У Чыкага (ЗША) памёр **Язэп Варонка**, палітычны дзеяч, журналіст, публіцыст, дзеяч эміграцыі ў ЗША, першы прэм'ер-міністр Беларускай Народнай Рэспублікі (1918).

**1984** У Асунсьёне (Парагвай) памёр **Язэп Пігулеўскі**, удзельнік беларускага нацыянальнага партызанскага руху на Палессі падчас Другой сусветнай вайны, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Бразіліі і Парагваі. Нарадзіўся на Століншчыне ў 1912 г.

**1984** Памёр **Іван Хомчык**, удзельнік патрыятычнага падполля на Слонімшчыне ў 1946–1947 гг. Пахаваны ў в. Глоўсевічы Слонімскага р-на.

**1986** У Маскве памерла **Канстанцыя Буйло** (у замужжы **Калечыц**), паэтэса.

## 5 чэрвеня

Міжнародны дзень аховы навакольнага асяроддзя

**1792** Мястэчка Цырын атрымала герб.

**1863** За ўдзел у паўстанні расстраляны **Альберт Ласковіч**, уладальнік маёнт. Кір'янаўцы (цяпер Лідскі р-н).

**1870** Нарадзіўся **Зыгмунт Лазінскі** (в. Барацін, цяпер Карэліцкі р-н), каталіцкі святар, біскуп.

**1911** Нарадзіўся **Адам Дасюкевіч** (в. Копцевічы, цяпер Смаргонскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, журналіст.

**1919** У Вільні выйшаў першы нумар газеты "Беларускае жыццё". Рэдактар **Францішак Аляхновіч**.

**1923** У Вільні выйшаў першы нумар газеты "Вольны Сцяг", орган Беларускай Рэвалюцыйнай Арганізацыі (выдавалася да 14 кастрычніка 1923 г.), была забаронена польскімі ўладамі.

**1938** У Сібіры ў савецкім канцлагеры расстраляны **Юрка Лістапад**, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, адзін з кіраўнікоў Слуцкага паўстання. Нарадзіўся ў в. Варкавічы (цяпер Слуцкі р-н) у красавіку 1897 г.

**1997** У Мінску ўстаноўлена мемарыяльная дошка на доме, дзе жыў пісьменнік **Барыс Сачанка**.

**2003** Памёр **Уладзімір Емяльянчык**, гісторык, выкладчык, паэт.

## 6 чэрвеня

**1633** Мястэчка Ліпнішкі (цяпер Іўеўскі р-н) атрымала герб.

**1819** У Свіслачы адкрылася гімназія.

**1841** Нарадзілася **Эліза Ажэшка** (дзяв. **Паўлоўская**; маёнт. Мількаўшчына, цяпер Гродзенскі р-н), польскя пісьменніца, удзельніца паўстання 1863–1864 гг.

**1863** (ці 18 чэрвеня) У Магілёве расстраляны **Ільдэфонс Анцыпа**, удзельнік паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг., палявы камандзір. Нарадзіўся ў 1815(?) г.

**1917** У Мінску пачаўся з'езд Беларускага каталіцкага духавенства (доўжыўся два дні).

**1934** У Ленінградзе памёр **Браніслаў Эпімах-Шыпіла**, дзеяч беларускай культуры, выдавец, мовазнавец, літаратуразнавец.

**1962** Заснавана Беларускае таварыства аховы прыроды.

**1982** Памёр **Язэп Малецкі**, грамадскі дзеяч, публіцыст, медык, педагог, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Аўстраліі. Пахаваны на беларуска-украінскай частцы могілак Роквуд у Сіднеі (Аўстралія).

**1989** У Беларусі ўпершыню ўрачыста адсвяткавана Купалле, якое ў гады савецкай улады не святкавалася.

## 7 чэрвеня

**1492** У Гродне памёр **Казімір Ягелончык**, вялікі князь літоўскі (1440–1492).

**1563** **Жыгімонт II Аўгуст** выдаў Віленскі прывілей, які параўняў у правах праваслаўных і каталікоў у Вялікім княстве Літоўскім.

**1825** Нарадзіўся **Эдвард Паўловіч** (мяст. Тургелі, цяпер Літва), мемуарыст, мастак, асветнік, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1880** Нарадзіўся **Вацлаў Іваноўскі** (маёнт. Лябёдка, цяпер Шчучынскі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, адзін са стваральнікаў Беларускай сацыялістычнай Грамады, асветнік, выдавец, міністр асветы

ў Радзе Беларускай Народнай Рэспублікі, бурмістр Мінска (1941–1943).

**1976** Памёр **Міхась Машара**, пісьменнік, удзельнік заходнебеларускага нацыянальнага руху. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

**1995** У Мінску пад бела-чырвона-белымі сцягамі ў прысутнасці 37 тысяч гледачоў нацыянальная футбольная зборная Беларусі ў афіцыйным матчы з лікам 1:0 перамагла Нідэрланды.

**1998** У Бельчыцы (цяпер у межах Полацка) адбылося асвячэнне Памятнага крыжа ахвярам савецкага сталінскага рэжыму.

## 8 чэрвеня

**1881** Нарадзіўся **Віктар Зелязей** (Мінск), удзельнік нацыянальнага руху пачатку XX ст. Памёр пасля 1951 г. у Ратамцы Мінскага р-на.

**1895** Нарадзіўся **Ігнат Дварчанін** (в. Погіры, цяпер Дзятлаўскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, літаратуразнавец, паэт, педагог.

**1920** У Вільні выйшла газета “Незалежная думка” (выдавалася да 11 ліпеня 1920 г.). Рэдактар **Г. Багдановіч**.

**1956** У Лодзі (Польшча) памёр **Юзюк Фарботка**, паэт, грамадска-культурны дзеяч, заолаг.

**1958** У Беластоку заснавана беларускае літаратурнае аб’яднанне “Белавежа”.

**1967** У Мікалаеўшчыне (Стаўбцоўскі р-н) адкрыўся філіял літаратурнага музея **Якуба Коласа**.

## 9 чэрвеня

**1728** Нарадзіўся **Казімір Рагоўскі**, езуіцкі тэолаг, філосаф, педагог.

**1863** У Вільні на Лукіскім пляцы павешаны **Баляслаў Калышка**, адзін з кіраўнікоў паўстання.

**1881** Нарадзіўся **Іван Луцкевіч** (г. Шаўлі, цяпер Шаўляй, Літва), грамадска-палітычны дзеяч, археолаг, этнограф, публіцыст.

**1919** На з’ездзе ўтворана Цэнтральная беларуская рада Віленшчыны і Гарадзеншчыны.

**1929** У Гродне пачаўся так званы працэс 75-ці — суд, арганізаваны польскімі ўладамі над дзеячамі заходнебеларускага нацыянальнага руху (доўжыўся да 21 чэрвеня 1929 г.).

**1970** У Нью-Йорку ў сваёй кватэры невядомымі забіты **Уладзімір Тамашчык** (у манастве **Васіль**), праваслаўны святар, архіепіскап Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

## 10 чэрвеня

**1812** У Полацку адкрыта езуіцкая акадэмія — першая вышэйшая навучальная ўстанова на тэрыторыі сучаснай Беларусі (дзейнічала да 1820 г.).

**1883** Нарадзіўся **Язэп Гапановіч** (мяст. Будслаў, цяпер Мядзельскі р-н), нацыянальны дзеяч, прадпрымальнік.

**1910** У Віцебску памёр **Мікалай Нікіфароўскі**, этнограф і фальклярыст.

**1923** Памёр **Міхал Федароўскі**, фальклярыст, этнограф, археолаг, калекцыянер. Пахаваны на Павонзкаўскіх могілках у Варшаве.

**1982** У Кінгстане (Антарыё, Канада) памёр **Ян Садоўскі**, навуковец, скарыназнавец, грамадскі дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі і Канадзе.

## 11 чэрвеня

**1836** Памёр **Казімір Кантрым**, віленскі публіцыст, рэдактар, бібліятэкар, удзельнік паўстанняў 1794 і 1830–1831 гг. Нарадзіўся ў 1776 г.

**1926** Нарадзіўся **Дзмітрый Сямёнаў** (Мінск), літаратар, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1966** Памёр **Сцяпан Баркоўскі**, удзельнік Слуцкага паўстання, літаратуразнавец, этнограф, вязень ГУЛАГу. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**1978** У Лайле (Ілінойс, ЗША) памёр **Янка Тарасевіч**, грэка-каталіцкі святар, тэолаг, рэлігійны і грамадскі дзеяч эміграцыі ў Канадзе і ЗША.

**1982** Памёр **Рыгор Семашкевіч**, паэт, празаік, літаратуразнавец, крытык. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

## 12 чэрвеня

**1877** Памёр **Мікалай Агароў**, расійскі грамадскі дзеяч, паэт, публіцыст. Падтрымоўваў вызваленчае паўстанне 1863–1864 гг.

**1895** Нарадзіўся **Леапольд Родзевіч** (фальв. Кур'янаўшчына, цяпер Лагойскі р-н), палітычны і грамадскі дзеяч, драматург, публіцыст, паэт. Загінуў пасля 1938 г. у савецкім канцлагеры.

**1911** Нарадзіўся **Мікола Панькоў** (г. Дзвінск, цяпер Даўгаўпілс, Латвія), журналіст, бібліяфіл, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**2000** У Вільні, з удзелам беларускіх грамадскіх дзеячаў і гісторыкаў пачаўся (доўжыўся да 14 чэрвеня) міжнародны кангрэс на тэму "Ацэнка злачынстваў камунізму".

## 13 чэрвеня

**1702** Нарадзіўся **Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, мецэнат.

**1726** Нарадзіўся **Антон Барташэвіч**, асветнік, філосаф, педагог.

**1834** Нарадзіўся **Канстанцін Вераніцын** (в. Астраўляны Віцебскага пав.), літаратар, верагодны аўтар паэмы "Тарас на Парнасе". Памёр у Пецярбургу (1904?).

**1859** Нарадзіўся **Канстанцін Горскі** (г. Ліда), кампазітар, музыкант-скрыпач.

**1889** Нарадзіўся **Павел Жаўрыд** (в. Цецяроўка, цяпер Слуцкі пав.), дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, адзін з кіраўнікоў Слуцкага паўстання.

**1889** Нарадзіўся **Павел Трамповіч** (г. Пскоў, Расія), грамадскі дзеяч, лекар, вязень савецкіх турмаў.

**1943** У в. Васілішкі (цяпер Шчучынскі р-н) польскімі падпольшчыкамі забіты **Юліян Саковіч**, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, актывіст Таварыства Беларускай Школы і Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі, Беларускай народнай самапомачы, сябар ЦК Беларускай Незалежніцкай Партыі.

**1999** У Варшаве Папа **Ян Павел ІІ** абвясціў пра 108 новых благаславёных, мучанікаў ІІ сусветнай вайны. Сярод іх 12 асобаў з Беларусі.

**2006** У Баранавічах памёр **Іван Дутка**, дзеяч нацыянальнага руху, вязень ГУЛАГу.

## 14 чэрвеня

**1634** Падпісана Палянаўская мірная дамова паміж Рэччу Паспалітай і Расійскай дзяржавай.

**1867** Нарадзіўся **Мітрафан Доўнар-Запольскі** (г. Рэчыца), гісторык, эканаміст, этнограф, адзін з заснавальнікаў нацыянальнай гістарыяграфіі.

**1877** Нарадзіўся **Мікалай Багародскі** (сяло Барыса-Глеб Бежацкага пав. Цвярской губ., Расія), гісторык, краязнавец.

**1896** Нарадзіўся **Пётр Татарыновіч** (в. Гайнін, цяпер Ляхавіцкі р-н), святар, грамадска-культурны дзеяч, літаратар, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Італіі і Ватыкане.

**1900** Нарадзіўся **Міхась Забэйда-Суміцкі** (в. Несцяровічы, цяпер Свіслацкі р-н), спявак, педагог, дзеяч эміграцыі ў Чэхіі.

**1903** Памёр **Ян Карловіч**, лінгвіст, этнограф, фальклярыст, музыказнавец.

**1912(?)** Нарадзіўся **Анатоль Сумны** (сапр. **Кунцэвіч**; Беласточчына), паэт, святар, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

**1997** У Карэлічах прайшлі міжнародныя чытанні, прысвечаныя **Ігнату Дамейку**. У Медзьвядцы заснаваны музей Дамейкі.

## 15 чэрвеня

**1896** Нарадзіўся **Павел Каравайчык** (мяст. Любча, цяпер Навагрудскі р-н), культурны дзеяч, пісьменнік.

**1902** Нарадзіўся **Янка Бабровіч** (в. Параф'янава, цяпер Докшыцкі р-н), дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, публіцыст.

**1905** Нарадзіўся **Юрка Віцьбіч** (г. Веліж, цяпер Смаленская вобл., Расія), пісьменнік, грамадска-культурны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**2001** У Таронта памёр **Валерый Навіцкі** (да 1945 г. **Валянцін Новік**), грамадска-культурны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Канадзе.

## 16 чэрвеня

**1664** Войска гетмана **Міхала Казіміра Паца** перамагло маскоўскае войска пад Віцебскам.

**1834** Нарадзіўся **Аляксандр Ельскі** (в. Дудзічы, цяпер Пухавіцкі р-н), гісторык, этнограф, краязнавец, пісьменнік, перакладчык, публіцыст.

**1897** Нарадзіўся **Аляксандр Шлюбскі** (в. Межава, цяпер Расонскі р-н), літаратуразнавец, этнограф, фальклярыст, бібліёграф. Верагодна, загінуў у 1941 г. у савецкім канцлагеры.

**1928** У Быдгашчы (Польшча) памёр **Эдвард Вайніловіч**, гаспадарчы і палітычны дзеяч, мемуарыст.

**1931** У Вільні з-за пераследу польскімі ўладамі застрэліўся **Францішак Рамейка**, беларускі каталіцкі святар.

**1955** У Нью-Йорку памёр **Васіль Рагуля**, грамадска-культурны дзеяч, пасол польскага сейма, педагог, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Бельгіі і ЗША.

**1993** Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў Закон “Аб праве ўласнасці на зямлю”.

**1999** Памёр **Мікола Нікан**, настаўнік, вайсковец, дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі і Аўстраліі. Пахаваны на беларускай частцы могілак Фолкнер у Мельбурне (Аўстралія).

## 17 чэрвеня

**1649** Разгром войскамі гетмана **Януша Радзівіла** 7-тысячнага атрада ўкраінскіх казакоў і паўстанцкіх сялян каля Загалля на Прыпяці (цяпер Хойніцкі р-н).

**1696** Памёр кароль Рэчы Паспалітай і вялікі князь літоўскі **Ян III Сабескі**.

**1793** У Гродне пачаўся апошні сейм Рэчы Паспалітай, які зацвердзіў другі падзел Рэчы Паспалітай і прыняў новую Канстытуцыю.

**1848** Памёр **Максіміліян Рыла**, філосаф, археолаг, каталіцкі місіянер на Блізкім Усходзе і ў Афрыцы.

**1934** Адбыўся нелегальны з’езд Таварыства Беларускай Школы.

**1938** У Омску расстраляны **Аркадзь Смоліч**, дзеяч Беларускай Народнай Рэспублікі, вучоны ў галіне эканомікі і сельскай гаспадаркі, географ, картограф.

**1954** У ссылцы ў Сібіры (сяло Машукоўка Матыгінскага р-на Краснаярскага краю, Расія) памёр **Барыс Мікуліч**, пісьменнік, вязень ГУЛАГу.

**1958** У Рызе памёр **Уладзімір Пігулеўскі**, грамадскі дзеяч, пісьменнік.

## 18 чэрвеня

**1806** Нарадзіўся **Міхаіл Валовіч** (маёнт. Парэчча, цяпер Слонімскі р-н), арганізатар нацыяналь-

на-вызваленчага руху, удзельнік паўстання 1830–1831 гг.

**1863** У Магілёве расстраляны **Уладзімір Корсак**, **Міхаіл** і **Ян Манцэвічы**, удзельнікі паўстання 1863–1864 гг.

**1889** Нарадзіўся **Уладзімір Каліноўскі** (г. Ваўкавыск), грамадска-палітычны дзеяч, публіцыст. Расстраляны ў савецкім зняволенні ў 1940(?) г.

**1911** Нарадзіўся **Аляксандр Шыдлоўскі** (в. Мінкі, цяпер Смаргонскі р-н), культурны дзеяч, кампазітар.

**1937** У Ленінградзе памёр **Аляксей Бялыніцкі-Біруля**, заолаг і заагеограф, падарожнік.

**1941** У Беларусі дэсантаваўся Першы Штурмовы Саюз, баявы аддзел беларускага вызваленчага войска.

**1957** Памёр **Вітольд Бялыніцкі-Біруля**, мастак.

## 19 чэрвеня

**1669** Каралём Рэчы Паспалітай і вялікім князем ВКЛ абраны **Міхаіл Вішнявецкі** (1669–1673).

**1826** Нарадзіўся **Баляслаў Длускі** (Віленскі ці Вількамірскі пав.), удзельнік вызваленчага руху, паўстання 1863–1864 гг.

**1831** Адбылася Панарская бітва (пад Вільняй) паміж паўстанцкімі атрадамі і расійскім войскам, якое панесла значныя страты.

**1912** Нарадзіўся **Пятро Бітэль** (мяст. Радунь, цяпер Воранаўскі р-н), пісьменнік, паэт, перакладчык, педагог, праваслаўны святар.

**1924** Нарадзіўся **Васіль Быкаў** (в. Бычкі, цяпер Ушацкі р-н), народны пісьменнік Беларусі.

**1926** У Вільні выйшаў першы нумар газеты “Народная справа” (выдавалася да 27 лістапада 1926 г., выйшла 38 нумароў).

**1941** У Берліне беларускімі дзеячамі створаны Беларускі Нацыянальны Цэнтр — праўобраз беларускага ўрада. Кіраўнік **Мікола Шчорс**.

**1941** Нарадзіўся **Іван Ласкоў** (г. Гомель), пісьменнік, перакладчык, крытык.

**1964** У Пастаўскім раёне супрацоўнікамі КДБ забіты **Вітольд Дзіско**, мастак, дысідэнт.

**1988** Пад Мінскам у Курапатах прайшоў мітынг (каля 10 тысяч чалавек) памяці ахвяраў сталінскага генацыду з патрабаваннем стварэння следчай камісіі.

**1992** У Мінску памёр **Валерый Слюнчанка**, гісторык архітэктуры. Пахаваны на могілках каля в. Слабада Мінскага р-на.

**1993** Памёр **Аляксандр Дзікі**, удзельнік пастаўскай маладзёжнай арганізацыі — Саюза Беларускіх Патрыётаў, вязень савецкіх канцлагераў. Пахаваны ў Полацку.

**2002** Памёр **Мікола Ганько**, кіраўнік Саюза Беларускай Моладзі (1943–1944), сябар Галоўнага штабу беларускага антысавецкага партызанскага руху ў канцы 1940–1950-х гг.

## 20 чэрвеня

**1566** Нарадзіўся **Жыгімонт III Ваза** (г. Грыпсхольм, Швецыя), вялікі князь літоўскі і кароль польскі (1587–1632).

**1606** Пачалося паўстанне гараджанаў Магілёва супраць магістрата. Было задушана толькі ў 1610 г.

**1794** Каля Міра адбыўся бой паміж паўстанцамі **Тадэвуша Касцюшкі** і расійскім войскам.

**1948** У Вязынцы Маладзечанскага р-на адкрыўся філіял Літаратурнага дома-музея **Янкі Купалы**.

**1964** У Мюнхене памёр **Пётр Сыч**, пісьменнік, публіцыст, вязень савецкіх канцлагераў, журналіст, дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі і Нямеччыне.

**2002** У Таронта памёр **Міхаіл Мацукевіч** (у манастве **Мікалай**), рэлігійны дзеяч, архіепіскап Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы.

**2005** Памерла **Аляксандра Бергман**, дзеяч Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі, даследчык гісторыі, вязень савецкіх канцлагераў.

## 21 чэрвеня

**1741** Нарадзіўся **Жан Эмануіл Жылібер** (г. Ліон, Францыя), французскі прыродазнавец, вучоны, які працаваў у Гродне і Вільні.

**1820** Нарадзіўся **Браніслаў Залескі** (мяст. Вызна, цяпер Салігорскі р-н; ці ў в. Рачкавічы, цяпер Слуцкі р-н), мастак, пісьменнік, удзельнік вызваленчага руху.

**1864** Нарадзіўся **Аляксандр Сержпутоўскі** (в. Бялевічы, цяпер Слуцкі р-н), этнограф і фалькларыст.

**1920** Нарадзіўся **Усевалад Родзька** (хутар Паддубнае Лунінецкага пав., цяпер Лунінецкі р-н), палітычны і вайсковы дзеяч, правадыр Беларускай Незалежніцкай Партыі, вязень ГУЛАГу.

**1948** Нарадзіўся **Ян Матусевіч** (Мінск), уніяцкі святар, дэкан Беларускай грэка-каталіцкай царквы.

**1967** У Вільні памёр **Фелікс Стацкевіч**, грамадска-культурны дзеяч, выдавец, педагог, актывіст Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады і Таварыства Беларускай Школы.

**1961** У Бярозе заснаваны гісторыка-краязнаўчы музей.

## 22 чэрвеня

**1883** Нарадзіўся **Аляксандр Цвікевіч** (г. Брэст), палітычны дзеяч, гісторык, філосаф, публіцыст.

**1896** Нарадзіўся **Браніслаў Туронак** (фальв. Пестуны, цяпер Міёрскі раён), культурна-грамадскі дзеяч, публіцыст.

**1919** У Гродне выйшла газета "Родны край" (выдавалася да 19 ліпеня 1919 г. і была забаронена на 6-ым нумары).

**1941** Пачатак Вялікай Айчыннай вайны і нямецкай акупацыі.

**1943** Заснавана маладзёжная патрыятычная арганізацыя — Саюз Беларускай Моладзі (СБМ, дзейнічала у Беларусі да ліпеня 1944 г.).

**1950** У Маладзечне адбыўся суд над удзельнікамі мядзельска-смаргонскага вучнёўскага антысавецкага падполля. Большасць удзельнікаў асуджана да 25 гадоў савецкіх канцлагераў, а кіраўнік групы **Расціслаў Лапіцкі** — да расстрэлу.

**1957** У Брэсце адкрыўся абласны краязнаўчы музей.

**2003** У шпіталі ў Бараўлянах Мінскага р-на памёр **Васіль Быкаў**, народны пісьменнік Беларусі. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

## 23 чэрвеня

**1792** Мястэчка Радунь (цяпер Воранаўскі р-н) атрымала герб.

**1794** Расія ўвяла “мяжу жыдоўскай аседласці”, у якую ўваходзілі Полацкая, Магілёўская і Мінская губерніі.

**1946** У Рэгенсбургу (Баварыя, Нямеччына) заснавана Крывіцкае Навуковае Таварыства імя **Францыска Скарыны** (старшыня **Янка Станкевіч**).

**1947** Памёр **Уладзімір Пічэта**, гісторык-славіст, першы рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

**1992** Памёр **Віктар Янушэўскі**, футбаліст, чэмпіён СССР (1982).

**1994** Адбыўся першы тур выбараў першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

## 24 чэрвеня

**1767** Нарадзіўся **Стафан Грабоўскі** (в. Асташына, цяпер Навагрудскі р-н), вайсковы дзеяч, адзін з кіраўнікоў паўстання 1794 г.

**1777** Нарадзіўся **Ян Ходзька** (мяст. Крывічы, цяпер Мядзельскі р-н), пісьменнік, грамадскі дзеяч, удзельнік паўстання 1830–1831 гг.

**1812** У Беларусь увайшлі войскі Напалеона, пачалася вайна.

**1863** У Лідзе за чытанне маніфеста паўстання ў в. Ішчална (цяпер Шчучынскі р-н), расстраляны ксёндз **Адам Фалькоўскі**.

**1880** Нарадзіўся **Іван Краскоўскі** (в. Дубічы Царкоўныя, цяпер Гайнаўскі пав. Падляскага ваяв., Польшча), грамадска-культурны дзеяч, педагог.

**1890** Нарадзіўся **Часлаў Родзевіч** (фальв. Кур’янаўшчына, цяпер Лагойскі р-н), грамадска-культурны дзеяч. Прапаў без вестак у 1930-х гг. пасля высылкі ў Саратаў.

**1900** Нарадзіўся **Кузьма Чорны** (сапр. **Раманоўскі Мікалай**; маёнт. Боркі, цяпер в. Борка-Бялевічы Капыльскага р-на), пісьменнік, класік беларускай літаратуры, публіцыст, вязень савецкіх турмаў.

**1964** У в. Цімкавічы Капыльскага р-на адкрыўся мемарыяльны літаратурны музей **Кузьмы Чорнага**.

**1976** Памёр **Аскар Марыкс**, тэатральны мастак, педагог.

**1989** У Вільні адбыўся Устаноўчы з’езд Беларускага Народнага Фронту “Адраджэнне” (доўжыўся два дні, 399 дэлегатаў), прыняты Статут і Праграма руху.

**1996** У Новай Мышы Баранавіцкага р-на пастаўлены помнік **Яну Чачоту**.

## 25 чэрвеня

**1652** Мястэчка Жыровічы (цяпер Слонімскі р-н) атрымала магдэбургскае права.

**1660** Адбыліся бітвы войскаў Рэчы Паспалітай з расійцамі пад Зэльвай, Галынкай, Дзярэчынам.

**1685** Мястэчка Астрына (цяпер Шчучынскі р-н) атрымала гарадскія правы.

**1794** Адбыўся бой паміж паўстанцамі **Касцюшкі** і расійскім войскам ля мястэчка Солы.

**1840** Спынена дзеянне Статута ВКЛ (1588) у Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губернях.

**1892** Нарадзіўся **Зыгмунт Абрамовіч** (Масква), акцёр.

**1974** Памёр **Янка Раманоўскі**, мастак.

**2003** Савет Міністраў прыняў пастанову аб ліквідацыі Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя імя **Якуба Коласа** — адзінай навучальнай установы такога тыпу ў краіне. Падзея справакавала кампанію пратэсту.

## 26 чэрвеня

**1819** У Вільні памёр **Францішак Нарвойш**, асветнік, багаслоў, філосаф, матэматык.

**1897** Нарадзіўся **Лявон Савёнак** (в. Вялец, цяпер Глыбоцкі р-н), пісьменнік, журналіст, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1900** Нарадзіўся **Мікола Цэлеш** (в. Зазер’е, цяпер Барысаўскі пав.), пісьменнік, дзеяч эміграцыі ў ЗША. (Памёр пасля 1976 г.)

**1909** Нарадзіўся **Антон Адамовіч** (Мінск), гісторык, літаратуразнавец, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Памёр у Нью-Йорку (1998).

**1941** Расстраляны супрацоўнікамі НКУС 5 тысячаў палітвязеняў, прыгнаных з Мінскай і іншых турмаў ва ўрочышчы Цагельня каля сучаснага Чэрвеня.

**1992** Створаны Беларускі рэспубліканскі фонд падтрымкі дэмакратычных рэформаў імя **Льва Сапегі** (пасля 1999 — грамадскае аб’яднанне “Фонд імя Льва Сапегі”) — недзяржаўная арганізацыя нацыянальнага маштабу.

## 27 чэрвеня

**1697** Каралём Рэчы Паспалітай і вялікім князем ВКЛ абраны **Аўгуст II Моцны** (1696–1733).

**1909** Нарадзіўся **Сяргей Знаёмы** (сапр. **Клопаў Сяргей**; в. Звонь, цяпер Ушацкі р-н), пісьменнік, вязень савецкіх канцлагераў. 22 студзеня 1944 г. уцёк з Паўночна-Усходняга лагеру, далейшы лёс невядомы.

**1919** У в. Бігосава (цяпер Верхнядзвінскі р-н) бальшавікамі расстраляны **Міхаіл Буклярэвіч**, рымска-каталіцкі святар, грамадскі дзеяч.

**1933** У в. Мінявічы (цяпер Мастоўскі р-н) самагубствам скончыў жыццё **Міхась Явар** (сапр. **Карась**), паэт, удзельнік Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, Таварыства Беларускай Школы. Пахаваны ў Навасёлках (цяпер Мастоўскі р-н).

**1941** У Віцебску НКУС распачаў масавыя расстрэлы палітвязняў (усяго за тры дні было забіта каля 2 тысяч чалавек).

**1944** У Мінску прайшоў Другі Усебеларускі кангрэс, скліканы Беларускай Цэнтральнай Радай. Удзельнічала 1039 дэлегатаў. Кангрэс аб'явіў Беларускую Цэнтральную Раду адзінай легальнай уладай у Беларусі.

**1989** У Мінску прайшоў Устаноўчы з'езд Таварыства Беларускай Мовы імя **Францыска Скарыны**.

## 28 чэрвеня

**1660** Пераможная бітва войскаў Рэчы Паспалітай над расійскім войскам ваяводы Хаванскага ля в. Палонка (цяпер Баранавіцкі р-н).

**1931** У Навагрудку адкрыўся курган **Адама Міцкевіча**.

**1932** Нарадзіўся **Пётр Марціноўскі** (в. Катчына, цяпер Мастоўскі р-н), педагог, краязнавец, літаратуразнавец, кіраўнік Зэльвенскага літаратурнага аб'яднання.

**1941** Гітлераўскія войскі занялі Мінск.

**1942** У Маскве ў атэлі загінуў (паводле іншай версіі, быў забіты) **Янка Купала**, народны паэт Беларусі. Пахаваны на Вайсковых могілках у Мінску.

**1979** Заснавана Чырвоная кніга Беларусі — збор рэдкіх відаў жывёл і раслін, якія існуюць пад пагрозай вынішчэння (кніга выдадзена ў 1981 г., перавыдадзена ў 1993 г.).

## 29 чэрвеня

**1440** Вялікім князем ВКЛ абраны **Казімір IV Ягелончык**, малодшы сын **Ягайлы** і **Соф'і Гальшанскай**.

**1896** Нарадзіўся **Уладзіслаў Казлоўскі** (в. Залессе, цяпер Сакольскі пав. Падляскага ваяв., Польшча), грамадска-палітычны дзеяч, паэт, публіцыст, выдавец.

**1913** Нарадзіўся **Часлаў Будзька** (г. Вільня), грамадскі дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1919** У Мінску пры педагагічным інстытуце ўтворана Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасці (дзейнічала да 1925 г.).

**1925** Нарадзіўся **Юры Астроўскі** (Мінск), біяхімік, акадэмік, грамадскі дзеяч.

**1934** Памёр **Эдуард Пякарскі**, лінгвіст, этнограф, географ, асветнік Якуціі.

**1958** У Вільні памёр **Фабіян Ярэміч**, грамадска-культурны дзеяч.

**1974** У Карэлічах адкрыўся краязнаўчы музей.

## 30 чэрвеня

**1655** Маскоўскія войскі захапілі Мінск.

**1932** У Рызе створана Беларускае навукова-краязнаўчае таварыства (дзейнічала ў 1932–1933, старшыня **Кастусь Езавітаў**).

**1969** У г. Хімкі (Маскоўская вобл., Расія) памёр **Міхайла Грамыка**, пісьменнік, вучоны.

**1993** У Крычаве памёр **Міхась Мельнікаў**, краязнавец, вязень ГУЛАГу.

**1995** Адбылася ўрачыстая каранацыя Брэсцкага абраза Маці Божай.



# ЛІПЕНЬ

## 1 ліпеня

**1569** Падпісана Люблінская унія — міжнародна-прававы акт аб'яднання Вялікага княства Літоўскага з Польшчай у федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую.

**1593** Нарадзіўся **Альбрыхт Станіслаў Радзівіл** (г. Алыцка, цяпер Валынская вобл., Украіна), гісторык, мемуарыст.

**1812** **Напалеон** абвясціў узнаўленне Вялікага княства Літоўскага і стварыў часовы ўрад Вялікага княства Літоўскага.

**1840** Нарадзіўся **Міхаіл Манцэвіч** (Магілёўшчына), удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1890** Памёр **Апалін Гофмайстар**, дзеяч вызваленчага руху ў 1840–1860-х гг. Нарадзіўся ў Брэсце (1825).

**1904** У Брэсце заснавана жаночая гімназія.

**1904** Нарадзіўся **Генрык Глябовіч** (г. Гродна), рэлігійны дзеяч, святар, тэолаг.

**1914** У Мінску створаны настаўніцкі інстытут.

**1927** Нарадзілася **Зора Кіпель** (дзяв. **Савёнак**; Мінск), бібліёграф, літаратуразнавец, публіцыстка, грамадска-культурны дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1938** У Алтайскім краі (Расія) расстраляны **Іван Цвікевіч**, дзеяч навукі і культуры. Нарадзіўся ў Брэсце (лістапад 1891 г.).

**1940** У савецкім канцлагеры пад каменнымі глыбамі загінуў **Уладзімір Хадыка**, паэт, перакладчык.

**1941** Пасля наступлення немцаў на ваенным фронце прадстаўнікі савецкай улады перад сваім адыходам хацелі ўзарваць Будслаўскі касцёл, але вернікі абаранялі святыню акружыўшы яе, і ўратавалі.

**2000** Памёр **Рыгор Клімовіч**, кіраўнік паўстання вязняў савецкага канцлагера ў Нарыльску (1953).

## 2 ліпеня

**1988** Памёр **Часлаў Ханяўка**, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1994** У Якуцку памёр **Іван Ласкоў**, пісьменнік, перакладчык, крытык.

**1996** Адраджэнне традыцыйнай пілігрымкі да цудатворнай іконы Маці Божай у Будславе.



Пячатка Юрыя Юр'евіча Алелькавіча, князя слуцкага і капыльскага

## 3 ліпеня

**1660** Войскі Рэчы Паспалітай вызвалілі ад расійцаў горад Мінск і тэрыторыю да ракі Беразіны.

**1708** Адбылася бітва расійскага і шведскага войскаў каля Галоўчына (цяпер Бялыніцкі р-н) — першая на тэрыторыі Беларусі у Паўночнай вайне. Скончылася перамогай шведаў.

**1792** Адбылася бітва пад Зэльвай, расійскія войскі занялі Зэльвеншчыну.

**1896** Нарадзіўся **Яраслаў Кастыцэвіч** (в. Пасынкі, цяпер Бельскі пав. Падляскага ваяв., Польшча), педагог, грамадска-царкоўны дзеяч.

**1918** Нарадзіўся **Рыгор Бярозкін** (г. Магілёў), літаратар, крытык, журналіст.

**1925** Памёр **Тадэвуш Урублеўскі**, адвакат, публіцыст, грамадскі дзеяч.

**1940** Нарадзіўся **Роберт Тамушанскі** (г. Порт-Чэстар, Нью-Йорк, ЗША), філолаг, публіцыст, рэлігійны і грамадска-культурны дзеяч у Вялікабрытаніі і Ватыкане.

**1944** У Мінск пасля цяжкіх баёў увайшлі савецкія войскі.

## 4 ліпеня

**1972** У ЗША адкрыўся беларускі рэлігійна-грамадскі цэнтар “Белэр-Мінск” (Глен-Спэй, Нью-Йорк).

**1988** У Вільні створаны беларускі клуб “Сябрына”.

**1991** У Гродне адкрыўся абласны лялечны тэатар.

**1994** У Міёрах адкрыўся гісторыка-этнаграфічны музей.

## 5 ліпеня

**1818** Нарадзіўся **Антон Яленскі** (маёнт. Капаткевічы, цяпер Петрыкаўскі р-н), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Памёр у Вільні ў 1874 г.

**1938** У Магілёве заснаваны Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (пераведзены ў Мінск у лістападзе 1963 г.).

**1995** Памёр **Барыс Сачанка**, пісьменнік, публіцыст. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**1996** У Вялікай Бераставіцы адкрыўся раённы гісторыка-краязнаўчы музей.

**1997** У Мінску памёр **Васіль Вітка** (сапр. **Цімох Крысько**), літаратар, дзіцячы пісьменнік.

**1997** У Вільні пачалася сесія Еўрапейскага сектара Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (доўжылася 5–6 ліпеня).

**2001** У Мінску пачаўся Трэці з’езд беларусаў свету (доўжыўся 5–6 ліпеня).

## 6 ліпеня

**1253** Вялікі князь літоўскі **Міндоўг** каранаваны ў Навагрудку.

**1607** Перамога каралеўскага войска на чале з **Янам Хадкевічам** над шляхецкім войскам ракашанаў на чале з **Янушам Радзівілам**.

**1851** Нарадзіўся **Янка Лучына** (сапр. **Неслухоўскі**; Мінск), паэт.

**1863** У Барысаве расстраляны **Кастусь Жаброўскі**, палявы камандзір паўстанцкага атрада. Нарадзіўся ў Аўгустоўскай губ. (1838).

**1921** Нарадзіўся **Аляксандр Доўбік**, настаўнік, дысідэнт, вязень савецкіх канцлагераў.

**1937** Нарадзіўся **Пятро Драчоў** (г. Ленінград), мастак-графік.

**1941** Савецкім НКУС перад прыходам немцаў, пад Глыбокім, расстраляны вязні Берозвецкай турмы (пераважна сяляне).

**1984** У Оршы памёр **Аляксандр Вернікоўскі**, праваслаўны святар, вязень ГУЛАГу.

**1985** Памёр **Пятро Сакол** (сапр. **Масальскі Пётр**), паэт, перакладчык. Пахаваны на могілках Лачупе ў Рызе.

**2002** Памёр **Міхась Рагуля**, грамадскі і культурны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША, сын **Васіля Рагулі**. Пахаваны на могілках у Іст-Брансвіку (Нью-Джэрсі, ЗША)

## 7 ліпеня

**1572** Памёр **Жыгімонт ІІ Аўгуст**, вялікі князь літоўскі і кароль польскі (1548–1572)

**1633** Памёр **Леў Сапега**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, канцлер. Пахаваны ў крыпце касцёла Св. Міхала (Вільня).

**1796** Нарадзіўся **Ян Чачот** (в. Малюшычы, цяпер Карэліцкі р-н), асветнік, паэт, фальклАрыст, філамат.

**1864** У Маладзечне адкрылася настаўніцкая семінарыя.

**1882** Нарадзіўся **Янка Купала** (фальв. Вязынка, цяпер Маладзечанскі р-н), народны паэт Беларусі.

**1892** У экспедыцыі ў раёне ракі Аламон (прыток Калымы, Расія) памёр **Іван Чэрскі**, удзельнік паўстання 1863–1864 гг., геолаг, географ, даследчык Сібіры.

**1972** У Мінску ўстаноўлены помнік **Янку Купалу**.

**1993** У Мінску на будынку былога Інстытута беларускай культуры (вул. Рэвалюцыйная, 15) устаноўлена памятная дошка **Максіму Гарэцкаму**.

## 8 ліпеня

**1861** Нарадзілася **Магдалена Радзівіл** (Варшава), дзеяч нацыянальнага культурнага руху, мецэнатка.

**1889** У Бардо (Францыя) памёр **Фларыян Міладоўскі**, кампазітар, піяніст, педагог.

**1940** Нарадзіўся **Алесь Каралёў** (в. Старыя Цярэшкавічы, цяпер Гомельскі р-н), актывіст нацыянальнага руху ў Мінску.

**1993** У Мінску пачаўся Першы з'езд беларусаў свету (доўжыўся 8–10 ліпеня).

**1998** У Наваполацку, пратэстуючы супраць беззаконня гарадскіх чыноўнікаў, падпаліў сябе праваабаронец **Аляксей Філіпчанка**. Памёр ад апёкаў 31 ліпеня.

## 9 ліпеня

**1863** У Вільні павешаны **Зыгмунт Серакоўскі**, адзін з кіраўнікоў вызваленчага паўстання.

**1912** Нарадзіўся **Сяргей Астрэйка** (в. Каласоўшчына, цяпер Капыльскі р-н; ці ў мяст. Усць-Дзвінск каля Рыгі, Латвія), паэт, мовазнавец.

## 10 ліпеня

**1067** На Дняпры каля Оршы адбылася сустрэча князёў Кіеўскай Русі **Яраславічаў** з полацкім князем **Усяславам Брачыслававічам Чарадзеем**, у выніку якой апошні быў схоплены.

**1795** У Гродне заснавана Вярхоўнае літоўскае кіраванне.

**1830** Памёр **Людвік Сабалеўскі**, філолаг, бібліёграф.

**1871** Нарадзіўся **Павел Дземідовіч** (в. Мікалаеўшчына, цяпер Стаўбцоўскі р-н), этнограф, фальклярыст, краязнавец, педагог.

**1891** Нарадзіўся **Павел Валошын** (в. Гаркавічы Сакольскага пав., Падляскага ваяв., Польшча), дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху.

**1900** Нарадзіўся **Пётр Сергіевіч** (в. Стаўрова, цяпер Браслаўскі р-н), мастак.

**1922** Абвешчана аўтаномія Беларускай праваслаўнай царквы на чале з мітрапалітам **Мелхіседэкам**.

**1972** У в. Вязынка Маладзечанскага р-на адкрыўся Купалаўскі мемарыяльны запаведнік.

**1994** Першым прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь абраны **Аляксандр Лукашэнка**.

## 11 ліпеня

**1496** Гародня атрымала поўнае магдэбургскае права.

**1609** У Вільні здейсніўся замах на забойства праваслаўнымі ўніяцкага мітрапаліта **Іпацыя Пацея**, у выніку чаго ён быў паранены.

**1660** Войска **Міхаіла Казіміра Паца** штурмам узяло Вільню і вызваліла горад ад маскоўскага войска.

**1705** У Полацкім Сафійскім саборы расійскі цар **Пётр I** закатаваў 5 манахаў-базыльянаў.

**1885** Нарадзіўся **Францішак Рамейка** (в. Нецкі, цяпер Свянцянскі пав., Літва), каталіцкі святар.

**1941** Віцебск захоплены гітлераўскімі войскамі.

**1995** Выйшаў першы нумар газеты "Народная воля". Рэдактар **Іосіф Сярэдзіч**.

## 12 ліпеня

**1843** У Грэфэнбергу памёр **Ігнат Даніловіч**, даследчык гісторыі права Вялікага княства Літоўскага.

**1913** Нарадзіўся **Уладзімір Голасаў** (мяст. Ілья, цяпер Вілейскі р-н), праваслаўны святар, вязень ГУЛАГу. Загінуў пасля 1944 г. у савецкім канцлагеры.

## 13 ліпеня

**1260** Войскі Вялікага княства Літоўскага разграмілі крыжакоў ля возера Дурбе (Латвія).

**1704** Каралём Рэчы Паспалітай і вялікім князем ВКЛ абраны **Станіслаў Ляшчынскі**.

**1858** Нарадзіўся **Андрэй Вількіцкі** (Меншчына), падарожнік, гідрограф-геадэзіст.

**1866** Нарадзіўся **Напалеон Чарноцкі** (в. Нача, цяпер Ляхавіцкі р-н), публіцыст, перакладчык.

**1868** Памёр **Канстанцін Тышкевіч**, гісторык, краязнавец, адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі.

**1915** На фронце паблізу Каўнаса загінуў **Лявон Гмырак** (сапр. **Мечыслаў Бабровіч**), крытык, публіцыст, празаік.

**1943** Каля в. Навумавічы (Гродзенскі р-н) гітлераўцамі расстраляна **Марыяна Бярнацкая** (дзяв. **Чакала**), якая ахвяравала жыццём за іншага чалавека. 13 чэрвеня 1999 г. яна была беатыфікавана каталіцкім касцёлам. Нарадзілася ў Ліпску каля Ломжы Падляскага ваяв., Польшча (1888).

**1990** Памёр **Янка Багдановіч**, пісьменнік, мемуарыст, вязень савецкіх канцлагераў. Пахаваны на могілках Саўлес у Вільні.

**1993** У Магілёве прайшоў першы фестываль хрысціянскай музыкі “Магутны Божа”.

## 14 ліпеня

**1500** На рацэ Вядроша (ля г. Дарагабуж, цяпер Смаленская вобл., Расія) адбылася бітва паміж войскамі Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы.

**1905** Нарадзіўся **Пятро Сакол** (мяст. Пасінь, цяпер Латвія), паэт, перакладчык.

**1912** Нарадзіўся **Пётр Гайдзель** (Браслаўшчына), дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі і ЗША. Памёр у лютым 1988 г. у Вісконсіне (ЗША).

**1913** У Вільні заснавана Беларускае выдавецкае таварыства. Надрукавала 15 кніг агульным накладам 50 тысяч асобнікаў.

**1918** У Маскве адбылося першае публічнае пасяджэнне Беларускага навукова-культурнага таварыства (дзейнічала да 1919 г.).

**1992** Памёр **Аляксей Карпюк**, пісьменнік, грамадскі дзеяч. Пахаваны на могілках па прасп. Касманаўтаў у Гродне.

**1993** Пратэстанты Беларусі адзначылі 440-ыя ўгодкі пратэстанцтва ў краіне.

**1994** Памёр **Пётр Конюх**, спявак, дзеяч эміграцыі ў Італіі, Бельгіі, ЗША і Канадзе.

**1998** Памёр **Леанід Кароль**, грамадскі дзеяч. Пахаваны на праваслаўных могілках у Вільнюсе.

## 15 ліпеня

**1410** Адбылася Грунвальдская бітва, разгром Тэўтонскага ордэна пераважна войскамі Вялікага княства Літоўскага.

**1678** Нарадзіўся **Анастас Кярсніцкі** (Гальшаны, цяпер Ашмянскі р-н), каталіцкі тэолаг, правазнавец, педагог, пісьменнік. Памёр у 1733 г.

**1876** Нарадзілася **Цётка** (сапр. **Алаіза Пашкевіч**, у замужжы **Кайрыс**; фальв. Пешчын, цяпер Шчучынскі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, паэтэса, асветніца, выдавец.

**1900** Нарадзіўся **Уладзімір Дубоўка** (в. Агароднікі, цяпер Пастаўскі р-н), пісьменнік, перакладчык.

**1903** Нарадзілася **Алена Лябецкая** (хутар Лагуцева, цяпер Дзятлаўскі р-н), дзеяч Таварыства Беларускай Школы.

**1926** Нарадзіўся **Ян Садоўскі**, навуковец, скарыназнавец, дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі і Канадзе.

## 16 ліпеня

**1874** У Брусэлі памёр **Віктар Гельтман**, публіцыст, удзельнік паўстання 1830–1831 гг.

**1901** Нарадзіўся **Аляксандр Крыт** (в. Мархачоўшчына, цяпер Стаўбцоўскі раён), рэлігійны і грамадскі дзеяч, педагог, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Вялікабрытаніі і ЗША.

**1976** У Нью-Йорку памёр **Янка Станкевіч**, грамадска-культурны дзеяч, мовазнавец, гісторык, перакладчык, выдавец, публіцыст, педагог, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**2005** У Нью-Йорку памерла **Яніна Каханоўская**, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**2005** У Мінску пачаўся Чацвёрты з'езд беларусаў свету (доўжыўся 16–17 ліпеня).

## 17 ліпеня

**1918** У Маскве пачаўся Усерасійскі з'езд бежанцаў з Беларусі (доўжыўся да 21 ліпеня). Удзельнічала 227 дэлегатаў.

**1919** Урад Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі спыніў сваю дзейнасць.

**1998** Памёр **Сяргей Сідар**, географ, педагог.

## 18 ліпеня

**1946** У савецкім зняволенні памёр **Альбін Ярашэвіч**, каталіцкі тэолаг, грамадскі дзеяч, вязень фашысцкіх і савецкіх турмаў. Нарадзіўся ў Сакольскім пав., цяпер Падляскае ваяв., Польшча (1879).

## 19 ліпеня

**1450** Першае ўпамінанне ў пісьмовых крыніцах мястэчка Узда (цяпер Мінская вобл.).

**1635** Памёр **Павел Стафан Сапега**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, падканцлер. Нарадзіўся ў 1565 г.

**1855** Памёр **Тамаш Зан**, удзельнік вызваленчага руху, філамат, прыродазнавец, літаратар.

**1869** (ці 1867) Нарадзіўся **Лявон Вітан-Дубейкаўскі** (в. Дубейкава, цяпер Мсціслаўскі р-н), дзеяч нацыянальнага руху, паэт, архітэктар, будаўнік.

**1919** Памёр **Юзаф Беркман**, жывапісец, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Пахаваны ў Варшаве.

**1927** Нарадзіўся **Міхась Саўка** (в. Загора, цяпер Карэліцкі р-н), беларускі і бельгійскі мастак-рэстаўратар, мастацтвазнавец, археолаг.

**1943** У в. Баравікоўшчына (Валожынскі р-н) фашыстамі закатаваны **Караль Стэмпень** і **Юзаф Пухала**, рэлігійныя дзеячы, рымска-каталіцкія святары. 13 чэрвеня 1999 г. беатыфікаваны. **Караль Стэмпень** нарадзіўся 21 кастрычніка 1910 г. у Лодзі (Польшча), **Юзаф Пухала** нарадзіўся 18 сакавіка 1911 г. у в. Косіна (Польшча).

**1943** У савецкім канцлагеры загінуў **Сяргей Дарожны** (сапр. **Серада**), пісьменнік, перакладчык.

**1977** У Мураі (Кентукі) памёр **Іван Любачка**, настаўнік, гісторык, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1980** У Мінску запалены алімпійскі агонь.

## 20 ліпеня

Міжнародны дзень шахмат

**1617** Заснаваны Базыльянскі закон — уніяцкі царкоўны ордэн.

**1856** Нарадзіўся **Часлаў Пяткевіч** (в. Бабчын, цяпер Хойніцкі р-н), этнограф, фалькларыст.

**1897** Памёр **Аскар Авейдэ**, удзельнік паўстання 1863–1864 гг., гісторык, мемуарыст. Нарадзіўся ў Марыямпалі, цяпер Літва (1837).

## 21 ліпеня

**1770** Памёр **Удальрык Крыштаф Радзівіл**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, пісьменнік.

**1860** Нарадзіўся **Антон Камінскі** (г. Вільня, ці маёнт. Ярылаўка), графік і жывапісец.

**1891** Нарадзіўся **Сымон Кандыбовіч** (в. Старыца, цяпер Капыльскі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне.

**1917** У Мінску пачаўся Другі з'езд беларускіх нацыянальна-дэмакратычных арганізацыяў (доўжыўся да 23 ліпеня), створана Цэнтральная беларуская рада.

**1999** У Мінску мастак **Алесь Пушкін** здзейсніў перфоманс "Падарунак прэзідэнту" — прывёз тачку гною да будынку Адміністрацыі прэзідэнта.

## 22 ліпеня

**1698** Войска гетмана Вялікага княства Літоўскага **Казіміра Сапегі**, пад Юрбаркам (цяпер Літва) разбіла войска канфедэратаў-рэспубліканцаў.

**1831** У Навагрудак увайшлі паўстанцы супраць расійскай акупацыі.

**1906** У в. Мікалаеўшчына (цяпер Стаўбцоўскі р-н) нелегальна адбыўся з'езд беларускіх настаўнікаў Мінскай губерні (працягваўся два дні, прысутнічалі 16 чалавек).

**1993** У ЗША адбылася сустрэча старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь **Станіслава Шушкевіча** з прэзідэнтам ЗША **Білам Клінтанам**, дзе падпісана Дэкларацыя пра міждзяржаўныя дачыненні.

## 23 ліпеня

**1895** Нарадзіўся **Міхаіл Сазыка**, вайсковы дзеяч, спявак, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне.

**1906** Нарадзіўся **Антон Валынчык** (в. Мяльканавічы, цяпер Слонімскі р-н), хормайстар, кампазітар, педагог.

**1966** У Дэнвіле (Ілінойс) памёр **Аляксандр Ружанцоў**, грамадска-палітычны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1995** У Мінску памёр **Алесь Ставер**, паэт, празаік, драматург. Пахаваны ў Калодзішчах Мінскага р-на.

**1996** У Гродне адкрылася аптэка-музей у будынку езуіцкага кляштара — найстарэйшая аптэка ў Беларусі.

## 24 ліпеня

Дзень з'яўлення гравюры Мацея Цюндта "Старажытная Гародня"

**1820** Нарадзіўся **Люцыян Крашэўскі** (г. Пружаны), мастак, фатограф, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1896** Нарадзіўся **Аляксандр Орса** (мяст. Нягневічы, цяпер Навагрудскі р-н), педагог, доктар прыродазнаўства, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1925** Альберцін (каля Слоніма) атрымаў статус першага ў Беларусі прыходу грэка-каталіцкага абрада.

**1998** У Вільні пачаўся Другі з'езд беларусаў Балтыі (доўжыўся 24–25 ліпеня).

## 25 ліпеня

**1570** У Яраслаўлі і Кастраме па загаду цара **Івана Жахлівага** забіты 665 палонных з Полацка.

**1884** Нарадзіўся **Аляксандр Вернікоўскі** (г. Вільня), праваслаўны святар, вязень ГУЛАГу.

**1897** Нарадзіўся **Антось Галіна** (сапр. **Міхась Міцкевіч**; в. Мікалаеўшчына, цяпер Стаўбцоўскі р-н), пісьменнік, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША, брат **Якуба Коласа**.

**1916** Нарадзіўся **Мікалай Каранеўскі**, інжынер, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

**1919** Памёр **Іван Хлябцэвіч**, праваслаўны духоўнік, краязнавец, публіцыст. Нарадзіўся ў в. Сядзельнікі, цяпер Ваўкавыскі р-н (1857).

**1939** Памёр **Эдвард фон Роп**, рэлігійны і грамадска-палітычны дзеяч Беларусі і Літвы.

**1945** У Магілёве расстраляны **Станіслаў Грынкевіч**, грамадска-палітычны і культурны дзеяч, літаратар, адзін з лідэраў Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі.

**1984** Памёр **Уладзімір Караткевіч**, народны пісьменнік Беларусі. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**1993** У Лідзе ўстаноўлены помнік **Францыску Скарыне** (скульптар **Валяр'ян Янушкевіч**).

**1997** Памерла **Наталля Арсеннева**, паэтэса, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахавана ў Рочэстэры (Нью-Йорк, ЗША)

**2006** У Мінску памёр **Янка Брыль**, народны пісьменнік. Пахаваны ў Калодзішчах Мінскага р-на.

## 26 ліпеня

**1511** Навагрудак атрымаў магдэбургскае права.

**1592** Памёр **Ян Кішка**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, заснавальнік Івейскай арыянскай школы. Нарадзіўся каля 1540 г.

**1720** Пачаўся Замойскі сабор грэка-каталіцкай іерархіі Рэчы Паспалітай (доўжыўся да 17 верасня 1720 г.).

**1792** Мястэчка Астрына (цяпер Шчучынскі р-н) атрымала герб.

**1909** Нарадзіўся **Янка Макарэвіч** (Берасцейшчына), паэт, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

**1931** У в. Вінная (цяпер Высокамазавецкі пав. Падляскага ваяв., Польшча) памёр **Міхаіл Пятроўскі**, каталіцкі святар, педагог, грамадска-культурны дзеяч.

**1933** У Косаве (цяпер Івацэвіцкі р-н) памёр **Францішак Грынкевіч**, рэлігійны і культурны дзеяч.

**1948** Нарадзіўся **Уладзімір Плешчанка** (в. Вароны Віцебскага р-на),

грамадскі дзеяч, старшыня Віцебскай абласной рады Кансерватыўна-Хрысціянскай Партыі Беларускі Народны Фронт.

**1952** Нарадзіўся **Генадзь Кулажанка** (г. Нароўля), актывіст беларускамоўнага самвыдату ў 1970-х гг. У ліпені 1981 г. падчас вайсковай службы знік без вестак у ваколіцах г. Герата (Аўганістан).

**1978** Памёр **Аляксей Васіленя**, грамадска-палітычны дзеяч, дзеяч беларускай эміграцыі ў Нямеччыне і Аўстраліі. Пахаваны на беларуска-украінскай частцы могілак Роквуд у Сіднеі (Аўстралія).

**1989** У Мінску прайшоў масавы мітынг з патрабаваннем стварэння следчай камісіі па справе ўтойвання інфармацыі пра Чарнобыль.

**1993** Рашэннем Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь у краіне спынена абарачэнне савецкіх грошай і ўведзена нацыянальная валюта — беларускі рубель.

**1997** У Мінску пачаўся Другі з'езд беларусаў свету (доўжыўся 26–27 ліпеня).

## 27 ліпеня

**1896** Нарадзіўся **Язэп Горыд** (г. Адэса), графік, жывапісец.

**1906** Нарадзіўся **Ежы Гедройц** (Мінск), грамадскі дзеяч, рэдактар польскага часопіса "Культура", які актыўна спрыяў развіццю беларускай навукі і культуры.

**1910** Памёр **Уладзіслаў Дыбоўскі**, удзельнік паўстання 1863–1864 гг., заолаг, батанік, палеантолаг, мінералог, фальклярыст.

**1941** У Мінску выйшаў першы нумар "Мінскай газеты" (ад 1942 г. — "Беларуская газета", выходзіла да 28 чэрвеня 1944 г.).

**1944** Нарадзіўся **Валянцін Шаўцоў**, педагог.

**1969** Памёр **Яўхім Кіпель**, грамадска-палітычны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахаваны на беларускіх могілках у Саўт-Рыверы (Нью-Джэрсі, ЗША).

**1988** Памёр **Серафім Татарын**, грамадска-культурны дзеяч, актывіст Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады і Таварыства Беларускай Школы.

**1990** Вярхоўны Савет прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь.

**1993** У Гданьску (Польшча) адкрыўся Генеральны кансулят Рэспублікі Беларусь.

**1996** У Мінску адбыўся 20-тысячны мітынг, на якім прынята рэзалюцыя з патрабаваннем адстаўкі прэзідэнта **Лукашэнкі**.

## 28 ліпеня

**1812** Нарадзіўся **Юзаф Ігнацы Крашэўскі** (Варшава), польскі пісьменнік, гісторык, грамадскі дзеяч. Апісваў свае падарожжы на Беларусі, побыт яе жыхароў.

**1863** У Рагачове расстраляны **Тамаш Грыневіч**, удзельнік вызваленчага паўстання. Нарадзіўся ў цяперашнім Быхаўскім р-не (1815).

**1879** Нарадзіўся **Васіль Рагуля** (в. Ачукевічы, цяпер Навагрудскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, педагог, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Бельгіі і ЗША.

**1897** Памёр **Янка Лучына** (сапр. **Неслухоўскі Янка**), паэт. Пахаваны на Кальварыйскіх могілках у Мінску.

**1902** Нарадзіўся **Віктар Вальтар** (г. Дзвінск, цяпер Даўгаўпілс, Латвія), пісьменнік.

**1920** Памёр **Алесь Гарун** (сапр. **Прушынскі Аляксандр**), дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, паэт. Пахаваны на Ракавіцкіх могілках у Кракаве.

**1944** Савецкія войскі занялі Брэст.

**1972** У Нью-Йорку памёр **Язэп Гладкі**, грамадскі дзеяч, фалькларыст, этнограф, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1997** Памёр **Лявон Луцкевіч**, палітычны, грамадскі і культурны дзеяч, вязень савецкіх канцлагераў. Пахаваны на могілках Росы ў Вільні.

## 29 ліпеня

**1908** Нарадзіўся **Юрка Лявонны** (сапр. **Юркевіч Леанід**; Чавусы), паэт. Расстраляны ў Курапатах увосень 1937 г.

**1920** У Коўне выйшла газета “Пагоня” (выдавалася штотыдзень да 31 снежня 1920 г.).

**1960** Памёр **Тодар (Хведар) Данілюк**, рэлігійны і вайсковы дзеяч, адзін са стваральнікаў Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы, ад 1950 г. жыў ў ЗША. Пахаваны на беларускіх могілках у Іст-Брансвіку (Нью-Джэрсі, ЗША).

**2000** У Мінску адбыўся Усебеларускі з’езд за незалежнасць (1376 дэлегатаў).

**2004** У Мінску памёр **Язэп Юхо**, юрыст, гісторык права, сябар Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі Беларускі Народны Фронт.

## 30 ліпеня

**1729** Нарадзіўся **Ігнат Масальскі** (в. Алекшыцы, цяпер Бераставіцкі р-н), беларускі і польскі асветнік, тэолаг, каталіцкі духоўнік.

**1840** Расійскі цар **Мікалай I** выдаў указ, які забараняў назву “Беларусь”. Загадвалася называць беларускія землі “Северо-Западный край”.

**1905** Выдадзены маніфест аб рэлігійнай вольнасці і грамадскіх свабодах у Расійскай імперыі.

**1917** Памёр **Ян Курчэўскі**, каталіцкі духоўнік, гісторык, педагог. Нарадзіўся ў мяст. Данюшава, цяпер Смаргонскі р-н (1854).

**1941** У в. Малая Кавалеўшчына (Мёрскі р-н) гітлераўцамі расстраляны Фларыян Манцэвіч, грамадскі дзеяч,

педагог. Нарадзіўся ў мяст. Іказнь, цяпер Браслаўскі р-н (1890).

## 31 ліпеня

**1649** Адбылася бітва пад Лоевам, паражэнне 15-тысячнага казацкага войска на чале з **Міхалам Крычаўскім** ад войск Вялікага княства Літоўскага на чале з **Янушам Радзівілам**.

**1802** Нарадзіўся **Ігнат Дамейка** (маёнт. Мядведка, цяпер Карэліцкі р-н), удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху, філамат, геолаг, мінералог, нацыянальны герой Чылі.

**1913** Нарадзіўся **Міхаіл Петрыкевіч** (в. Падкасоўе, цяпер Навагрудскі р-н), краязнавец, музеязнавец, педагог.

**1941** Памёр **Якуб Чэхаўскі**, атлет і барэц.

**1942** Каля Навагрудку гітлераўцы расстралялі 60 мірных жыхароў і двух каталіцкіх святароў — **Міхала Далецкага** і **Юзафа Кучынскага**.

**1944** НКУС пачаў маштабную аперацыю па знішчэнні ў Беларусі збройнага антысавецкага падполля. За год было арыштавана амаль сто тысяч чалавек. Пры супраціўленні забіта каля 3 200 беларускіх патрыётаў.

**1949** Прайшоў першы з’езд Беларуска-амерыканскага задзіночання (БАЗА).

**1981** Памёр **Міхась Ларчанка**, літаратуразнавец і крытык, які ў 1956 г. абвінавачваўся ў “нацыяналізме”. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

# ЖНІВЕНЬ

## 1 жніўня

**1520** Нарадзіўся **Жыгімонт II Аўгуст** (г. Кракаў), вялікі князь літоўскі і кароль польскі (1548–1572).

**1861** Памёр **Ігнат Ходзька**, пісьменнік, мемуарыст.

**1912** Нарадзіўся **Янка Ролсан** (сапр. **Гадзіцкі**; в. Вялень, цяпер Пухавіцкі р-н), грамадска-культурны дзеяч, паэт, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

**1914** Пачалася Першая сусветная вайна.

**1920** Чырвоная Армія заняла Брэст.

**1921** Нарадзіўся **Уладзімір Урбановіч** (в. Пудзіна, цяпер Навагрудскі р-н), краязнавец, педагог, культуролаг.

**1943** Ва ўрочышчы Батароўка каля Навагрудка гітлераўцы расстралялі 11 сясцёр-назарэтанак. 6 сакавіка 2000 г. яны былі беатыфікаваны.

**1994** Памёр **Восіп Блізнюк**, удзельнік антысавецкага падпольнага вучнёўскага руху ў Смаргонях, вязень савецкіх канцлягераў. Пахаваны ў Смаргонях.

**1794** Пад Слонімам адбылася бітва паміж корпусам **Караля Серакоўскага** і расійскім войскам.

**1833** У Гродне павешаны **Міхаіл Валовіч**, арганізатар нацыянальна-вызваленчага руху, удзельнік паўстання 1830–1831 гг.

**1840** Расійсія ўлады скасавалі дзеянне на тэрыторыі Беларусі Статута Вялікага княства Літоўскага.

**1841** Нарадзіўся **Ян Манцэвіч** (Магілёўшчына), вайсковец, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1886** Нарадзіўся **Мікалай Гуткоўскі** (в. Забелы, цяпер Слуцкі р-н), грамадскі дзеяч, юрыст.

**1899** У Кракаве(?) памёр **Ян Ваньковіч**, удзельнік паўстання 1863–1864 гг., мастак.

**1919** У Вільні Цэнтральная Беларуская Рада Віленшчыны і Гродзеншчыны ўтварыла Беларускую вайсковую камісію — орган па фарміраванні беларускіх частак у польскім войску.

**1953** Памёр **Сяргей Скандракоў**, вучоны, краязнавец, публіцыст.

## 2 жніўня

**1549** Нарадзіўся **Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка** (г. Нясвіж), дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, падарожнік-мемуарыст.



Пячатка Юрыя Збрынскага, суддзі замка Берасцейскага. *1548 г.*

## 3 чэрвеня

**1470** Заснаваны Жыровіцкі манастыр.

**1615** Памёр **Крыштаф Мікалай Дарагастайскі**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, заснавальнік друкарні ў Ашмяне Мураванай.

**1654** Пад Оршай адбылася бітва аддзелаў польскага гетмана **Гасеўскага** з маскоўскім войскам.

**1847** Памёр **Марцін Цяплінскі**, паэт, фалькларыст, удзельнік паўстання 1830–1831 гг. Нарадзіўся ў фальв. Крупава (цяпер Зэльвенскі р-н), ці ў Цяшэйкаве (1810?).

**1953** Нарадзіўся **Валерый Шаблюк** (г. Узда), гісторык.

**1971** Памёр **Янка Маўр** (сапр. **Фёдараў Іван**), пісьменнік, перакладчык, адзін з пачынальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

## 4 чэрвеня

**1651** Войскі Вялікага княства Літоўскага на чале з князем **Янушам Радзівілам** узялі Кіеў.

**1676** Нарадзіўся **Дамінік Рудніцкі**, пісьменнік, педагог.

**1838** Нарадзіўся **Юзаф Беркман** (г. Валожын), жывапісец, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1917** Нарадзіўся **Янка Брыль** (г. Адэса, цяпер Украіна), народны пісьменнік Беларусі.

**1947** Нарадзіўся **Мікола Селяшчук** (в. Вялікарыта Маларыцкага р-на), мастак.

**1973** Памёр **Міхаіл Урбановіч**, культурны дзеяч, педагог, каталіцкі святар. Пахаваны на могілках Св. Казіміра ў Чыкага (ЗША).

**2001** Памёр **Вячаслаў Адамчык**, пісьменнік.

## 5 чэрвеня

**1392** Падпісана Востраўскае пагадненне паміж князямі **Ягайлам** і **Вітаўтам**, паводле якога ўлада ў Вялікім княстве Літоўскім перадавалася апошняму.

**1461** Нарадзіўся **Аляксандр** (г. Кракаў), вялікі князь літоўскі (1492–1506).

**1506** Адбылася бітва пад Клецкам, у якой войска Вялікага княства Літоўскага на чале з **Міхалам Глінскім** атрымала перамогу над войскам Крымскага ханства.

**1772** Прынята Пецярбургская канвенцыя, паводле якой адбыўся першы тэрытарыяльны падзел Рэчы Паспалітай.

**1815** Памёр **Геранім Страйноўскі**, асветнік, правазнавец, рэлігійны дзеяч Рэчы Паспалітай.

**1816** У Варшаве памёр **Тамаш Ваўжэцкі**, грамадска-палітычны і вайсковы дзеяч Вялікага княства Літоў-

скага, адзін з кіраўнікоў паўстання 1794 г. Пахаваны ў мяст. Відзы, цяпер Браслаўскі р-н. Нарадзіўся паміж 1753 і 1759 гг. у Браслаўскім пав.

**1864** У Варшаўскай цытадэлі павешаны **Рамуальд Траўгут**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Пахаваны ў Львове.

**1886** Нарадзіўся **Браніслаў Ямант** (в. Дакудава, цяпер Лідскі р-н), беларускі і польскі мастак, педагог.

**1908** Памёр **Валерый Урублеўскі**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Пахаваны на могілках Пэр-Ляшэз у Парыжы.

**1985** У Чыкага памёр **Часлаў Будзька**, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1989** Памёр **Лазар Ран**, мастак.

## 6 жніўня

**1492** У Вільні вялікі князь літоўскі **Аляксандр** выдаў прывілей, які меў характар феадальнай канстытуцыі і замацоўваў асновы дзяржаўна-грамадскага ладу ў Вялікім княстве Літоўскім.

**1517** **Францыск Скарына** ў Празе выдаў першую кніжку Бібліі — першую беларускую і ўсходнеславянскую друкаваную кнігу.

**1520** Нарадзілася **Барбара Радзівіл**, вялікая княгіня літоўская, каралева польская (1550–1551).

**1715** Нарадзіўся **Мацей Догель** (в. Гембулы Лідскага пав.), гісторык-археограф, правазнавец.

**1840** Нарадзіўся **Альгерд Абуховіч** (в. Калацічы, цяпер Глускі р-н), пісьменнік, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1877** Памёр **Іван Насовіч**, мовазнавец-лексікограф, фальклярыст, этнограф. Пахаваны на могілках Тупічэўскага манастыра (Мсціслаў).

**1884** Нарадзіўся **Яўген Хлябцэвіч** (мяст. Жыровічы, цяпер Слонімскі р-н; ці в. Клейнікі, цяпер Гайнаўскі пав. Падляскага ваяв., Польшча), бібліятэказнавец, літаратуразнавец, публіцыст, педагог.

**1990** У Мінску адбылася прэзентацыя першага нумара часопіса “Унія”.

**1914** Нарадзіўся **Міхась Рагуля**, грамадска-культурны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1994** У Вільні пачаўся З’езд беларусаў Балтыі (доўжыўся 6–7 жніўня). Устаноўлена памятная дошка **Янку Купалу**.

## 7 жніўня

**1837** Нарадзіўся **Баляслаў Калышка** (фальв. Карманішкі, цяпер Літва), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1867** Памёр **Людвік Камінскі** (Варшава), удзельнік паўстання 1830–1831 гг., паэт-перакладчык. Нарадзіўся ў Бастыні на Палессі (1786).

**1879** Нарадзіўся **Пётр Крачэўскі** (в. Дубна, цяпер Мастоўскі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, паэт, гісторык, старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

**1880** (ці 20 ліпеня) Нарадзіўся **Гальяш Леўчык** (сапр. **Ільля Ляўковіч**; г. Слонім), паэт, асветнік, калекцыянер. Загінуў у Варшаве (верасень 1944 г.).

**1910** Нарадзіўся **Якуб Ермаловіч** (в. Вяшэўка, цяпер Бярэзінскі р-н), пісьменнік.

**1915** У Вільні выйшаў апошні нумар "Нашай Нівы".

**1995** У Мінску памёр **Максім Танк** (сапр. **Яўген Скурко**), грамадскі дзеяч, паэт. Пахаваны ў в. Пількаўшчына Мядзельскага р-на.

## 8 чэрвеня

**1780** У сваім маёнт. Грушаўка (цяпер Ляхавіцкі р-н) скончыў жыццё самагубствам **Тадэвуш Рэйтан**, палітычны дзеяч Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Нарадзіўся ў 1742 г.

**1919** Пачалася акупацыя Мінска польскімі войскамі (доўжылася да 11 ліпеня 1920 г.).

**1976** Памёр **Мікалай Лапіцкі**, праваслаўны святар, рэлігійна-грамадскі дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахаваны на беларускіх могілках у Саўт-Рыверы (Нью-Джэрсі, ЗША).

**1977** У Парыжы памёр **Леў Гарошка**, асветнік, уніяцкі рэлігійны дзеяч, гісторык, выдавец, пісьменнік, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Францыі, Вялікабрытаніі і Ватыкане. Пахаваны на могілках Сен-Панкрац у Лондане.

## 9 чэрвеня

**1856** Памёр **Фларыян Бохвіц**, асветнік, філосаф, пісьменнік. Пахаваны ў в. Дарава (цяпер Ляхавіцкі р-н).

**1890** Нарадзіўся **Максім Бурсевіч** (в. Чамяры, цяпер Слонімскі р-н), дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, актывіст Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады.

**1910** Нарадзілася **Ларыса Геніюш** (дзяв. **Міклашэвіч**; маёнт. Жлобаўцы, цяпер Ваўкавыскі р-н), паэтэса, вязень ГУЛАГу.

**1976** Памёр **Іван Мележ**, пісьменнік, грамадскі дзеяч. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

## 10 чэрвеня

**1787** Нарадзіўся **Ігнат Даніловіч** (в. Грынявічы, цяпер Бельскі пав. Падляскага ваяв., Польшча), даследчык гісторыі права Вялікага княства Літоўскага.

**1796** Нарадзіўся **Ігнат Легатовіч** (в. Малая Капліца, цяпер Гродзенскі р-н), беларускі і польскі паэт, педагог.

**1912** Нарадзіўся **Гаўрыіл Верасаў** (Мінск), шахматыст, тэарэтык шахмат.

**1920** У Мінску пачала дзейнічаць тэатральная група **Уладзіслава Галубка** (ад 1926 г. — Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр, ад 1932 г. — трэці Беларускі дзяржаўны тэатр; дзеінічаў да 1937 г.).

**1929** Нарадзіўся **Алесь Ставер** (в. Маргавіца, цяпер Докшыцкі р-н), паэт, празаік, драматург.

## 11 жніўня

**1127** Першае ўпамінанне пра Гародню ў пісьмовых крыніцах (Лаўрэнцеўскі летапіс).

**1974** У Полацку ўстаноўлены помнік **Францыску Скарыну**.

## 12 жніўня

**1399** На рацэ Ворскла адбылася бітва паміж войскам Вялікага княства Літоўскага на чале з князем **Вітаўтам** і войскам Залатой Арды, у якой вялікакняжацкае войска пацярпела паражэнне.

**1654** Пад Шкловам адбылася бітва корпуса **Януша Радзівіла** з маскоўскім войскам князя **Чаркаскага**.

**1877** Нарадзіўся **Тодар (Хведар) Данілюк** (в. Сурынка, цяпер Слонімскі р-н), рэлігійны і вайсковы дзеяч, удзельнік Слуцкага паўстання, адзін са стваральнікаў Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы, які ад 1950 г. жыў ў ЗША.

**1893** Нарадзіўся **Аляксандр Ружанцоў** (Вязьма, цяпер Смаленская вобл., Расія), грамадска-палітычны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1936** У савецкім канцлягеры памёр **Пётр Мятла**, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху. Нарадзіўся ў в. Кухцінцы, цяпер Міёрскі р-н (1890).

**1948** У Чэхаславакіі савецкія карныя органы арыштавалі **Янку** і **Ларысу Геніюшаў**, якія пазней былі засуджаныя.

**1992** Памёр **Юрка Луцкевіч**, вайсковец, настаўнік, сябар Беларускай Незалежніцкай Партыі, вязень савецкіх канцлягераў. Пахаваны ў Вільні.

**2006** У Гётэборгу (Швецыя) на чэмпіянаце Еўропы па лёгкай атлетыцы беларускія спартсмены заваявалі 5 медалёў за дзень (з іх тры — залатыя).

## 13 жніўня

**1911** Нарадзіўся **Вінцэнт Склубоўскі** (в. Малышкаўшчына, цяпер Ашмянскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, актывіст Таварыства Беларускай Школы, пасля Другой сусветнай вайны працаваў на Беласточчыне.

**1913** Нарадзіўся **Анатоль Багатыроў** (г. Віцебск), кампазітар, музычны педагог.

**1922** Нарадзіўся **Кастусь Шышэя** (псеўд. **Арол**), дзеяч беларускага вызваленчага руху, сябар Беларускай Незалежніцкай Партыі, вязень савецкіх канцлагераў.

**1923** Нарадзіўся **Самсон Пярловіч** (в. Католышы, цяпер Навагрудскі р-н), паэт, сябар падпольнага Саюза Вызвалення Беларусі, вязень ГУЛАГу.

**1956** Памёр **Якуб Колас**, народны паэт Беларусі. Пахаваны на Вайсковых могілках у Мінску.

**1995** Памёр **Аляксей Мельнікаў**, літаратуразнавец.

**2002** У Вільні пачаўся Трэці з'езд беларусаў Балтыі (доўжыўся 13–14 жніўня).

## 14 жніўня

**1385** Падпісана Крэўская ўнія — дамова аб саюзе Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага.

**1794** Нарадзіўся **Міхаіл Балінскі** (маёнт. Цярэспаль, цяпер Полацкі р-н.), гісторык, публіцыст.

**1842** Нарадзіўся **Уладзімір Кавалеўскі** (в. Шусцянцы Дынабургскага пав.), прыродазнавец, заснавальнік эвалюцыйнай палеанталогіі, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1873** Памёр **Антон Руткоўскі**, педагог, бібліятэкар, удзельнік паўстання 1830–1831 гг. Нарадзіўся ў 1805 г.

**1882** Нарадзіўся **Аляксандр Мікульчык** (мяст. Шацк, цяпер Пухавіцкі р-н), беларускі паэт. Памёр пасля 1918 г.

**1889** У Дудзергофе (пад Пецярбургам) памёр **Аляксандр Гінтаўт Дзевалтоўскі**, рэлігійны дзеяч, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху на Гарадзеншчыне.

**1941** У Асвенціме загінуў **Максіміліян Кольбэ**, рымска-каталіцкі дзеяч, які ахвяраваў жыццём за іншага чалавека. Пазней кананізаваны.

**1941** Заключана савецка-польскае пагадненне, на падставе якога створана армія, дзе было шмат беларусаў (фарміравалася на тэрыторыі СССР у жніўні 1941 – сакавіку 1942 г., а потым была перакінута ў Іран, Ірак, ваявала ў Афрыцы і Італіі).

**1958** Памёр **Эдзюк (Эдвард) Будзька**, паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч. Пахаваны на могілках Св. Войцаха ў Чыкага (Ілінойс, ЗША).

**1975** У ЗША **Янка** і **Станіслаў Станкевічы** заснавалі Вялікалітоўскі фонд імя **Льва Сапегі** — прыватны дабрачынны фонд для развіцця беларускай навукі.

**1985** У Крэўскім замку і на Янавай гары пад Крэвам інтэлігенцыя з Мінска, Маладзечна, Гродна адзначыла 600-ыя ўгодкі Крэўскай уніі.

## 15 жніўня

**1068** Адбылося паўстанне кіяўлянаў супраць князя **Ізяслава**, у выніку якога **Усяслаў Брачыслававіч Чарадзей** быў абраны кіеўскім князем.

**1780** Нарадзіўся **Ігнат Анацэвіч** (в. Малая Бераставіца, цяпер Бераставіцкі р-н), гісторык, археограф, педагог.

**1831** (ці 15 чэрвеня) Нарадзіўся **Вінцэнт Каратынскі** (в. Селішча, цяпер Карэліцкі р-н), беларускі і польскі паэт, публіцыст, перакладчык.

**1858** Нарадзіўся **Міхаіл Пліс** (Гродзенская губ.), грамадскі дзеяч, праваслаўны святар.

**1910** Памёр **Зыгмунт Глогер**, польскі этнограф, археолаг, які даследаваў Заходнюю Беларусь.

**1924** Нарадзіўся **Павел Гуз** (в. Дуброва, цяпер Рэчыцкі р-н), дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

**1954** (ці 15 верасня) У мяст. Падсвілле памёр **Язэп Драздовіч**, мастак, скульптар, этнограф, археолаг, педагог, адзін з заснавальнікаў нацыянальна-гістарычнага жывапісу. Пахаваны на могілках паміж в. Ліпляны і Малыя Давыдкі Глыбоцкага р-на.

**1972** У Мінску забіты **Лявон Баразна**, мастак, дысідэнт. Пахаваны ў Мінску.

**1988** У Лембарку (Польшча) памёр **Мікалай Дварэцкі**, грамадскі дзеяч, паэт, эмігрант (жыў у Польшчы).

## 16 жніўня

**1869** Памерла **Габрыэля Альбіна Пузына**, паэтэса, мемуарыстка.

**1903** Нарадзіўся **Мікола Абрамчык** (в. Сычавічы, цяпер Маладзечанскі р-н), грамадска-палітычны дзеяч эміграцыі ў Чэхіі, Францыі і Нямеччыне, прэзідэнт Беларускай Народнай Рэспублікі (1947–1970).

**1945** Паміж СССР і Польшчай падпісана дамова аб змене савецка-польскай мяжы: Польшчы былі перададзены 17 раёнаў Беластоцкай вобласці разам з Беластокам і 3 раёны Брэсцкай вобласці.

**1990** Памёр **Язэп Семяжон (Семяжонаў)**, перакладчык, літаратар. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

## 17 жніўня

**1629** Нарадзіўся **Ян III Сабескі** (Алескі замак, цяпер мяст. Алеска Львоўскай вобл., Украіна), кароль Рэчы Паспалітай і вялікі князь літоўскі (1674–1696).

**1807** У Гродне адбылося ўрачыстае асвячэнне Сафійскага сабора (фарнага касцёла Вітаўта, які пасля пажару 1793 г. быў перабудаваны ў праваслаўны храм).

**1863** У Мінску расстраляны **Іван Жмачынскі (Змачынскі)**, удзельнік нацыянальна-вызваленчага паўстання. Нарадзіўся каля 1831 г. у Мінскім пав.

**1907** Нарадзіўся **Васіль Каваль** (сапр. **Кавалёў Васіль**; в. Сава, цяпер Горацкі р-н), пісьменнік, журналіст.

**2003** Памёр **Павел Гуз**, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі. Пахаваны на беларускай частцы могілак Фолкнер у Мельбурне (Аўстралія).

## 18 жніўня

**1613** Памёр **Іпацій Пацей**, царкоўны ўніяцкі і дзяржаўны дзеяч, пісьменнік-палеміст. Пахаваны ў кафедральным саборы г. Уладзімір Валынскі (Украіна).

**1891** Нарадзіўся **Макар Краўцоў** (сапр. **Касцевіч Макар**; в. Баброўня, цяпер Гродзенскі р-н), паэт, пісьменнік, удзельнік Слуцкага паўстання. Загінуў у зняволенні ў снежні 1939 г.

**1924** У Мінску арыштаваны лідэр антысавецкага падполля **Барыс Савінкаў**, якога чэкісты падманам прывабілі ў СССР.

**1927** У Вільні выйшаў першы нумар газеты "Народ" (выдавалася да ліпеня 1929 г.).

**1942** У савецкім канцлагеры на Калыме памёр **Лявон Більдзюкевіч**, педагог, матэматык, грамадскі дзеяч.

**1947** Нарадзіўся **Мікола Трухан** (мяст. Плешчаніцы Лагойскага р-на), тэатральны рэжысёр, акцёр.

**1962** Адсвяткавана 1100-годдзе Полацка.

**1970** Памёр **Міхась Белы**, дысідэнт, вязень ГУЛАГу.

## 19 жніўня

**1831** Нарадзіўся **Зыгмунт Чаховіч** (маёнт. Сурвілішкі, цяпер Пастаўскі р-н), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1848** У Вільні памёр **Міхаіл Палінскі-Пэлка**, педагог, матэматык.

**1893** Нарадзіўся **Баляслаў Слосканс**, рэлігійна-грамадскі дзеяч беларускага замежжа, Апостальскі візітатар для беларусаў-каталікоў, вязень савецкіх канцлагераў.

**1912** Нарадзіўся **Барыс Мікуліч** (г. Бабруйск), пісьменнік, вязень ГУЛАГу.

**1920** Брэст паўторна захапілі польскія войскі.

**1925** У Вільні выйшаў першы нумар газеты "Жыццё беларуса" (выдавалася да 12 лістапада 1925 г.). Рэдактар-выдавец **Я. Туркевіч** (ад № 8 — **У. Варава**).

**1926** У Навагрудку прайшла дэманстрацыя пратэсту супраць польскай улады.

**1943** У савецкім канцлагеры памёр **Іосіф Воўк-Левановіч**, мовазнавец.

**1991** У Маскве пачаўся бунт (путч) прасавецкіх сіл, які праваліўся 21 жніўня.

**1995** У Мінску адбылася масавая забастоўка работнікаў мінскага метрапалітэна, якая скончылася звальненнямі ўдзельнікаў з работы.

**1998** У Гродне памёр **Валянцін Шаўцоў**, педагог. Пахаваны на могілках каля стан. Аўльс пад Гроднам.

## 20 жніўня

**1506** (ці 19 жніўня) Памёр **Аляксандр Ягелончык**, вялікі князь літоўскі (1492–1506). Пахаваны ў Вільні.

**1919** У Закапанэ (цяпер Польшча) памёр **Іван Луцкевіч**, грамадска-палітычны дзеяч, археолаг, этнограф, публіцыст. У 1991 г. магіла сімвалічна была перанесена на віленскія могілкі Росы.

**1924** На першым з'ездзе беларускіх студэнтаў у Празе створана Аб'яднанне Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў (АБСА).

**1938** Расстраляны **Уладзімір Пракулевіч**, палітычны дзеяч, адзін з кіраўнікоў Слуцкага паўстання. Нарадзіўся ў в. Красналукі, цяпер Чашніцкі р-н (1887).

**1981** Памёр **Мікола Хведаровіч**, паэт, празаік, перакладчык, вязень ГУЛАГу. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**1991** У Фларыдзе (ЗША) памёр **Баляслаў Грабінскі**, дзеяч нацыянальнага руху, дзеяч эміграцыі ў ЗША. Нарадзіўся ў в. Урачыншчына на Сакольшчыне (цяпер Падляскае ваяв., Польша).

## 21 жніўня

**1860** Памёр **Канут Русецкі**, мастак, педагог, які працаваў на Беларусі. Нарадзіўся ў в. Сцебякай, цяпер Літва (1801).

**2004** У Афінах брэстчанка **Юлія Несцярэнка** (дзяв. **Барцэвіч**) стала алімпійскай чэмпіёнкай па бегу на 100 метраў.

## 22 жніўня

**1861** Нарадзіўся **Ігнат Буйніцкі** (в. Палевачы, цяпер Глыбоцкі р-н), акцёр, рэжысёр, пачынальнік беларускага нацыянальнага тэатра.

**1898** Памёр **Альгерд Абуховіч**, пісьменнік, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Пахаваны ў Слуцку.

**1978** Памёр **Піліп Пестрак**, пісьменнік, актывіст Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**1988** Памёр **Віталь Вольскі** (сапр. **Вольскі-Зэйдэль**), пісьменнік, літаратуразнавец. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

## 23 жніўня

**1430** Палякі сарвалі каранацыю вялікага князя літоўскага **Вітаўта**.

**1847** У Друскеніках (цяпер Літва) памёр **Ян Чачот**, асветнік, паэт, фальклярыст, філамат. Пахаваны ў Ротніцы паблізу Друскенікаў.

**1893** У Налэнчове (цяпер Польшча) памёр **Міхаіл Андрыёлі**, мастак, ілюстратар, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1917** У Таліне (Эстонія) нарадзіўся **Пімен Панчанка**, народны паэт Беларусі.

**1955** Памёр **Іван Краскоўскі**, грамадска-культурны дзеяч, педагог.

**1978** Памёр **Алег Караваеў**, барэц грэка-рымскага стылю, алімпійскі чэмпіён (1960).

**1987** Памёр **Міхась Стральцоў**, пісьменнік, крытык, перакладчык. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

## 24 жніўня

**1898** Нарадзіўся **Сцяпан Журык** (в. Крупка, цяпер Пухавіцкі р-н), дзеяч беларускага студэнцкага руху, вучоны-заолаг.

**1906** Нарадзіўся **Юльян Саковіч** (фальв. Баўдыры, цяпер Смаргонскі р-н), дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, актывіст Таварыства Беларускай Школы і Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі, Беларускай Народнай Самапомачы, сябар ЦК Беларускай Незалежніцкай Партыі.

**1918** У Вільні створана культурна-асветная арганізацыя "Сувязь культурна-нацыянальнага адраджэння беларускага народа" (дзейнічала ў 1918–1919 гг.).

**1928** Нарадзіўся **Янка Рամаноўскі** (Мінск), мастак.

**1979** У Свіслачы адкрыўся раённы гісторыка-краязнаўчы музей.

**1986** У Гродне прайшоў першы Дзень народнага майстра.

## 25 жніўня

**1655** Маскоўскія вайскоўцы разрабавалі віленскі касцёл Святога Міхала, у якім быў пахаваны **Леў Сапега**.

**1919** У Мінску выйшаў першы нумар газеты "Звон" (выдавалася да 19 кастрычніка 1919 г., яе пераемніцай стала газета "Беларусь").

**1932** Нарадзіўся **Пятрусь Макаль** (в. Крушыняны, цяпер Сакольскі пав. Падляскага ваяв, Польшча), літаратар.

**1945** Нарадзіўся **Валерый Слюнчанка** (г. Старадуб, цяпер Бранская вобл., Расія), гісторык архітэктуры.

**1948** У Стакгольме на сходзе беларусаў створана Беларуская Грамада ў Скандынавіі.

**1991** Вярхоўны Савет БССР надаў "Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР" канстытуцыйны статус і прыпыніў дзейнасць Камуністычнай Партыі Беларусі.

**1991** У Чыкага памёр **Вацлаў Пануцэвіч** (да эміграцыі **Папуцэвіч**), грамадскі дзеяч, гісторык, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Нарадзіўся ў 1911 г. на Гродзеншчыне.

## 26 жніўня

**1861** У Гродне прайшла рэлігійна-палітычная маніфестацыя на чале з ксяндзом **Юзафам Маеўскім** супраць расійскай акупацыйнай палітыкі.

**1880** Нарадзіўся **Гіём Апалінэр** (**Вільгельм Кастравіцкі**), французскі паэт беларускага паходжання.

**1933** Выйшла пастанова Савета Народных Камісараў БССР “Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу”, скіраваная на знішчэнне адметнасці беларускай мовы.

**1991** Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі **Мікалай Дзямянцей** падаў у адстаўку. Камуністы рэдакцыі цэнтральнай газеты “Звязда” у поўным складзе выйшлі з Кампартыі. Выдавецтва ЦК КПБ пераўтворана ў “Беларускі Дом друку”.

**1994** У Мінску памёр **Сяргей Новік-Пяюн**, паэт і пісьменнік. Пахаваны ў в. Лявонавічы Нясвіжскага р-на.

**2001** Памёр **Валерый Маслюк**, тэатральны рэжысёр.

## 27 жніўня

**1906** Нарадзіўся **Сяргей Новік-Пяюн** (в. Лявонавічы, цяпер Нясвіжскі р-н), паэт і празаік.

**1922** Нарадзіўся **Герман Бокун** (в. Ясень, цяпер Уздзенскі р-н), адзін з заснавальнікаў беларускай фехтавальнай школы.

**1937** Расстраляны беларускія археолагі **Аляксандр Каваленя**, **Аляксандр Ляўданскі**, **Сяргей Дубінскі**, **Антон Рынейскі**.

## 28 жніўня

**1640** Памёр **Рафал (Мікалай) Корсак**, уніяцкі царкоўны дзеяч. Нарадзіўся каля 1595 г.

**1744** Памёр **Васіль Вашчыла**, кіраўнік узброенага сялянскага паўстання ў Крычаўскім старостве ў 1740-х гг. Нарадзіўся ў 1690 г.

**1772** Нарадзіўся **Францішак Сапега**, удзельнік паўстання 1794 г., уладальнік тэатра ў Дзярэчыне.

**1874** Нарадзіўся **Аляксандр Уласаў** (г. Вілейка), грамадска-культурны дзеяч, выдавец, публіцыст.

**1915** Нарадзіўся **Часлаў Найдзюк** (в. Бойдаты, цяпер Ваўкавыскі р-н), грамадскі дзеяч, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1934** Нарадзіўся **Васіль Мельяновіч** (в. Азярніца, цяпер Лунінецкі р-н), палітык, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1950** У савецкім канцлагеры Караганды загінуў **Адам Шабоцька** (альбо **Чабоцька**), удзельнік падпольнага Саюза Вызвалення Беларусі. Нарадзіўся ў в. Католышы, цяпер Навагрудскі р-н (1923).

**1994** У Беларусі ўпершыню пачалося святкаванне Дня беларускай пісьменнасці і друку. Мерапрыемствы доўжыліся ад 28 жніўня да 4 верасня і завяршыліся ў Полацку.

**2004** У Празе пачалася Першая сустрэча беларусаў Еўропы (доўжылася два дні).

## 29 чэрвеня

**1756** Нарадзіўся **Ян Снядэцкі** (мяст. Жнін, цяпер Познаньскае ваяв., Польшча), астраном, матэматык, філосаф, прафесар Віленскага універсітэта.

**1898** Нарадзіўся **Аляксандр Немцаў** (г. Гомель), краязнавец, археолаг, этнограф. Расстраляны савецкімі ўладамі (сакавік 1938 г.).

## 30 чэрвеня

**1579** Войска Рэчы Паспалітай на чале з каралём **Стэфанам Баторыем** пасля 18-дзённай аблогі вызваліла Полацк ад маскоўскіх войскаў.

**1804** Нарадзіўся **Аляксандр Ходзька** (мяст. Крывічы, цяпер Мядзельскі р-н), паэт, фальклярыст, усходазнавец.

**1855** Памёр **Юльян Корсак**, польскі паэт, перакладчык.

**1915** Нарадзіўся **Іван Хомчык** (в. Глоўсевічы, цяпер Слонімскі р-н), удзельнік патрыятычнага падполля на Слонімшчыне ў 1946–1947 гг.

**1919** Створана Мінская беларуская школьная рада — культурна-асветная ўстанова (дзейнічала ў 1919–1920 гг.).

**1929** Памёр ад тыфу **Паўлюк Трус**, паэт. Пахаваны на Вайсковых могілках у Мінску.

## 31 чэрвеня

**1449** Падпісана пагадненне паміж вялікім князем ВКЛ **Казімірам IV** і вялікім князем маскоўскім **Васілём II Цёмным**, вынікам якога стаў працяглы перыяд мірнага развіцця Вялікага княства Літоўскага (да канца XV ст.).

**1559** Лівонскі ордэн перайшоў пад пратэктарат Вялікага княства Літоўскага.

**1768** Нарадзіўся **Раймонд Корсак** (в. Жукоўшчына, цяпер Дзятлаўскі р-н), паэт, удзельнік паўстання 1794 г.

**1835** Памёр **Людвік Міхаіл Пац**, вайсковы дзеяч, удзельнік паўстання 1830–1831 гг.

**1838**(?) Нарадзіўся **Андрэй Патабня** (сяло Перакопаўка, цяпер Сумская вобл., Украіна), удзельнік вызваленчага паўстання 1863–1864 гг.

**1931** У Чорным моры загінуў **Арсен Канчэўскі**, дзеяч Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі і Таварыства Беларускай Школы.

**1996** Памёр **Пятрусь Макаль**, літаратар.

**1997** У Іванаве (Брэсцкая вобл.) устаноўлены помнік **Напалеону Орду**.



# ВЕРАСЕНЬ

## 1 верасня

Сусветны дзень міру

**1431** Падпісана перамір'е Вялікага княства Літоўскага з Каралеўствам Польскім, паводле якога апошняе прызнала **Свідрыгайлу** вялікім князем і уладаром усіх зямель княства.

**1432** У Вялікім княстве Літоўскім адбыўся дзяржаўны пераварот, у выніку якога вялікім князем абвешчаны **Жыгімонт Кейстутавіч**.

**1743** Нарадзіўся **Караль Жэра** (в. Тварогі Выпыхі, цяпер Семятыцкі пав. Падляскага ваяв., Польшча), беларускі і польскі празаік, педагог. Памёр пасля 1798 г.

**1835** Нарадзіўся **Юзаф Каліноўскі** (г. Вільня), каталіцкі дзеяч, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1853** Нарадзіўся **Міхал Федароўскі** (Варшава), фальклярыст, этнограф, археолаг, калекцыянер.

**1863** Каля Барунаў (цяпер Ашмянскі р-н) адбыўся бой паміж паўстанцамі і расійскім войскам.

**1915** Нарадзіўся **Масей Сяднёў** (в. Мокрае, цяпер Касцюковіцкі р-н), літаратар, вязень савецкага канцлагера, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1928** У Вільні выйшаў першы нумар царкоўна-грамадскага часопіса "Беларуская зарніца" (выходзіў да 1 траўня 1929 г.). Рэдактар-выдавец **Аляксандр Коўш**.

**1928** Нарадзіўся **Расціслаў Лапіцкі** (в. Касута, цяпер Вілейскі р-н), арганізатар і кіраўнік антыкамуністычнага падпольнага вучнёўскага руху на Мядзельшчыне і Смаргоншчыне ў 1948–1950 гг. Расстраляны саветамі 28 кастрычніка 1950(?) г.

**1938** Расстраляны **Андрэй Бараноўскі**, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху. Нарадзіўся ў засц. Вялікія Машыцы, цяпер Слуцкі р-н (1895).

**1939** Памёр **Язэп Горыд**, графік, жывапісец.

**1990** У Мінску адкрылася першая гімназія імя **Францыска Скарыны**.

**1991** У Ракуцёўшчыне Маладзечанскага р-на адбылося музычна-паэтычнае святкаванне 100-х угодкаў са дня нараджэння **Максіма Багдановіча**.

**2001** У Маладзечне ўстаноўлены помнік **Міхалу Клеафасу Агінскаму**.



Пячатка Льва Сапегі

## 2 верасня

**1814** Памёр **Жан Эмануіл Жылібер**, французскі прыродазнавец, вучоны, які працаваў у Гродне і Вільні.

**1934** Памёр **Мікалай Ільяшэвіч**, гісторык, географ, педагог. Нарадзіўся ў Пружанах (1903).

**1948** У Лювене (Бельгія) утворана Згуртаванне Беларускіх Ветэранаў. Старшыня **Барыс Рагуля**.

**1991** У Маладзечне памёр **Арнольд Чарнушэвіч**, фехтавальшчык-спартсмен і трэнер, бронзавы прызёр алімпійскіх гульняў (1960).

**1998** Памёр **Ян Матусевіч**, уніяцкі святар, дэкан Беларускай грэка-каталіцкай царквы. Пахаваны на Кальварыйскіх могілках у Мінску.

**1998** Памёр **Мікола Гайдук**, пісьменнік, публіцыст з Беласточчыны.

## 3 верасня

**1731** Нарадзіўся **Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч** (в. Занкі, цяпер Свіслацкі р-н), вучоны, царкоўны дзеяч, літаратар.

**1894** Нарадзіўся **Уладзімір Хлябцэвіч** (мяст. Жыровічы, цяпер Слонімскі р-н), удзельнік грамадска-літаратурнага руху пачатку XX ст.

**1909** У Гродне заснаваны гурток беларускай моладзі.

**1919** У Вільні выйшаў першы нумар газеты “Незалежная Беларусь”, орган Віленскага Белнацкама (выдавалася да 10 лістапада 1919 г.). Рэдактары **А. Карабач**, **К. Мядзёлка**.

**1927** Нарадзіўся **Алесь Адамовіч** (в. Канюхі, цяпер Капыльскі р-н), пісьменнік, грамадскі дзеяч.

**1960** Памёр **Міхась Васілёк** (сапр. **Касцевіч**), паэт, актывіст Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, Таварыства Беларускай Школы. Пахаваны на старых праваслаўных могілках у Гродне.

**1978** У Рыме памёр **Пётр Татарыновіч**, святар, грамадска-культурны дзеяч, літаратар, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Італіі і Ватыкане.

**1980** Памёр **Мікола Дучыц**, мастак.

**1990** Памёр **Міхась Дубянецкі**, грамадскі дзеяч, кнігавыдавец, публіцыст, перакладчык. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

**1991** Мінскі гарсавет прыняў пастанову пра неабходнасць вяртання сталіцы краіны яе гістарычнай назвы — Менск.

## 4 верасня

**1794** Каля мястэчка Любань адбыўся бой паміж паўстанцамі **Стафана Грабоўскага** і расійскім войскам

**1829** Нарадзіўся **Ігнат Доўнар** (в. Таўкачэвічы, цяпер Уздзенскі р-н), удзельнік вызваленчага руху, музыкант, фатограф. Памёр у 1865 г.

**1831** Памёр **Юзаф Пешка**, жывапісец, творчасць якога звязана з Беларуссю.

**1884** Нарадзіўся **Хведар Імшэнік**, педагог, літаратуразнавец.

**1893** Нарадзіўся **Юзюк Фарботка** (в. Налібокі, цяпер Стаўбцоўскі р-н), паэт, грамадска-культурны дзеяч, заолаг.

**1917** У Слуцку пачаліся заняткі ў першай беларускай гімназіі. Заснавальнік і першы дырэктар **Радаслаў Астроўскі**.

**1992** У Таронта памёр **Сяргей Хмара** (сапр. **Сіняк**), пісьменнік, паэт, журналіст, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Канадзе.

**1997** Памёр **Міхась Раманюк**, мастацтвазнавец, мастак, этнограф.

## 5 верасня

**1840** Нарадзіўся **Зыгмунт Мінейка** (в. Балванішкі, цяпер в. Зялёны Бор Ашмянскага р-на), удзельнік паўстання 1863–1864 гг., беларускі і грэчаскі грамадскі дзеяч, этнограф, калекцыянер, мемуарыст.

**1901** Нарадзіўся **Арсен Канчэўскі** (г. Вільня), дзеяч Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі і Таварыства Беларускай Школы.

**1901** Нарадзіўся **Віталь Вольскі** (сапр. **Вольскі-Зэйдэль**; Пецярбург), пісьменнік, літаратуразнавец.

**1917** Нарадзіўся **Язэп Сажыч** (в. Гарадэчна, цяпер Навагрудскі р-н), дзеяч эміграцыі ў ЗША, старшыня рады Беларускай Народнай Рэспублікі (1982–1997).

**1937** Расстраляны **Анатоль Дзяркач** (сапр. **Анатоль Зіміёнка**), паэт, сатырык, гумарыст.

**1952** У перастрэлцы ў ноч на 5 верасня каля в. Самалі Маладзечанскага р-на супрацоўнікамі КДБ забіты **Іван Будкевіч** і **Міхась Петрусевіч**, удзельнікі групы **Янкі Філістовіча**.

**1996** У Вярхоўным Савеце Беларусі распачалася працэдура імпічменту **Аляксандру Лукашэнку**, якая пазней была сарвана расійскімі “міратворцамі”.

## 6 верасня

**1764** Каралём Рэчы Паспалітай і вялікім князем ВКЛ абраны **Станіслаў Аўгуст Панятоўскі**.

**1903** Нарадзіўся **Мікалай Дварэцкі** (мяст. Іказнь, цяпер Браслаўскі р-н), грамадскі дзеяч, паэт, які потым жыў у Польшчы.

**1905** Нарадзіўся **Віктар Казлоўскі** (в. Мрочкі, цяпер Уздзенскі р-н), паэт.

**1995** Памёр **Павел Масленікаў**, жывапісец, тэатральны мастак, педагог.

**1997** У Мінску прайшоў устаноўчы сейм моладзевага аб’яднання Малады фронт.

## 7 верасня

Дзень беларускага пісьменства і друку

**1714** Нарадзіўся **Міхаіл Карыцкі** (в. Дзітрыкі, цяпер Лідскі р-н), паэт, грамадскі дзеяч, педагог.

**1832** Нарадзіўся **Людвік Нарбут** (маёнт. Шаўры, цяпер Воранаўскі р-н), адзін з кіраўнікоў вызваленчага паўстання 1863–1864 гг.

**1856** Памёр **Цімафей Ліпінскі**, гісторык, географ, філолаг, калекцыянер, краязнавец.

**1956** У Маскве памёр **Ота Шміт**, палярны даследчык, матэматык, астраном, геафізік, географ, які нарадзіўся ў Магілёве.

**1990** У Полацку адкрыўся музей беларускага кнігадруку.

**2004** Памёр **Алесь Асташонак**, пісьменнік, перакладчык.

## 8 верасня

Міжнародны дзень салідарнасці журналістаў

**1380** Адбылася Кулікоўская бітва, у якой узялі ўдзел беларускія дружыны.

**1514** Адбылася бітва пад Оршай, у якой войскі Вялікага княства Літоўскга на чале з **Канстанцінам Астрожскім** нанеслі паражэнне маскоўскаму войску. Дзень беларускай вайсковай славы.

**1708** Па загаду расійскага цара **Пятра I** спалены Магілёў.

**1791** Нарадзіўся **Людвік Сабалеўскі** (г. Вільня), філолаг, бібліёграф.

**1873** Памёр **Яўстах Тышкевіч**, гісторык, краязнавец, адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі.

**1915** Брэст акупаваны нямецкімі кайзераўскімі войскамі.

**1955** (ці 8 лістапада) Памёр **Уладзіслаў Паўлюкоўскі**, паэт, празаік, этнограф, мастак, вязень савецкіх канцлагераў. Пахаваны на могілках Росы ў Вільні.

**1973** Перакрыта рака Вялля, створана самае вялікае ў Беларусі штучнае водасховішча — Вілейскае.

## 9 верасня

Сусветны дзень прыгажосці

**1939** Нарадзіўся **Уладзімір Шурпа** (в. Саволеўка, цяпер Гродзенскі р-н), паэт, журналіст, педагог.

**1951** Пад Маладзечнам дэсантаваўся **Янка Філістовіч**, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху. Праз год быў схоплены і расстраляны ў 1953 г.

**1966** У г. Влацлавэк (Польшча) памёр **Язэп Дашута**, каталіцкі святармарыянін. Пахаваны ў Варшаве.

**2001** Адбыліся прэзідэнцкія “выбары”, у выніку якіх **Аляксандр Лукашэнка** застаўся пры ўладзе. Апазіцыя не прызнала вынікаў выбараў справядлівымі і законнымі.

## 10 верасня

**1893** Нарадзіўся **Аляксандр Ляўданскі** (в. Юр’ева, цяпер Смалявіцкі р-н), археолаг.

**1916** У в. Замосце памёр **Аляксандр Ельскі**, гісторык, этнограф, краязнавец, пісьменнік, перакладчык, публіцыст. Пахаваны ў в. Дудзічы, цяпер Пухавіцкі р-н.

**1937** У Комі АССР расстраляны **Язэп Мамонька**, палітычны дзеяч.

**1990** У Мінску прайшла ўстаноўчая канферэнцыя Згуртавання беларусаў свету “Бацькаўшчына”.

**1990** Памёр **Міхась Саўка**, беларускі і бельгійскі мастак-рэстаўратар, мастацтвазнавец, археолаг.

## 11 верасня

**1841** Нарадзіўся **Гіяцынт Альхімовіч** (в. Дэмбрава, цяпер Шчучынскі р-н), мастак, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Памёр пасля 1897 г. у Францыі(?).

**1841** У в. Коркіна (цяпер Іркуцкая губ., Расія) на пасяленні пасля катаргі памёр **Міхаіл Рукевіч**, удзельнік вызваленчага руху, філамат.

**1865** Нарадзіўся **Яніс Райніс** (сапр. **Пліекшанс**; хут. Варславаны, цяпер Латвія), латышскі грамадскі дзеяч, паэт, драматург, перакладчык. Абараняў інтарэсы беларусаў Латвіі, спрыяў беларускай адукацыі і культуры.

**1868** Памёр **Рамуальд Зянькевіч**, фальклярыст, этнограф, археолаг, педагог.

**1938** У Навагрудку адкрыўся Дом-музей **Адама Міцкевіча**.

**1992** У Навагрудку адкрыўся гісторыка-краязнаўчы музей (заснаваны 29 ліпеня 1987 г.).

## 12 верасня

**1612** Памёр **Пётр Скарга**, царкоўны і палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага. Нарадзіўся ў Груйцы (цяпер Мазавецкае ваяв., Польшча) у лютым 1536 г.

**1683** Пераможная бітва саюзнага войска (баварцы, саксонцы, аўстрыякі, конныя палкі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага — разам 65 тысяч) над турэцкім войскам (200 тысяч) пад Венай.

**1733** Каралём Рэчы Паспалітай і вялікім князем ВКЛ другі раз абраны **Станіслаў Ляшчынскі**.

**1929** Памёр **Яніс Райніс** (сапр. **Пліекшанс**), латышскі грамадскі дзеяч, паэт, драматург, перакладчык. Абараняў інтарэсы беларусаў Латвіі, спрыяў беларускай адукацыі і культуры.

**1933** Памёр **Антон Камінскі**, графік і жывапісец.

**1945** Нарадзіўся **Рыгор Семашкевіч** (в. Дамашы Маладзечанскага р-на), паэт, празаік, літаратуразнавец, крытык.

## 13 верасня

**1996** Памёр **Эрнст Ляўкоў**, геолаг, краязнавец.

## 14 верасня

**1408** Паміж вялікім князем ВКЛ **Вітаўтам** і вялікім князем маскоўскім **Васілём I** заключана пагадненне, якое завяршыла вайну 1406–1408 гг.

**1884** Нарадзіўся **Фабіян Абрантовіч** (г. Навагрудак ці засц. Вераскоўшчына), уніяцкі духоўнік, грамадска-культурны дзеяч, філосаф, рэлігійны педагог.

**1906** У Вільні выйшаў першы нумар першай легальнай беларускай газеты "Наша доля" (выходзіла да 14 снежня 1906 г.).

**1923** Нарадзіўся **Янка Баран**, грамадскі дзеяч эміграцыі ў Канадзе.

**1937** У г. Ірбіт (цяпер Свярдлоўская вобл., Расія) расстраляны **Сяргей Астрэйка**, паэт, мовазнавец.

**1964** У Мінску памёр **Язэп Пушча** (сапр. **Плашчынскі**) паэт. Пахаваны ў в. Каралішчавічы Мінскага р-на.

**2000** У г. Сомэрсэт (Нью-Джэрсі) памерла **Галіна Русак** (дзяв. **Родзька**), мастачка, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**2000** У шпіталі пад Парыжам памёр **Ежы Гедройц**, грамадскі дзеяч, рэдактар польскага часопіса "Культура", які актыўна спрыяў развіццю беларускай навукі і культуры.

## 15 верасня

**1648** Ля в. Гершоны (цяпер Берасцейскі р-н) забіты **Афанасій Філіповіч**, палітычна-царкоўны дзеяч, пісьменнік-публіцыст. У жніўні 1649 г. кананізаваны як праваслаўны святы. Нарадзіўся на Берасцейшчыне ў 1597 г.

**1830** У Гродне адкрылася публічная бібліятэка (цяпер абласная бібліятэка імя **Яўхіма Карскага**).

**1845** У маёнт. Юзэфаў (цяпер Люблінскае ваяв., Польшча) памёр **Францішак Ксаверы Несялоўскі**, удзельнік паўстанняў 1794 і 1830–1831 гг.

**1855** Нарадзіўся **Канстанцін Аляксееўскі** (Віленская губ.), дзеяч нацыянальнага руху. Памёр пасля 1918 г.

**1862** Памёр **Уладзіслаў Сыракомля** (сапр. **Людвік Кандратовіч**), беларускі і польскі паэт-гуманіст, пісьменнік, публіцыст. Пахаваны на могілках Росы ў Вільні.

**1913** Нарадзіўся **Рыгор Зыбайла** (в. Ёлка, цяпер Зэльвенскі р-н), вайскова-палітычны дзеяч, старшыня Слонімскай акруговай Беларускай Народнай Самапомачы ў 1941–1942 гг.

**1918** Нарадзіўся **Уладзіслаў Салавей**, рэлігійны дзеяч замежжа, душпастыр беларускіх каталікоў і грэка-каталікоў у Нямеччыне. Памёр у 1974 г.

**1919** У Мінску на базе 3-й мінскай павятовай вучэльні створана беларуская гімназія.

**1965** У в. Скурац (Седлецкі пав. Мазавецкага ваяв., Польшча) памёр **Казімір Смулька**, каталіцкі душпастар ордэна марыянаў, манах.

**1997** Памёр **Рудольф Пастухоў**, пісьменнік, грамадскі дзеяч.

**2002** У Бяліцы Лідскага р-на ўстаноўлены памятны крыж і мемарыяльная пліта ў гонар бітвы 1659 г., калі шляхта Лідскага пав. дала бой 30-тысячнаму маскоўскаму войску (праз месяц памятныя знакі былі знішчаны ўладай).

## 16 верасня

**1406** Памёр **Кіпрыян**, рэлігійна-царкоўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага. Пахаваны ва Успенскім саборы ў Маскве. У 1472 г. абвешчаны святым. Нарадзіўся каля 1330 г.

**1668** Кароль Рэчы Паспалітай і вялікі князь літоўскі **Ян Казімір** адрокся ад трона.

**1825** Памёр **Францішак Карпінскі**, польскі паэт-сентыменталіст, асветнік. Некаторы час жыў у Беларусі.

**1859** Нарадзіўся **Браніслаў Эпімах-Шыпіла** (фальв. Судзіловічы, цяпер в. Будзькаўшчына Полацкага р-на), дзеяч культуры, выдавец, мовазнавец, літаратуразнавец.

**1870** Нарадзіўся **Язэп Васілевіч** (мяст. Крывічы, цяпер Мядзельскі р-н), дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, археолаг, педагог. Рэпрэсіраваны ў 1930 г., забіты ў 1934(?) г.

**1920** У Навагрудку заснаваны дом-музей **Адама Міцкевіча**.

**1938** Расстраляны **Іосіф Мацюкевіч**, мовазнавец.

**1940** Памёр **Сяргей Паўловіч**, грамадска-культурны і рэлігійны дзеяч, педагог.

## 17 верасня

**1590** Права на герб атрымаў г. Ліда.

**1774** Нарадзіўся **Тадэвуш Тышкевіч**, дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага княства Літоўскага, удзельнік паўстанняў 1794 і 1830–1831 гг.

**1794** Ля в. Крупчыцы (цяпер Жабінкаўскі р-н) адбылася бітва паміж паўстанцкімі і расійскімі войскамі.

**1860** Нарадзіўся **Кандрат Лейка** (в. Збочна, цяпер Слонімскі р-н), пісьменнік, педагог.

**1891** Нарадзіўся **Антон Баліцкі** (в. Балічы, цяпер Гродзенскі р-н), грамадска-культурны дзеяч.

**1898** Нарадзіўся **Павел Крынчык** (в. Едначы, цяпер Слонімскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, актывіст Таварыства Беларускай Школы.

**1912** Нарадзіўся **Максім Танк** (сапр. **Яўген Скурко**; в. Пількаўшчына, цяпер Мядзельскі р-н), паэт, грамадскі дзеяч, акадэмік.

**1922** Нарадзіўся **Уладзімір Калеснік** (в. Сіняўская Слабада, цяпер Карэліцкі р-н), літаратуразнавец, крытык, празаік.

**1939** Савецкія войскі перайшлі мяжу з Польшчай і да 25 верасня занялі тэрыторыю Заходняй Беларусі разам з Вільняй і Беластокам. У выніку адбылося далучэнне Заходняй Беларусі да БССР.

**1949** Нарадзіўся **Генадзь Карпенка** (Мінск), грамадска-палітычны дзеяч, вучоны.

## 18 верасня

**1807** Памёр **Францішак Смуглевіч**, жывапісец, графік, педагог, які працаваў у Беларусі.

**1991** Старшынёй Вярхоўнага Савета Беларусі абраны **Станіслаў Шушкевіч**.

**1992** Памёр **Ян Скрыган**, пісьменнік, перакладчык, вязень ГУЛАГу. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

**1993** У Астравецкім раёне ўрачыста адсвяткаваны 100-я ўгодкі са дня нараджэння паэтаў **Казіміра Сваяка** і **Янкі Быліны**.

**1995** Загадам уладаў Беларусі збіты мірны замежны паветраны шар — загінулі два чалавекі.

**1998** У Мінску памёр **Віктар Шымук**, пісьменнік, перакладчык.

## 19 верасня

**1797** Нарадзіўся **Януар Сухадольскі** (г Гродна), жывапісец-баталіст, удзельнік паўстання 1830–1831 гг.

**1905** Нарадзіўся **Янка Туміловіч** (в. Сяліба ці в. Жалін, цяпер Бярэзінскі р-н), настаўнік, паэт.

**1921** У мяст. Здалбунаў (цяпер Ровенская вобл., Украіна) памёр **Кандрат Лейка**, пісьменнік, педагог.

**1938** Памёр **Браніслаў Туронак**, культурна-грамадскі дзеяч, публіцыст.

**1967** У Полацку заснаваны гісторыка-культурны музей-запаведнік.

**1991** Вярхоўны Савет Беларусі прыняў пастанову аб змене назвы Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі на Рэспубліку Беларусь. Дзяржаўным гербам была зацверджана "Пагоня", а дзяржаўным сцягам — бела-чырвона-белы сцяг.

## 20 верасня

**1752** Нарадзіўся **Геранім Страйноўскі** (в. Хадачкава, цяпер Крамянецкі пав. Цярнопальскай вобл., Украіна), асветнік, правазнавец, рэлігійны дзеяч Рэчы Паспалітай.

**1903** Нарадзілася **Наталля Арсеннева** (г. Баку), паэтэса, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1914** Нарадзіўся **Базыль Камароўскі** (Навагрудчына), пісьменнік, грамадскі дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Канадзе.

**1929** У Слоніме адкрыўся краязнаўчы музей.

**1939** Пасля падпалу дома польскімі правакатарамі загінуў **Аляксандр Бертэль**, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, сябар Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі. Нарадзіўся ў в. Вялікія Кавалічы, цяпер Гродзенскі р-н (1902).

**1945** У Мінску адкрыўся літаратурны музей **Янкі Купалы**.

**1950** У Нью-Йорку выйшаў першы нумар газеты "Беларус", выдавец Беларуска-амерыканскае задзіночанне. Першы рэдактар **Леанід Галяк**.

**2001** З нагоды пашырэння мінскай кальцавой шашы ўлада пачала нішчыць урочышча Курапаты. Пасля гэтага пачаўся рух у абарону гэтай мясціны.

## 21 верасня

**1610** Уваход у Маскву войска Рэчы Паспалітай на чале з **Гансеўскім** пасля абвяшчэння баярамі маскоўскім царом каралевіча **Уладзіслава Вазы**.

**1909** Нарадзіўся **Дзмітрый Касмовіч** (г. Нясвіж), дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху і эміграцыі ў Бельгіі і Нямеччыне.

**1918** Нарадзіўся **Фёдар Янкоўскі** (в. Клетнае, цяпер Глускі р-н), мовазнавец.

**1975** Памёр **Міхась Лынькоў**, празаік, літаратуразнавец, акадэмік. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

## 22 верасня

**1850** Памёр **Францішак Дзержынскі**, рэлігійны дзеяч, адзін з пачынальнікаў вышэйшай адукацыйнай сістэмы ў ЗША.

**1880** Памёр **Уладзіслаў Сымановіч**, лекар, удзельнік паўстання 1863–1864 гг. Нарадзіўся ў Вільні каля 1831 г.

**1917** Памёр **Ігнат Буйніцкі**, акцёр, рэжысёр, пачынальнік беларускага нацыянальнага тэатра.

**1939** Савецкая армія ўвайшла ў Брэст.

**1972** У Стаўбцоўскім раёне заснаваны Коласаўскі заказнік.

**1975** Памёр **Павел Крынчык**, грамадска-культурны дзеяч, актывіст Таварыства Беларускай Школы.

## 23 верасня

**1771** Каля в. Сталавічы (цяпер Баранавіцкі р-н) адбылася бітва паміж войскам Вялікага княства Літоўскага на чале з вялікім гетманам **Міхалам Казімірам Агінскім** і расійскім войскам на чале з **Аляксандрам Суворавым**, якая скончылася перамогай апошняга.

**1833** Нарадзіўся **Фелікс Віславух** (Рэчыцкі пав.), палявы камандзір паўстання 1863–1864 гг. Памёр пасля 1869 г.

**1902** У маёнт. Амнішава (цяпер Лагойскі р-н) памёр **Эдмунд Вярыга**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Нарадзіўся на Віленшчыне каля 1840 г.

**1904** У Гродне адбылося выступленне навучэнцаў мужчынскай гімназіі супраць адкрыцця расійскай уладай у Вільні помніка **Кацярыне II**.

**1910** Нарадзіўся **Юльян Сергіевіч** (в. Юраўшчына, цяпер Маладзечанскі р-н), паэт, мастак.

**1935** У савецкай турме ва Уфе (Расія) памёр **Лявон Заяц**, палітычны дзеяч. Нарадзіўся ў в. Даўгінава, цяпер Вілейскі р-н (сакавік 1890 г.).

## 24 верасня

**1534** У маскоўскай турме памёр **Міхаіл Глінскі**, палітычны і вайсковы дзеяч Вялікага княства Літоўскага. Нарадзіўся каля 1470 г.

**1641** Нарадзіўся **Станіслаў Незабітоўскі** (в. Ятра, цяпер Навагрудскі р-н), палітычны, грамадскі дзеяч, мемуарыст. Памёр у Навагрудку (восень 1717 г.).

**1815** Нарадзілася **Габрыэля Альбіна Пузына** (г. Вільня), польская паэтэса, мемуарыстка. Жыла ў Дзевятні (цяпер Смаргонскі р-н).

**1824** Пачалося будаўніцтва Аўгустоўскага канала.

**1893** Нарадзілася **Паўліна Мядзёлка** (мяст. Будслаў, цяпер Мядзельскі р-н), актрыса, мемуарыстка, дзеяч культуры.

**1902** Нарадзіўся **Аляксандр Махноўскі** (г. Дзвінску, цяпер Даўгаўпілс, Латвія), педагог, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1993** Падпісана пагадненне аб вывадзе з Беларусі расійскіх войскаў.

## 25 верасня

**1845** Памёр **Юстын Нарбут**, гісторык, удзельнік паўстання 1794 г., стрыечны брат **Тодара Нарбута**. Пахаваны ў Вільні.

**1875** Нарадзіўся **Сяргей Паўловіч** (в. Асаўцы, цяпер Драгічынскі р-н), грамадска-культурны і рэлігійны дзеяч, педагог.

**1895** Нарадзілася **Ванда Лёсік** (дзяв. **Лявіцкая**; мяст. Радашковічы, цяпер Маладзечанскі р-н), пісьменніца.

**1910** У чыгуначнай катастрофе на станцыі Бяспалаўка (пад Харкавам, цяпер Украіна) загінуў **Канстанцін Валасовіч**, падарожнік, натураліст, геолаг, географ, хімік.

**1913** Нарадзіўся **Сяргей Грахоўскі** (мяст. Нобель, цяпер Зарэчненскі р-н Ровенскай вобл., Украіна), пісьменнік.

**1914** Нарадзіўся **Яўген Смаршчок** (Зэльва), педагог, перакладчык, прафесар, святар Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы, дзеяч эміграцыі ў Бельгіі.

**1921** У Празе пачалася беларуская нацыянальная палітычная нарада (прысутнічала 37 дэлегатаў, доўжылася да 28 верасня).

1951 У савецкім канцлагеры (Комі АССР, цяпер Рэспубліка Комі, Расія) загінуў **Вячаслаў Лаўскі**, грамадска-культурны дзеяч, педагог, адзін з заснавальнікаў беларускага студэнцкага руху.

1965 У г. Гільдэсгайм (Ніжняя Саксонія, Нямеччына) памёр **Міхась Маскалік**, грэка-каталіцкі святар, навуковец.

1996 У Адрыятычным моры каля г. Сабаўдыя (Італія) патануў **Мікола Селяшчук**, мастак.

2004 Памёр **Паўло Андрусішын**, украінска-беларускі дзеяч эміграцыі ў ЗША, бацька **Данчыка**.

## 26 верасня

1629 Падпісаны мір паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй, якім завяршылася вайна 1600–1629 гг.

1890 Нарадзіўся **Іосіф Мацюкевіч** (в. Гернікі, цяпер Дзятлаўскі р-н), мовазнавец.

1924 У Альберціне пад Слонімам айцы-езуіты заснавалі Усходнюю грэка-каталіцкую місію з навіцыятам.

1976 Памерла **Леаніла Чарняўская** (жонка **Максіма Гарэцкага**), перакладчыца, пісьменніца, настаўніца. Пахавана на Паўднёвых могілках у Ленінградзе.

2002 Памёр **Аляксандр Шыдлоўскі**, культурны дзеяч, кампазітар. Пахаваны на могілках на прасп. Касманаўтаў у Гродне.

## 27 верасня

Сусветны дзень турызму

1422 Каля возера Мельна (у сутоках рэк Вісла і Аса, Польшча) падпісаны мір паміж Каралеўствам Польскім з Вялікім княствам Літоўскім і Тэўтонскім ордэнам, які канчаткова завяршыў апошнюю вайну паміж імі.

1533 У Румыніі нарадзіўся **Стафан Баторы**, вялікі князь літоўскі і кароль польскі.

1605 Адбылася Кірхгольмская бітва (цяпер г. Саласпілс, Латвія) паміж войскамі Вялікага княства Літоўскага на чале з **Янам Хадкевічам** і Швецыі, у якой перамагло вялікакняжацкае войска.

1892 Нарадзіўся **Сяргей Баран** (в. Віцькі, цяпер Гродзенскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, педагог. Загінуў у савецкім зняволенні (1937?).

1909 Нарадзіўся **Лукаш Калюга** (сапр. **Кастусь Вашына**; в. Скварцы, цяпер Дзяржынскі р-н), пісьменнік.

1920 Войскі **Станіслава Булак-Балаховіча** занялі Пінск.

1921 У Коўне выйшаў першы нумар газеты "Святазар", орган беларусаў-вайскоўцаў у Літве (выдавалася да 18 красавіка 1922 г.).

1924 Нарадзіўся **Паўло Андрусішын**, украінска-беларускі дзеяч эміграцыі ў ЗША, бацька **Данчыка**.

**1972** У Мюнхене памёр **Сымон Кандыбовіч**, грамадска-палітычны дзеяч.

**1997** У Полацкі Спаса-Ефрасінеўскі манастыр урачыста перанесены вобраз Крыжа Святой **Ефрасінні Полацкай**.

## 28 верасня

**1708** Па загадзе цара **Пятра I** расійскае войска спаліла Віцебскі замак і пасад.

**1828** Нарадзіўся **Вацлаў Пшыбыльскі** (г. Вільня), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг., літаратар.

**1936** Нарадзіўся **Рудольф Пастухоў**, пісьменнік, грамадскі дзеяч.

**1937** У Мінску ці пад Мінскам расстраляны **Уладзіслаў Галубок**, пісьменнік, рэжысёр, акцёр, тэатральны дзеяч, мастак.

**1953** У аўтакатастрофе загінуў **Базыль Камароўскі**, пісьменнік, грамадскі дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Канадзе.

**1989** У Жыровічах аднавіла дзейнасць Мінская праваслаўная духоўная семінарыя.

**1993** Памерла **Галіна Макарава**, актрыса.

## 29 верасня

**1529** Пачаў дзейнічаць І Статут Вялікага княства Літоўскага.

**1794** Нарадзіўся **Ігнат Ходзька**, польскі пісьменнік, мемуарыст. Жыў на тэрыторыі цяперашніх Вілейскага, Смаргонскага раёнаў.

**1794** У Гародню прыбыў **Тадэвуш Касцюшка**, на наступны дзень узнагароджваў паплечнікаў-паўстанцаў.

**1823** Нарадзіўся **Уладзіслаў Сыракомля** (сапр. **Людвік Кандратовіч**; фальв. Смольгава, цяпер Любанькі р-н), беларускі і польскі паэт-гуманіст, пісьменнік, публіцыст.

**1880** Нарадзіўся **Сяргей Сахараў** (г. Полацк), культурны дзеяч, фалькларыст, этнограф, педагог.

**1891** Нарадзіўся **Аркадзь Смоліч** (в. Бацэвічы, цяпер Клічаўскі р-н), нацыянальна-дзяржаўны дзеяч Беларускай Народнай Рэспублікі, вучоны ў галіне эканомікі, сельскай гаспадаркі, географ, картограф.

**1929** Памёр **Ян Тарчэўскі**, грамадскі дзеяч, нашанівец, настаўнік.

**1982** У Нью-Брансвіку (Нью-Джэрсі, ЗША) памёр **Дзмітрый Сямёнаў**, літаратар, грамадскі дзеяч эміграцыі ў ЗША.

## 30 верасня

**1728** (ці 30 кастрычніка) Нарадзіўся **Марцін Пачобут-Адляніцкі** (в. Саламянка, цяпер Гродзенскі р-н), асветнік, астраном, педагог.

**1890** Нарадзіўся **Антон Ляшчэвіч** (в. Абрамаўшчына, цяпер Смаргонскі р-н), рымска-каталіцкі святар-марыянін, блаславёны.

**1891** Нарадзіўся **Ота Шміт** (г. Магілёў), палярны даследчык, матэматык, астраном, геафізік, географ.

**1892** Нарадзілася **Зоська Верас** (сапр. **Людвіка Сівіцкая**, па мужу **Войцікава**; мяст. Мяндзыбаж, цяпер Лятычаўскі р-н Жытомірскай вобл., Украіна), пісьменніца, грамадска-культурны дзеяч.

**1934** У Маскве памёр **Мітрафан Доўнар-Запольскі**, гісторык, эканаміст, этнограф, адзін з заснавальнікаў нацыянальнай гістарыяграфіі.

**1939** У в. Шашэльгішкі (пад Вільняй, цяпер Літва) памёр **Стары Улас** (сапр. **Уладзіслаў Сівы-Сівіцкі**), паэт. Пахаваны ў в. Сужаны (цяпер Літва).

**2005** Памёр **Зміцер Кісель**, грамадскі дзеяч, журналіст. Пахаваны на могілках на праспекце Касманаўтаў у Гродне.



# КАСТРЫЧНІК

## 1 кастрычніка

Міжнародны дзень музыкі

**1888** Нарадзіўся **Лукаш Дзекуць-Малей** (г. Слонім), грамадскі і рэлігійны дзеяч.

**1918** У Мінску адкрылася каталіцкая духоўная семінарыя.

**1921** Па ініцыятыве дзвінскага таварыства “Бацькаўшчына” створаны Беларускі аддзел пры міністэрстве асветы Латвіі — нацыянальна-культурная ўстанова (дзейнічала з перапынкамі да 1934 г.).

**1940** У савецкім канцлагеры (Комі АССР, цяпер Рэспубліка Комі, Расія) загінуў **Сямён Жыткевіч**, грамадска-культурны дзеяч, актывіст Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады і Таварыства Беларускай Школы. Нарадзіўся ў в. Вялікая Кракотка, цяпер Слонімскі р-н (1893).

**1965** У Польшчы памёр **Генрык Бэта**, каталіцкі святар, педагог, пісьменнік.

**1991** Прынята пастанова Вярхоўнага Савета Беларусі аб прызнанні права прыватнай уласнасці на зямлю.



Святы Дзмітрый на медальёне XII ст. з Ваўкавыска

**2003** Памёр **Васіль Кендыш**, грамадскі дзеяч, настаўнік, праваслаўны святар, дзеяч эміграцыі ў ЗША. Пахаваны на могільніку ў Спрынгфілдзе (Масачусетс, ЗША).

## 2 кастрычніка

Міжнародны дзень лекара

**1413** Заключана Гарадзельская унія Вялікага княства Літоўскага з Каралеўствам Польскім, якая надала беларуска-літоўскай шляхце палітычныя правы.

**1800** Памёр **Мацей Радзівіл**, драматург, кампазітар.

**1819** (ці 15 верасня 1818) Нарадзіўся **Аляксандр Незабытоўскі** (в. Смалічы, цяпер Нясвіжскі р-н), беларускі і польскі пісьменнік, філосаф, гісторык.

**1842** Нарадзіўся **Баляслаў Кульчыцкі** (Аўгустоўская губ., цяпер Польшча), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1896** Нарадзіўся **Мікола Дучыц** (мяст. Любча, цяпер Навагрудскі р-н), мастак.

**1920** У Гродне выйшаў першы нумар газеты “Беларуская справа”, орган Цэнтральнага беларускага нацыянальнага камітэта (выдавалася да 7 студзеня 1921 г.).

**1924** Памёр **Аляксей Сапуноў**, гісторык, археограф, краязнавец.

**1930** У Гродне выйшаў першы нумар часопіса “Беларуская думка” (выходзіў да 1932 г.). Рэдактары **А. Лукашык**, **Л. Лукашык**.

**1975** Памёр **Тамаш Падзява**, каталіцкі святар-марыянін, філосаф, тэолаг, публіцыст, рэлігійна-культурны дзеяч, вязень савецкіх канцлагераў. Пахаваны на могілках Сен-Панкрац у Лондане.

**1990** Выйшаў першы нумар газеты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь “Народная газета”.

## 3 кастрычніка

**1615** У Мазыры выбухла паўстанне мяшчан.

**1848** У мяст. Шарашова (цяпер Пружанскі р-н) памёр **Міхаіл Баброўскі**, вучоны-славіст.

**1881** Нарадзіўся **Людамір Рагоўскі** (г. Люблін, цяпер Польшча), польска-беларускі кампазітар і дырыжор.

**1889** У в. Празарокі (цяпер Падляскае ваяв., Польшча) памёр **Міхаіл Пятроўскі**, каталіцкі святар, педагог, грамадска-культурны дзеяч.

**1914** Нарадзіўся **Лявон Случанін** (сапр. **Шпакоўскі Лявонцій**; в. Лучнікі, цяпер Слуцкі р-н), паэт, вязень ГУЛАГу.

**1914** Нарадзіўся **Ян Новак-Езяранскі** (паходзіў з Гродзеншчыны), польскі грамадска-палітычны дзеяч, публіцыст, журналіст, які спрыяў беларускаму нацыянальнаму руху.

**1922** Нарадзіўся **Міхась Наўмовіч** (Навагрудчына), мастак, дзеяч эміграцыі ў Францыі.

**1924** Нарадзіўся **Рыгор Клімовіч** (в. Шляхецкая Ваколіца, цяпер в. Цярэшкавічы Гомельскага р-на), кіраўнік паўстання вязьняў савецкага канцлагера ў Нарыльску ў 1953 г.

**1994** Памёр **Іван Бабіч**, сябар Глыбоцкай групы Саюза Беларускіх патрыётаў, вязень савецкіх турмаў. Пахаваны ў Ваўкавыску. Нарадзіўся ў в. Бабічы, цяпер Глыбоцкі р-н (1930).

## 4 кастрычніка

**1582** У Рэчы Паспалітай уведзены грыгарыянскі каляндар.

**1741** Нарадзіўся **Францішак Карпінскі** (в. Галаскоў, цяпер Івана-Франкоўская вобл., Украіна), паэт-сентыменталіст, асветнік.

**1885** У Фларэнцыі памёр **Антон Залескі**, мастак, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1890** Нарадзіўся **Язэп Гладкі**, грамадскі дзеяч, фалькларыст, этнограф, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1929** Памёр **Пятро Сяўрук**, пісьменнік, актывіст Таварыства Беларускай Школы і Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады. Пахаваны на радзіме ў Скідалі (цяпер Гродзенскі р-н). Нарадзіўся ў 1905 г.

**1976** Памёр **Юльян Сергіевіч**, паэт, мастак. Пахаваны ў в. Ленкаўшчына Маладзечанскага р-на.

**1981** Памёр біскуп **Часлаў Сіповіч**, рэлігійны і грамадскі дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі. Пахаваны на могілках Сен-Панкрац у Лондане.

**1984** У Бельгіі памёр **Яўген Смаршчок**, педагог, перакладчык, прафесар, святар Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы, дзеяч эміграцыі ў Бельгіі.

## 5 кастрычніка

**1458** Нарадзіўся святы **Казімір**, сын вялікага князя літоўскага **Казіміра IV Ягелончыка**, патрон Гродзенскага біскупства.

**1655** Маскоўскія стральцы захапілі і спалілі Пінск.

**1763** Памёр **Аўгуст III**, кароль Рэчы Паспалітай, вялікі князь літоўскі (1733–1763).

**1872** У в. Малі (цяпер Астравецкі р-н) памёр **Іосіф Гашкевіч**, дыпламат, мовазнавец, даследчык Японіі і Кітая, натураліст. Пахаваны ў Астраўцы, дзе ўстаноўлены яму бюст. У Вільні пахаваны сын яго, **Іосіф Іосіфавіч**.

**1884** Нарадзіўся **Францішак Грынкевіч** (мяст. Новы Двор, цяпер Сакольскі пав. Падляскага ваяв., Польшча), рэлігійны і культурны дзеяч.

## 6 кастрычніка

**1517** У Празе **Францыск Скарына** выдаў “Прытчы Саламона”.

**1745** Нарадзіўся **Францішак Смуглевіч** (Варшава), жывапісец, графік, педагог, які працаваў у Беларусі.

**1762** Мястэчка Мядзель атрымала самакіраванне паводле магдэбургскага права.

**1876** Нарадзіўся **Ян Булгак** (в. Асташын, цяпер Карэліцкі р-н), фотамастак, этнограф, краязнавец.

**1908** Нарадзіўся **Алесь Мілюць** (в. Скорычы, цяпер Карэліцкі р-н), паэт.

**1963** У Нью-Йорку памёр **Віктар Чабатарэвіч**, палітычны і вайсковы дзеяч, настаўнік, дзеяч эміграцыі ў ЗША. Нарадзіўся ў мяст. Новы Свержань, цяпер Стаўбцоўскі р-н (1906).

**2004** У Брансвіку (Агаё, ЗША) памёр **Васіль Мельяновіч**, палітык, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Паводле завяшчання пахаваны ў в. Азярніца Лунінецкага р-на.

**2005** Памёр **Алесь Емельянаў**, паэт, адзін з заснавальнікаў Беларускага Народнага Фронту “Адраджэнне”.

## 7 кастрычніка

**1765** Нарадзіўся **Міхал Клеафас Агінскі** (мяст. Гузава, цяпер Жырардоўскі пав. Мазавецкага ваяв., Польшча), дзяржаўны дзеяч Рэчы

Паспалітай, кампазітар, удзельнік паўстання 1794 г.

**1788** Нарадзіўся **Іван Насовіч** (в. Гразівец, цяпер Чавускі р-н), мовазнавец-лексікограф, фальклярыст, этнограф.

**1900** У Жэневе (Швейцарыя) памёр **Уладзіслаў Малахоўскі**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Нарадзіўся ў маёнт. Маце, цяпер Кобрынскі р-н (1827 ці каля 1830).

**1911** Памерла **Соф'я Трашчкоўская** (**Тшашчкоўская**), паэтэса, фальклярыстка, перакладчыца. Пахавана на могілках в. Бабоўня, цяпер Капыльскі р-н). Нарадзілася ў в. Дарагавіца, цяпер Капыльскі р-н (1847).

**1912** Нарадзіўся **Юры Попка** (хутар Высокі Груд, цяпер Пружанскі р-н), грамадскі дзеяч, выдавец, пісьменнік, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне.

**1920** У Сувалках падпісана польска-літоўскае пагадненне, паводле якога была ўтворана Сярэдняя Літва — польская марыянеткавая дзяржава.

**1937** Расстраляны **Сямён Клінцэвіч**, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, актывіст Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі. Нарадзіўся ў мяст. Трабы, цяпер Іўеўскі р-н (красавік 1899 г.).

**1939** Расстраляны **Раман Скірмунт**, палітычны і грамадскі дзеяч.

## 8 кастрычніка

**1660** Войскі Рэчы Паспалітай у бітве на рацэ Басі каля Чавусаў адбілі наступленне расійскага войска і прымусілі яго адступаць да Смаленска.

**1870** Нарадзіўся **Аляксандр Булатовіч** (г. Арол, Расія) (паходзіў з Гарадзеншчыны), падарожнік, даследчык Усходняй Афрыкі, дыпламат, праваслаўны іераманах.

**1901** Нарадзілася **Апалонія Савёнак** (дзяв. **Раткевіч**; Лагойшчына), настаўніца, пісьменніца, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1920** Бунт Першай літоўска-беларускай дывізіі супраць перадачы бальшавікамі Віленскага краю Літве.

**1943** У савецкім канцлагеры памёр **Андрэй Мрый** (сапр. **Шашалевіч**), пісьменнік. Нарадзіўся ў в. Палуж, цяпер Краснапольскі р-н (1893).

**1991** Памерла **Зоська Верас** (сапр. **Людвіка Сівіцкая**, па мужу **Войцікава**), пісьменніца, грамадска-культурны дзеяч. Пахавана на могілках Панерай у Вільні.

**2000** У буйных гарадах Беларусі прайшлі акцыі пратэсту "Байкот-2000", скіраваныя супраць выбараў у парламент.

## 9 кастрычніка

**1916** Нарадзіўся **Віталь Кажан** (в. Балбекі, цяпер Шаркаўшчынскі р-н),

грамадскі і вайсковы дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1920** Генерал **Люцыян Жалігоўскі** заняў Вільню, пасля чаго абвешчана г. зв. Сярэдняя Літва.

**1929** У Варшаве памёр **Адам Лісоўскі**, рэлігійны дзеяч, каталіцкі святар. Пахаваны на каталіцкіх могілках у Кляшчэлях (Гайнаўскі пав. Падляскага ваяв., Польшча).

**2004** На радзіме ў в. Новы Свержань Стаўбцоўскага р-на памёр **Генадзь Пяткевіч**, сябар СБМ, дзеяч вызваленчага руху, вязень савецкіх канцлагераў. Нарадзіўся ў 1925 г.

## 10 кастрычніка

**1739** У Варшаве памёр **Дамінік Рудніцкі**, пісьменнік, педагог.

**1783** Памёр **Людвік Грынцэвіч**, архітэктар эпохі позняга барока.

**1794** Пад Мацяёвіцамі (цяпер Польшча) адбылася бітва паміж паўстанцамі і расійскім войскам. Паўстанцы пацярпелі паражэнне, цяжка паранены **Касцюшка** ўзяты ў палон.

**1796** Нарадзіўся **Міхаіл Без-Карніловіч** (Магілёўшчына), гісторык, краязнавец, этнограф.

**1867** У Мінску памёр **Ігнат Легатовіч**, беларускі і польскі паэт, педагог.

**1881** Нарадзіўся **Ян Тарчэўскі** (в. Асінаўка, цяпер Ашмянскі р-н), грамадскі дзеяч, нашанівец, настаўнік.

**1930** У Вільні выйшаў першы нумар газеты “Народны звон” (выдавалася да 16.12.1930). Рэдактар-выдавец **К. Крук**.

**1936** Памёр **Часлаў Пяткевіч**, этнограф, фалькларыст.

**1938** Расстраляны **Адам Бабарэка**, пісьменнік.

**1949** Памёр **Аляксандр Данілевіч**, педагог, публіцыст. Нарадзіўся ў мяст. Моўчадзь, цяпер Баранавіцкі р-н (1877).

**1967** У Гданьску заснавана Беларускае Грамадска-Культурнае Таварыства.

**1975** У в. Празарокі Глыбоцкага р-на ўстаноўлены помнік стваральніку беларускага прафесійнага тэатра **Ігнату Буйніцкаму**.

## 11 кастрычніка

**1760** У Слоніме памёр **Міхал Антоні Сапега**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, перакладчык, літаратар.

**1918** Уступіла ў дзеянне часовая канстытуцыя Беларускай Народнай Рэспублікі, якую прыняў Народны Сакратарыят Беларусі.

**1909** У Гродне нарадзілася **Зінаіда Бандарына**, пісьменніца, паэтэса.

**1978** На базе філіяла Літаратурнага музея **Янкі Купалы** (адкрыўся ў кастрычніку 1977 г.) створаны Купалаўскі мемарыяльны запаведнік “Ляўкі”.

## 12 кастрычніка

**1398** На востраве Салін (на Нёмане) падпісана мірная дамова аб дапамозе паміж Вялікім княствам Літоўскім і Тэўтонскім ордэнам.

**1633** У Полацку адбыўся ўзброены мяцеж гараджанаў супраць уніяцкага арцыбіскупа **Сялявы**.

**1761** Шчучын атрымаў магдэбургскае права.

**1884** Нарадзіўся **Міхаіл Буклярэвіч** (в. Лінгі, цяпер Воранаўскі р-н), рымска-каталіцкі святар, грамадскі дзеяч.

**1925** У Берліне пачалася Другая ўсебеларуская канферэнцыя (доўжылася да 16 кастрычніка), на якой была прынята заява аб роспуску Рады і Урада Беларускай Народнай Рэспублікі.

**1991** Адбыўся (доўжыўся два дні) устаноўчы з'езд Беларускага згуртавання вайскоўцаў (БЗВ).

## 13 кастрычніка

**1806** (ці 13 лістапада) Нарадзілася **Эмілія Плятар** (г. Вільня), удзельніца нацыянальна-вызваленчага паўстання 1830–1831 гг., фальклярыстка.

**1847** Нарадзіўся **Эдвард Вайніловіч** (в. Сляпянка, цяпер у межах Мінска), гаспадарчы і палітычны дзеяч.

**1884** Нарадзіўся **Баляслаў Пачопка** (Віцебшчына), культурна-асветны і рэлігійны дзеяч.

**1888** Нарадзіўся **Язэп Драздовіч** (засц. Пунькі, цяпер Глыбоцкі р-н), мастак, скульптар, пісьменнік, этнограф, археолаг, педагог, адзін з заснавальнікаў нацыянальна-гістарычнага жывапісу.

**1896** Нарадзіўся **Мікалай Шчакаціхін** (Масква), мастацтвазнавец, педагог.

**1996** У Кастамлотах (цяпер Бяльскі пав. Люблінскага ваяв., Польшча) адбыліся ўрачыстасці, прысвечаныя 400-м угодкам Брэсцкай Уніі.

**1999** Утворана Віцебская рымска-каталіцкая епархія.

## 14 кастрычніка

**1899** Нарадзіўся **Адам Бабарэка** (в. Слабада-Кучынка, цяпер Капыльскі р-н), пісьменнік.

**1903** Нарадзіўся **Лявон Рыдлеўскі** (маёнт. Ульянавічы, цяпер Талачынскі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, удзельнік Слуцкага паўстання, дзеяч эміграцыі ў Францыі.

## 15 кастрычніка

**1432** У Гродне выдадзены прывілей караля **Ягайлы**, які ўраўняў у правах праваслаўных князёў і баяраў з феадаламі-каталікамі.

**1817** У Салюры (Швейцарыя) памёр **Тадэвуш Касцюшка**, дзяржаўны і вайсковы дзеяч, кіраўнік паўстання 1794 г. У 1818 г. перапахаваны ў Вавельскім замку ў Кракаве.

**1833** У Фларэнцыі памёр **Міхал Клеафас Агінскі**, дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, кампазітар, удзельнік паўстання 1794 г.

**1909** Нарадзіўся **Сяргей Ракіта** (сапр. **Законнікаў**; в. Ліцьвінава, цяпер Дубровенскі р-н), паэт.

**1916** У Свіслачы адкрылася Беларуская настаўніцкая семінарыя.

**1961** У Крычаве адкрыўся раённы краязнаўчы музей.

## 16 кастрычніка

**1325** Заключаны шлюб дачкі **Гедыміна Ганны Альдоны** з польскім каралевічам **Казімірам**.

**1896** Памерла **Марыя Багдановіч** (дзяв. **Мякота**,) маці **Максіма Багдановіча**. Пахавана на старых праваслаўных могілках у Гродне. Нарадзілася ў г. Ігумен, цяпер Чэрвень (1869).

**1947** За выступ супраць "лысенкаўшчыны" і прапаганду "буржуазнай навукі" генетыкі з пасады прэзідэнта Акадэміі навук БССР звольнены **Антон Жэбрак**.

**1955** У Ашмянах адкрыўся краязнаўчы музей імя **Францішка Багушэвіча**.

**2006** Памёр **Яўген Лугін**, грамадска-палітычны дзеяч, стваральнік Сялянскай партыі. Пахаваны ў Глускім р-не.

## 17 кастрычніка

**1696** Нарадзіўся **Аўгуст III**, кароль Рэчы Паспалітай і вялікі князь літоўскі (1733–1764).

**1976** У Бэнтан-Харбар (Мічыган, ЗША) памёр **Радаслаў Астроўскі**, грамадска-палітычны дзеяч, педагог, Прэзідэнт Беларускай Цэнтральнай Рады, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Вялікабрытаніі і ЗША. Пахаваны на беларускіх могілках у Саўт-Рыверы (Нью-Джэрсі, ЗША)

**1994** Памерла **Зоя Коўш**, нацыянальны дзеяч у Вільні, вязень ГУЛАГу.

**1999** У Мінску адбыўся масавы "Марш свабоды" (больш за 30 тысяч чалавек). Адбыліся сутыкненні дэманстрантаў з міліцыяй і вайскоўцамі.

**2004** У Беларусі адбыўся рэферэндум, у выніку якога ў Канстытуцыю краіны былі ўнесены змены, што дазволілі **Аляксандру Лукашэнку** балатавацца на чарговы прэзідэнцкі тэрмін.

## 18 кастрычніка

**1529** У Вільні меч і шапка вялікага князя літоўскага насуперак традыцыі ўручаны 9-гадоваму **Жыгімонту Аўгусту**.

**1596** У Брэсце падпісана царкоўная унія, абвешчаная ў царкве Св. Мікалая.

**1905** У Мінску на вакзальнай плошчы адбыўся Курлоўскі расстрэл — сілавы разгон расійскімі войскамі і паліцыяй мітынгу гараджанаў. Каля 100 чалавек былі забіты, каля 300 — паранены.

**1906** Нарадзіўся **Алесь Салагуб** (в. Зарудзічы, цяпер Смаргонскі р-н), паэт, публіцыст.

**1960** У Марыупалі (Украіна) памёр **Іван Бялькевіч**, мовазнавец, педагог, аўтар слоўнікаў.

**1991** Памёр **Пятро Бітэль**, пісьменнік, паэт, перакладчык, педагог, праваслаўны святар. Пахаваны ў в. Вішнева Валожынскага р-на.

**1991** Вярхоўны Савет прыняў Закон "Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь".

**1995** Памёр **Янка Макарэвіч**, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі, паэт. Пахаваны на беларуска-ўкраінскай частцы могілак Роквуд у Сіднеі (Аўстралія).

**1996** Прайшлі юбілейныя набажэнствы ў сувязі з 400-мі ўгодкамі Брэсцкай уніі.

## 19 кастрычніка

**1890** У Брагіне нарадзіўся **Сяргей Палуян**, публіцыст, празаік, літаратуразнавец, крытык.

**1933** Нарадзілася **Вольга Бурнос** (дзяв. **Пашкевіч**; в. Вядо, цяпер Івацэвіцкі р-н), дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

**1967** Памёр **Аляксандр Махноўскі**, педагог, дзеяч эміграцыі ў ЗША. Пахаваны на беларускай частцы могілак у Іст-Брансвіку (Нью-Джэрсі, ЗША).

**1988** У Мінску ўтвораны рэспубліканскае грамадскае гісторыка-асветнае таварыства памяці ахвяр сталінізму "Мартыралог Беларусі" і аргкамітэт Беларускага Народнага Фронту "Адраджэнне".

**1990** Украінскі грэка-каталіцкі мітрапаліт **Уладзімір Стэрнюк** выдаў грамату на арганізацыю ў Мінску першай уніяцкай парафіі ў Беларусі.

## 20 кастрычніка

**1506** На княжанне ў Вялікім княстве Літоўскім абраны **Жыгімонт I Стары**.

**1655** Падпісана Кейданская дамова — **Януш Радзівіл** з вялікай групай шляхты заключылі ўнію Вялікага княства Літоўскага са Швецыяй.

**1677** Нарадзіўся **Станіслаў Ляшчынскі** (г. Львоў, цяпер Украіна), кароль Рэчы Паспалітай, вялікі князь літоўскі ў 1704–1709 і 1733 гг.

**1768** Памёр **Антон Барташэвіч**, асветнік, філосаф, педагог.

**1812** Пад час французка-расійскай вайны ў Слоніме адбыўся вялікі бой.

**1885** У Вільні нарадзіўся **Алесь Бурбіс**, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху.

**1892** Нарадзіўся **Янка Тарасевіч** (в. Клешнякі, цяпер Шчучынскі р-н), рэлігійны і грамадскі дзеяч эміграцыі ў Канадзе, Швейцарыі і ЗША, тэолаг.

**1911** Нарадзіўся **Валянцін Рамановіч** (г. п. Карэлічы), мастак.

**1920** У Рызе адбылася Нацыянальна-палітычная нарада — сход сяброў Народнай рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

**1953** (ці 1955) У Маскве памёр **Яўген Хлябцэвіч**, бібліятэказнавец, літаратуразнавец, публіцыст, педагог.

## 21 кастрычніка

**1876** Нарадзіўся **Сяргей Скандракоў** (г. Мглін, цяпер Бранская вобл., Расія), вучоны, краязнавец, публіцыст.

**1878** У Варшаве памёр **Восіп Кавалеўскі**, гісторык, філамат, адзін з заснавальнікаў манголазнаўства.

**1878** Нарадзіўся **Уладзімір Пічэта** (г. Палтава, цяпер Украіна), гісторык-славіст, першы рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

**1900** Нарадзіўся **Фелікс Купцэвіч**, пісьменнік, крытык.

**1917** У Петраградзе выйшаў першы нумар газеты "Беларуская крыніца" ("Bielaruskaja krynica"), № 3 выйшаў у Мінску, ад 7 верасня 1919 г. да 12 ліпеня 1940 г. выдавалася ў Вільні.

**1935** Нарадзіўся **Юрка Геніюш** (г. п. Зэльва), пісьменнік і публіцыст.

## 22 кастрычніка

**1613** У выніку пажару згарэла большая частка старажытнага Навагрудка.

**1856** У высылцы (Архангельская губ., Расія) памёр **Рамуальд Друцкі-Падбярэскі**, беларускі і польскі выдавец, публіцыст, фалькларыст. Нарадзіўся ў Вільні ў 1812 ці 1813 г.

**1909** Нарадзіўся **Раман Лецка** (в. Вярбіцы, цяпер Навагрудскі р-н), краязнавец, калекцыянер, вязень савецкіх канцлагераў.

**1919** Выйшаў дэкрэт **Юзафа Пілсудскага** аб дазволе фарміравання беларускіх вайсковых частак і зацверджанні кіраўніцтва Беларускай вайсковай камісіі.

**1920** У Вільні нарадзіўся **Юрка Луцкевіч**, вайсковец, настаўнік, сябар Беларускай Незалежніцкай Партыі, вязень савецкіх канцлагераў.

**1937** Нарадзілася **Надзея Груша** (дзяв. **Сасноўская**; г. Горкі), дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.

**1937** У Мінску расстраляны **Фларыян Ждановіч**, акцёр, рэжысёр, тэатральны дзеяч.

**1937** У г. Ірбіт (Свярдлоўская вобл., РСФСР) расстраляны **Лукаш Калюга** (сапр. **Кастусь Вашына**), пісьменнік.

**1957** Памёр **Аляксандр Савіч**, гісторык, апалагет Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы.

**2003** Памёр **Міхась Раецкі**, журналіст, дзеяч эміграцыі ў Аўстралія. Пахаваны на беларускай частцы могілак Караката ў Перце (Аўстралія).

## 23 кастрычніка

**1501** Падпісаны Мельніцкі акт дзяржаўнай уніі паміж Каралеўствам Польскім і Вялікім княствам Літоўскім, які аднак у выніку шырокай апазіцыі ў княстве сілы не набыў.

**1823** Нарадзіўся **Адам Плуг** (сапр. **Антон Пяткевіч**; в. Замосце, цяпер Слуцкі р-н), беларускі і польскі пісьменнік, журналіст.

**1834** Нарадзіўся **Ян Ванькові**ч (маёнт. Сляпянка, цяпер у межах Мінска), удзельнік паўстання 1863–1864 гг., мастак.

**1909** Нарадзіўся **Міхась Зуй** (в. Вялікае Сяло, цяпер Шаркаўшчынскі р-н), вайсковы і палітычны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і Аўстраліі, прэзідэнт Беларускай Цэнтральнай Рады (1987–1995).

**1928** Нарадзіўся **Лаўрэн Клыбік** (в. Хадзявічы, цяпер Слонімскі р-н), медык, навуковец-фармацэўт дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі і Бельгіі.

**1941** У савецкім канцлагеры на лесапавале ў Сібіры забіты **Васіль Шашалевіч**, драматург.

**1981** Памёр **Якуб Міско**, пісьменнік, журналіст. Пахаваны на Паўночных могілках у Мінску.

## 24 кастрычніка

Міжнародны дзень ААН

**1656** Падпісана Віленскае перамір’е паміж Расійскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай аб спыненні вайны, якая пачалася ў 1654 г.

**1795** Адбыўся трэці падзел Рэчы Паспалітай.

**1864** Нарадзіўся **Аляксей Бялыніцкі-Біруля** (маёнт. Бабкоў, цяпер Аршанскі р-н), заолаг і заагеограф, падарожнік.

**1904** Нарадзіўся **Марыян Пецюкевіч** (в. Цяцеркі, цяпер Браслаўскі р-н), дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, этнограф.

**1953** У лонданскім шпіталі памёр **Лявон Рыдлеўскі**, грамадска-палітычны дзеяч, удзельнік Слуцкага паўстання, дзеяч эміграцыі ў Францыі. Пахаваны ў Лондане.

**1999** У Якушоўцы Свіслацкага р-на пад час Дня памяці паўстанцаў 1863 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага крыжа.

## 25 кастрычніка

**1589** Нарадзіўся **Ян Станіслаў Сапега**, сын **Льва Сапегі**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага.

**1858** Нарадзіўся **Эдуард Пякарскі** (в. Пятровічы, цяпер Смалявіцкі р-н), лінгвіст, этнограф, географ.

**1884** Нарадзіўся **Сяргей Дубінскі** (в. Наройкі, цяпер Семятыцкі пав. Падляскага ваяв., Польшча), археолаг.

**1934** Нарадзіўся **Карлас Шэрман** (г. Мантэвідэо, Уругвай), пісьменнік, перакладчык, грамадскі дзеяч.

**1983** Памёр **Марыян Пецюкевіч**, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, этнограф.

**1946** У Парыжы заснавана Беларуская Грэка-Каталіцкая Місія на чале з рэктарам айцом **Львом Гарошкам**.

**1991** У Нью-Йорку памёр **Антось Галіна** (сапр. **Міхась Міцкевіч**), пісьменнік, грамадскі дзеяч эміграцыі ў ЗША, брат **Якуба Коласа**. Пахаваны на беларускай частцы могілак у Іст-Брансвіку (Нью-Джэрсі, ЗША).

**1992** У г. Сарны (Ровенская вобл., Украіна) памёр **Васіль Струмень** (сапр. **Аляксандр Лебедзеў**), беларускі і ўкраінскі пісьменнік. Пахаваны ў Сарнах.

**1995** У Салігорску памёр **Лявон Случанін** (сапр. **Шпакоўскі Лявонцій**), паэт, вязень ГУЛАГу.

**1999** Памерла **Надзея Груша** (дзяв. **Сасноўская**), дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі. Пахавана на беларускай дзялянцы могілак Фолкнер у Мельбурне (Аўстралія).

## 26 кастрычніка

**1810** Нарадзіўся **Генрык Дмахоўскі** (Вільня ці в. Забалацце, цяпер Мiёрскі р-н), скульптар, удзельнік паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг.

**1885** У Харкаве памёр **Міхаіл Урончанка**, геадэзіст-тапограф, географ, перакладчык. Нарадзіўся ў г. Копысь, цяпер Аршанскі р-н (1801).

**1906** Памёр **Уладзімір Спасовіч**, беларускі і расійскі юрыст, публіцыст, літаратуразнавец.

**1944** На фронце, на тэрыторыі Усходняй Прусіі, загінуў **Алесь Мілюць**, паэт. Пахаваны ў брацкай магіле ў пасёлку Ватуціна, (цяпер Несцераўскі р-н Калінінградскай вобл., Расія).

**1959** Нарадзіўся **Анатоль Сыс** (в. Гарошкаў Рэчыцкага р-на), паэт. Памёр у траўні 2005 г.

**1987** У в. Палачанка Мінскага р-на адбыўся Першы Вальны сейм беларускіх суполак (доўжыўся два дні, прысутнічала больш за 560 чалавек).

**1999** У Слоніме памёр **Анатоль Іверс** (сапр. **Іван Міско**), паэт.

## 27 кастрычніка

**1430** Памёр вялікі князь **Вітаўт**. Нарадзіўся ў 1350 г.

**1658** Адбылася бітва пад Чавусамі 14-тысячнага войска казацкага палкоўніка **Нячая**, які перайшоў на

бок караля Рэчы Паспалітай з маскоўскім войскам.

**1890** Нарадзіўся **Віктар Шутовіч** (в. Шутавічы, цяпер Смаргонскі р-н), культурны дзеяч, каталіцкі святар, вязень савецкіх канцлагераў.

**1907** У маёнт. Бясяды(?) (цяпер Лагойскі р-н) памёр **Зыгмунт Чаховіч**, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1917** У Мінску адбыўся III з'езд Беларускай сацыялістычнай грамады.

**1947** У Лондане заснавана Беларуская каталіцкая місія візантыйска-славянскага абраду ў Англіі.

**1990** У Гайнаўцы (Падляскае ваяв., Польшча) у новым будынку адкрыўся Беларускі этнаграфічны музей.

## 28 кастрычніка

**1845** Нарадзіўся **Зыгмунт Урублеўскі** (г. Гродна), навуковец-фізік, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1884** Нарадзіўся **Фларыян Ждановіч** (г. Мінск), акцёр, рэжысёр, тэатральны дзеяч.

**1923** У Вільні выйшаў першы нумар газеты “Змаганне” (выдавалася да снежня 1924 г.).

**1974** Памёр **Рыгор Акулевіч**, грамадска-культурны дзеяч, выдавец, публіцыст, актывіст Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады і Таварыства Беларускай Школы, дзеяч эміграцыі ў Канадзе.

**1920** У Вільні выдадзена газета “Наша ніва” — спроба аднаўлення аднайменнай ранейшай газеты (выходзіла да 20 снежня 1920 г.). Рэдактар **У. Знамяроўскі**.

**1992** У Мінску футбольная зборная Беларусі згуляла першы матч у суверэннай гісторыі (1:1 у таварыскай гульні з Украінай).

**2002** Памёр **Мікалай Рулінскі**, афіцэр Беларускай Краёвай Абароны, грамадскі дзеяч у Вільнюсе.

## 29 кастрычніка

**1937** У Мінску у будынку НКУС цягам ночы расстраляны 22 беларускія і яўрэйскіхя пісьменнікі, шэраг навукоўцаў і грамадскіх дзеячаў. Сярод забітых былі **Платон Галавач**, пісьменнік, грамадскі дзеяч; **Хацкель Дунец**, пісьменнік; **Алесь Дудар** (сапр. **Дайлідовіч Аляксандр**), паэт, крытык; **Міхась Зарэцкі** (сапр. **Касянкоў**), пісьменнік; **Васіль Каваль** (сапр. **Кавалёў**), пісьменнік, журналіст; **Валерый Маракоў**, паэт; **Васіль Сташэўскі**, пісьменнік, грамадскі дзеяч, удзельнік Слуцкага паўстання; **Міхась Чарот** (сапр. **Кудзелька**), паэт, грамадска-культурны дзеяч.

**1989** У Курапатах прайшоў шматтысячны мітынг памяці ахвяраў сталінскага генацыду.

**1993** У Кліўлендзе памёр **Сяргей Карніловіч**, грамадскі і рэлігійны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1996** У Празе на Градчанах устаноўлены помнік **Францыску Скарыну** (скульптар **Астаф'еў**), а на будынку нацыянальнай чэшскай бібліятэкі Клеменцінум — памятная дошка ў гонар беларускага першадрукара (скульптар **Алесь Дранец**).

**2006** У Жлобіне памёр **Мікола Канаш**, беларускі дзеяч, вязень ГУЛАГу, адзін з бліжэйшых сяброў **Ларысы Геніюш**. Нарадзіўся на Браслаўшчыне ў 1926 г.

## 30 кастрычніка

**1883** Нарадзіўся **Янка Быліна** (сапр. **Ян Семашкевіч**; в. Лакцяны, цяпер Астравецкі р-н), каталіцкі святар, пісьменнік, паэт.

**1890** Нарадзіўся **Міхаіл Урбановіч** (мяст. Астрына, цяпер Шчучынскі р-н), культурны дзеяч, педагог, каталіцкі святар у ЗША.

**1921** У Мінску заснаваны Беларускі дзяржаўны універсітэт.

**1936** Памёр **Фердынанд Рушчыц**, польскі і беларускі мастак, педагог, тэатральны дэкаратар.

**1937** У Мінску ў НКУС расстраляны 32 чалавекі, сярод якіх былі **Янка Нёманскі** (сапр. **Іван Пятровіч**), пісьменнік, эканаміст; **Тодар Кляшторны**, паэт.

**1988** У Мінску і Курапатах прайшоў мітынг-рэквіем "Дзяды", які быў жорстка разагнаны. Дзень памяці ўсіх ахвяраў генацыду.

**1994** Рымскі папа **Ян Павел ІІ** пасвяціў у кардыналы **Казіміра Свёнтака**.

## 31 кастрычніка

**1905** У Віцебску казацкі патруль абстраляў мітынг гараджанаў — 7 чалавек забіты, 4 паранены. На пахаванні загінулых прысутнічалі каля 40 тысяч чалавек.

**1910** У Вільні нарадзіўся **Леанід Галяк**, юрыст, журналіст, грамадскі дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1917** Створаны часовы выканаўчы камітэт Цэнтральнай Беларускай Вайсковай Рады.

**1932** Памёр **Кіпрыян Кандратовіч**, генерал, міністр Беларускай Народнай Рэспублікі. Пахаваны ў Пагародні (цяпер Воранаўскі р-н), пазней перапахаваны каля праваслаўнай царквы ў Воранаве. Нарадзіўся ў 1859 г.

**1937** Расстраляны **Антон Баліцкі**, грамадска-культурны дзеяч.

**1937** Нарадзіўся **Яўген Кулік** (Мінск), грамадскі дзеяч, мастак, графік.

**1947** Выйшаў першы нумар газеты "Бацькаўшчына" (выдавалася ў Мюнхене да снежня 1966 г.).

**1992** Памёр **Міхась Ткачоў**, грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, археолаг, педагог. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

# ЛІСТАПАД

## 1 лістапада

У лацінскім абрадзе
свята Усіх Святых

**1868** Нарадзіўся **Дзмітрый Даўгяла** (в. Казьяны, цяпер Шумілінскі р-н), гісторык, архівіст, крыніцазнавец. Памёр у казахстанскай ссылцы (1942?).

**1873** Нарадзіўся **Іван Замоцін** (в. Крывуліна, цяпер Бежацкі р-н Цвярской вобл., Расія), беларускі і расійскі літаратуразнавец, вязень ГУЛАГу.

**1909** Нарадзіўся **Іван Касяк** (в. Горы, цяпер Вілейскі р-н), грамадскі дзеяч, публіцыст, гісторык, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1912** Нарадзіўся **Янка Золак** (сапр. **Антон Даніловіч**; в. Лучнікі, цяпер Слуцкі р-н), паэт, грамадскі дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1915** Нарадзіўся **Міхась Кавыль** (сапр. **Язэп Лешчанка**; в. Пакрашава, цяпер Слуцкі р-н), паэт, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1933** Нарадзіўся **Вячаслаў Адамчык** (в. Варакомшчына, цяпер Дзятлаўскі р-н), пісьменнік.

**1943** У Паставах нацыстамі забіты **Адам Дасюкевіч**, грамадска-культурны дзеяч, журналіст.

**1984** Памёр **Пётр Сергіевіч**, мастак.

**1986** Адкрыўся Уздзенскі гісторыка-краязнаўчы музей (заснаваны 6 лютага 1981 г.).

**1987** У Купалаўскім парку ў Мінску адзначаны Дзяды. Упершыню шырока заяўлена пра савецкі генацыд.

**1992** Памерла **Тамара Лазаковіч**, гімнастка, чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў (1972).

**1992** У Мінску адбыўся Устаноўчы сейм Згуртавання беларускай шляхты (ЗБШ).

## 2 лістапада

Дзяды,
дзень памінання памерлых

**1869** Нарадзіўся **Язэп Стаброўскі** (маёнт. Крупляны, цяпер Навагрудскі р-н), археолаг, краязнавец.

**1903** Памёр **Адам Плуг** (сапр. **Антон Пяткевіч**), польскі і беларускі пісьменнік, журналіст. Пахаваны на Павонзкаўскіх могілках у Варшаве.

**1927** Нарадзіўся **Міхась Раецкі** (Мінск), журналіст, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі.



Пячатка канцлера
Вялікага Княства
Літоўскага Мікалая
Радзівіла (Рудога).
*1574 г.*

**1959** Памёр **Аляксандр Орса**, педагог, доктар прыродазнаўства, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахаваны на беларускай частцы могілак у Іст-Брансвіку (Нью-Джэрсі, ЗША).

## 3 лістапада

**667** Нарадзіўся **Святы Губэрт**, патрон Гародні.

**1661** Перамога войск Рэчы Паспалітай над расійскімі войскамі ваяводы **Хаванскага** і **Ордына-Нашчокіна** ў бітве пад Кушлікамі паблізу Дзісны на Полаччыне.

**1845** У Каменцы Падляскай (Сакольскі пав. Падляскага ваяв., Польшча) нарадзіўся **Зыгмунт Глогер**, польскі этнограф, археолаг, які даследаваў Заходнюю Беларусь.

**1863** Памёр **Міхаіл Кулеша**, графік і жывапісец. Нарадзіўся ў Вільні (1795 ці 1800).

**1882** Нарадзіўся **Якуб Колас** (засц. Акінчыцы, цяпер у межах Стоўбцаў), народны пісьменнік Беларусі.

**1890** Нарадзіўся **Канстанцін Пушкарэвіч** (г. Слонім), беларускі і расійскі славіст, літаратуразнавец, педагог.

**1937** На Салавецкіх астравах расстраляны **Павел Валошын** і **Флягонт Валынец**, дзеячы заходнебеларускага нацыянальнага руху.

**1941** Каля г. Уральска (Казахстан) памёр **Змітрок Бядуля**, пісьменнік, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху. Пахаваны ў Уральску.

**1972** У Мінску ўстаноўлены помнік **Якубу Коласу**.

**1983** Памёр **Антон Мартас** (у манастве **Апанас**), архіепіскап, рэлігійны дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Аргенціне, Аўстраліі і ЗША, гісторык праваслаўнай царквы. Нарадзіўся ў в. Завітая, цяпер Нясвіжскі р-н (1904).

## 4 лістапада

**1501** Паражэнне войска Вялікага княства Літоўскага ў бітве з маскоўскім войскам пад Мсціславам.

**1794** Пры абароне Прагі (прадмесце Варшавы) загінулі **Якуб Ясінскі**, вайсковы і палітычны дзеяч, інжынер, паэт, адзін з кіраўнікоў паўстання 1794 г. і **Тадэвуш Корсак**, дзяржаўна-вайсковы дзеяч. Пахаваны пры касцёле “На Камёнку” ў Варшаве.

**1816** Нарадзіўся **Арцём Вярыга-Дарэўскі**, пісьменнік, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. на Віцебшчыне. Памёр у Сібіры ў 1884 г.

**1887** Нарадзіўся **Цішка Гартны** (сапр. **Зміцер Жылуновіч**; г. Капыль), дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, дзяржаўны дзеяч БССР, гісторык, пісьменнік, публіцыст.

**1929** Нарадзіўся **Сяргей Карніловіч** (в. Таргуны, цяпер Докшыцкі р-н),

грамадскі і рэлігійны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1937** Расстраляны **Аляксандр Валькові**, дзеяч нацыянальнага руху.

**1992** У Мінску памёр **Васіль Хомчанка**, пісьменнік.

**1993** Памёр **Раман Лецка**, краязнавец, калекцыянер, вязень савецкіх канцлагераў.

**2000** У Парэччы Слонімскага р-на устноўлены памятны крыж у гонар паўстанца **Міхаіла Валовіча** і яго паплечнікаў.

## 5 лістапада

**1250** Памёр **Елісей Лаўрышаўскі**, праваслаўны святы.

**1576** Кароль **Стафан Баторы** падцвердзіў Гродну ўсе прывілеі.

**1907** Нарадзіўся **Міхаіл Вітушка** (г. Нясвіж), генерал, адзін з лідэраў Беларускай Незалежніцкай Партыі, кіраўнік беларускага супраціву ў другой палове 1940–1950-х гг.

**1922** Адбыліся першыя выбары ў польскі сейм, у які беларусы правялі 14 сваіх прадстаўнікоў.

**1954** У Рэчыцы адкрыўся краязнаўчы музей.

**1955** У Століне адкрыўся краязнаўчы музей (заснаваны ў 1954 г.).

**1997** Памёр **Святаслаў Коўш**, рэлігійны дзеяч, пісьменнік, святар Беларускай праваслаўнай царквы пад юрысдыкцыяй канстантынопальскага патрыярхата, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахаваны на беларускіх могілках у Саўт-Рыверы (Нью-Джэрсі, ЗША).

## 6 лістапада

**1661** Войскі Рэчы Паспалітай на чале з **С. Чарноцкім** разбілі ля Глыбокага маскоўскія войскі.

**1689** Нарадзіўся **Антоні Казімір Сапега** (мяст. Дзярэчын, цяпер Зэльвенскі р-н), дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага.

**1862** У фальв. Якушоўка (цяпер Свіслацкі р-н) памёр **Віктар Каліноўскі**, гісторык, археограф, адзін з ідэолагаў паўстання 1863–1864 гг. Пахаваны ў Свіслачы.

**1887** Нарадзіўся **Радаслаў Астроўскі** (хут. Заполле, цяпер Слуцкі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, педагог, прэзідэнт Беларускай Цэнтральнай Рады (1944–1945, 1947–1976), дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне, Вялікабрытаніі і ЗША.

**1891** Нарадзіўся **Іосіф Воўк-Левановіч** (хут. Лявонаўка, цяпер Асіповіцкі р-н), мовазнавец.

**1920** Войска **Булак-Балаховіча** пачало наступленне з Турава на ўсход.

**1940** Памёр **Лявон Вітан-Дубейкаўскі**, дзеяч нацыянальнага руху, паэт, архітэктар, будаўнік. Пахаваны на могілках Росы ў Вільні.

**1949** Нарадзіўся **Аляксей Філіпчанка** (Расія), беларускі следчы, праваабаронца.

**1980** У Нью-Йорку памёр **Станіслаў Станкевіч**, грамадска-культурны дзеяч, літаратуразнавец, публіцыст, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**2000** У Мінску памерла **Стэфанія Станюта**, актрыса.

## 7 лістапада

**1790** Нарадзіўся **Карл Падчашынскі** (в. Жырмуны, цяпер Воранаўскі р-н), асветнік, архітэктар, даследчык, педагог.

**1886** Нарадзіўся **Генрык Бэта**, каталіцкі святар, педагог, пісьменнік.

**1890** Нарадзіўся **Ігнат Жаўняровіч**, грамадска-культурны дзеяч, каталіцкі святар, вязень ГУЛАГу. Памёр у ссылцы ў Казахстане (жнівень 1937 г.).

**1896** Нарадзіўся **Міхась Чарот** (сапр. **Кудзелька**; мяст. Рудзенск, цяпер Пухавіцкі р-н), паэт грамадска-культурны дзеяч.

**1898** Нарадзіўся **Клімент Якаўчык** (в. Дольная Свіслач, цяпер Гродзенскі р-н), беларускі і расійскі пісьменнік. Загінуў на фронце ў 1941 г.

**1919** У Гомелі адкрыўся абласны краязнаўчы музей.

**1942** Гітлераўцамі расстраляны **Алесь Дубровіч** (сапр. **Аляксей Рэдзька**), паэт, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху. Нарадзіўся ў в. Галубічы, цяпер Каралевічы Глыбоцкага р-на (1910).

**1948** У Ватэнштэце (Ніжняя Саксонія, Нямеччына) у аўтакатастрофе загінуў **Хведар Ільяшэвіч**, паэт, празаік, гісторык, грамадска-культурны дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне. Пахаваны ў г. Галендорф (Ніжняя Саксонія, Нямеччына).

**1949** У Мазыры адкрыўся краязнаўчы музей.

## 8 лістапада

**1632** Каралём Рэчы Паспалітай і вялікім князем ВКЛ абраны **Уладзіслаў Ваза** (1632–1648).

**1784** Нарадзіўся **Тодар Нарбут** (маёнт. Шаўры, цяпер Воранаўскі р-н), гісторык, археолаг, краязнавец.

**1858** Нарадзіўся **Тадэвуш Урублеўскі**, адвакат, публіцыст, грамадскі дзеяч.

**1883** Нарадзіўся **Вацлаў Ластоўскі** (маёнт. Калеснікі, цяпер Глыбоцкі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, мовазнавец, літаратуразнавец, публіцыст, этнограф.

**1890** Нарадзіўся **Янка Пачопка** (в. Летнікі, цяпер Глыбоцкі р-н), паэт, фалькларыст.

**1903** Нарадзіўся **Міхась Явар** (сапр. **Карась**; в. Мінявічы, цяпер Мастоўскі р-н), паэт, удзельнік Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, Таварыства Беларускай Школы.

**1946** У Ватыкане беларуская дэлегацыя (айцец **Леў Гарошка**, айцец **Францішак Чарняўскі** і **Лявон**

**Рыдлеўскі**) сустрэлася з Папам **Піем XII**.

**1973** Памёр **Аляксандр Жукоўскі**, удзельнік слонімскай падпольнай патрыятычнай арганізацыі “Чайка”, вязень савецкіх турмаў і канцлагера. Пахаваны на радзіме ў в. Залессе Слонімскага р-на. Нарадзіўся ў 1926 г.

**2003** Памерла **Вольга Бурнос**, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі. Пахавана на праваслаўнай частцы могілкаў Centennial Park у Адэлайдзе (Аўстралія).

## 9 лістапада

**1817** Памёр **Раймонд Корсак**, паэт, удзельнік паўстання 1794 г.

**1942** Каля Барысава гестапаўцамі расстраляны **Генрык Глябовіч**, рэлігійны дзеяч, святар, тэолаг, ураджэнец Гродна. Пазней беатыфікаваны.

**1962** Нарадзіўся **Аляксей Мельнікаў** (г. Гомель), літаратуразнавец.

**1994** У Вільні ўстаноўлена памятная дошка **Браніславу Тарашкевічу**.

## 10 лістапада

Сусветны дзень моладзі

**1444** Удзел палкоў Вялікага княства Літоўскага ў бітве з туркамі пад Варнай.

**1749** Нарадзіўся **Мацей Радзівіл**, драматург, кампазітар.

**1851** Памёр **Ян Ходзька** (**Барэйка**), пісьменнік, грамадскі дзеяч, удзельнік паўстання 1830–1831 гг.

**1920** Войскі **Станіслава Булак-Балаховіча** занялі Мазыр.

**1924** У Вільні памёр **Міхаіл Галянкевіч**, грамадскі дзеяч, праваслаўны святар. Нарадзіўся ў Бельскім пав. Гродзенскай губ. (1852).

**1938** У Мінску расстраляны **Рыгор Рак**, краязнавец.

**1938** У Мінску расстраляны **Уладзімір Тэраўскі**, кампазітар, харавы дырыжор, фалькларыст.

## 11 лістапада

**1673** Адбылася пераможная бітва 40-тысячнага войска Рэчы Паспалітай на чале з **Янам Сабескім** пад Хоцінам над 80-тысячным турэцкім войскам. У выніку была спынена турэцкая экспансія на Украіну.

**1875** Нарадзіўся **Альберт Паўловіч** (Мінск), паэт-гумарыст, драматург.

**1903** Нарадзіўся **Аляксандр Ільінскі** (мяст. Мір, цяпер Карэліцкі р-н), артыст тэатра.

**1937** (ці 3 лістапада) На Салавецкіх астравах расстраляны **Максім Бурсевіч**, дзеяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, актывіст Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады.

**1988** Аргкамітэт Беларускага Народнага Фронту прыняў адозву

"Да грамадзян Беларусі", у якой акрэсліў палітычную пазіцыю руху.

**1994** Памёр **Міхаіл Крываносаў**, кідальнік молата, сярэбраны прызёр алімпійскіх гульняў (1956), шматразовы рэкардсмен свету.

**1999** Памерла **Ангеліна Бароўка**, сяброўка Саюза Беларускіх Патрыётаў, вязень савецкіх канцлагераў. Нарадзілася ў 1931(?) г.

## 12 лістапада

Дзень памяці Св. мучаніка **Язафата Кунцэвіча**. Нарадзіўся ў Уладзіміры-Валынскім (Украіна) у 1580 г., забіты ў Віцебску 12 лістапада 1623 г.

**1572** Памёр **Рыгор Хадкевіч**, дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вялікага княства Літоўскага, асветнік.

**1656** Памёр **Альбрыхт Станіслаў Радзівіл**, гісторык, мемуарыст.

**1794** (ці 1796) Нарадзіўся **Міхаіл Рукевіч** (в. Гожна, цяпер Беластоцкі пав. Падляскага ваяв., Польшча), удзельнік вызваленчага руху, філамат.

**1885** Нарадзіўся **Міхайла Грамыка** (в. Чорнае, цяпер Рэчыцкі р-н), пісьменнік, вучоны.

**1918** У Віцебску заснаваны музей (цяпер Віцебскі абласны краязнаўчы музей).

**1920** Нарадзіўся **Валерый Навіцкі** (да 1945 г. — **Валянцін Новік**; в. Дубейкі, цяпер Капыльскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, дзеяч эміграцыі ў Канадзе.

**1920** Нарадзіўся **Андрэй Макаёнак** (в. Борхаў, цяпер Рагачоўскі р-н), драматург.

**1930** Нарадзіўся **Восіп Блізнюк** (в. Шаматова, цяпер Смаргонскі р-н), удзельнік антыкамуністычнага падпольнага вучнёўскага руху ў Смаргонях, вязень савецкіх канцлагераў.

**2000** У Мінску і яшчэ 25 гарадах Беларусі адбыліся маштабныя акцыі пратэсту моладзі пад лозунгам "Пераменаў!".

## 13 лістапада

**1655** Войска Вялікага княства Літоўскага пад кіраваннем гетмана **Паўла Стафана Сапегі** перамагло маскоўскае войска на рацэ Лясной паблізу Берасця.

**1625** Памёр **Саламон Рысінскі**, паэт, філосаф, этнограф, педагог. Верагодна, пахаваны ў в. Далятычы, цяпер Навагрудскі р-н. Нарадзіўся ў в. Рысін, цяпер Себежскі р-н Пскоўскай вобл., Расія (1560?).

**1836** Нарадзіўся **Яраслаў Дамброўскі** (г. Жытомір, цяпер Украіна), дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху.

**1892** Нарадзіўся **Язэп Троська** (сапр. **Дудзюк**; в. Лаша, цяпер Гродзенскі р-н), гісторык, краязнавец, педагог. Загінуў пасля 1930 у савецкіх турмах.

**1942** Памёр **Уладзіслаў Талочка**, рэлігійны і культурна-асветны дзеяч, кульуролаг, гісторык, літаратуразнавец. Пахаваны на могілках Росы ў Вільні.

**1943** Савецкімі партызанамі ў рэдакцыі "Беларускай газеты" забіты **Уладзіслаў Казлоўшчык** (сапр. **Казлоўскі**), грамадска-палітычны дзеяч, паэт, публіцыст, выдавец. Пахаваны на Кальварыйскіх могілках у Мінску.

**1985** Памёр **Антон Валынчык**, хормайстар, кампазітар, педагог. Пахаваны на могілках на прасп. Касманаўтаў у Гродне.

**1989** Памёр **Фёдар Янкоўскі**, мовазнавец. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**1993** Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў Закон "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (на ўлік узяты 16, 3 тысячы помнікаў гісторыі і культуры).

## 14 лістапада

**1812** Нарадзіўся **Паўлюк Багрым** (в. Крошын, цяпер Баранавіцкі р-н), паэт. Памёр каля 1891 г., пахаваны на радзіме.

**1905** Нарадзіўся **Міхась Васілёк** (сапр. **Касцевіч Міхаіл**; в. Баброўня, цяпер Гродзенскі р-н), паэт, актывіст Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, Таварыства Беларускай Школы.

**1907** Нарадзіўся **Міхась Ларчанка** (в. Хварасцяны, цяпер Слаўгарадскі р-н), літаратуразнавец і крытык, які ў 1956 г. быў абвінавачаны ў "нацыяналізме".

**1916** У Пецярбургу выйшаў першы нумар грамадска-літаратурнай газеты "Дзянніца" (выдавалася да 13 студзеня 1917 г.). Рэдактар-выдавец **Цішка Гартны**.

**1916** У Пецярбургу выйшаў першы нумар грамадска-палітычнай газеты "Светач" (выдавалася лацінкай да 13 студзеня 1917 г.). Рэдактар-выдавец **Эдзюк Будзька**.

**1920** Пачаўся Беларускі з'езд Случчыны (доўжыўся 14–15 лістапада).

**1933** Нарадзіўся **Леанід Пракопчык** (Мінск), краязнавец, пісьменнік.

**1939** Заходняя Беларусь афіцыйна ўключана ў склад БССР.

**1978** У Лос-Анджэласе памёр **Уладзімір Клішэвіч**, паэт, публіцыст, вязень савецкіх турмаў, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1986** У Маскве памёр **Мікола Улашчык**, гісторык, археограф, археолаг, этнограф, краязнавец, літаратар. Пахаваны на Чыжоўскіх могілках у Мінску.

**1987** Памёр **Факунда Несцяровіч**, удзельнік антыкамуністычнага падпольнага вучнёўскага руху на Мядзельшчыне, вязень савецкіх канцлагераў.

**1990** У Парыжы, у будынку ЮНЕСКА, адбылася святочная цырымонія ў гонар 500-х угодкаў са дня нараджэння **Францыска Скарыны**.

## 15 лістапада

**1812** Каля Ваўкавыска адбылася бітва паміж французскім і расійскім войскамі (доўжылася два дні).

**1893** Нарадзіўся **Францішак Чарняўскі** (в. Чухны, цяпер Смаргонскі р-н), каталіцкі святар, рэлігійна-асветны публіцыст, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Францыі, Бельгіі і ЗША.

**1897** У Варшаве(?) памёр **Якуб Гейштар**, публіцыст, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**1907** У Галіцыі памёр **Юзаф Каліноўскі**, каталіцкі рэлігійны дзеяч, удзельнік паўстання 1863–1864 гг., пазней кананізаваны.

**1985** Памёр **Аляксандр Калодка**, грамадскі дзеяч, правазнавец, публіцыст, вязень фашысцкіх канцлагераў, дзеяч эміграцыі ў Аўстраліі. Пахаваны на беларускіх могілках Фолкнер у Мельбурне (Аўстралія).

**1987** Памёр **Рыгор Зыбайла**, палітычны і вайсковы дзеяч, сябар ЦК Беларускай Незалежніцкай Партыі, афіцэр Беларускай Краёвай Абароны, вязень ГУЛАГу.

## 16 лістапада

### Дзень Маці Божай Вострабрамскай – апякункі Беларусі

**1888** (ці 16 снежня) Нарадзіўся **Вінцэнт Гадлеўскі** (в. Шурычы, цяпер Свіслацкі р-н), рымска-каталіцкі святар, адзін з кіраўнікоў беларускага нацыянальнага супраціўлення ў гады Другой сусветнай вайны, ідэолаг беларускага нацыянальнага руху.

**1893** Нарадзілася **Леаніла Чарняўская** (жонка **Максіма Гарэцкага**; в. Таргуны, цяпер Докшыцкі р-н), перакладчыца, пісьменніца, настаўніца.

**1905** Нарадзіўся **Ян Скрыган** (в. Труханавічы, цяпер Капыльскі р-н), пісьменнік, перакладчык, вязень ГУЛАГу.

**1914** Нарадзіўся **Язэп Семяжон** (**Семяжонаў**; в. Пятровічы, цяпер Смалявіцкі р-н), перакладчык, літаратар.

**1920** У Слуцкім павеце створана антысавецкая Беларуская рада Случчыны — орган мясцовай улады, дзейнічала да канца студзеня 1921 г.

**1953** У Бабруйску нарадзіўся **Аляксандр Пракапенка**, футбаліст, чэмпіён СССР (1982), адзіны прадстаўнік Беларусі — бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў (1980).

**1982** Памёр **Андрэй Макаёнак**, драматург. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

## 17 лістапада

### Міжнародны дзень студэнтаў

**1640** Памёр **Стафан Пац**, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага. Нарадзіўся ў 1587 г.

**1825** У Цвярской губ. памёр **Зарыян Далэнга-Хадакоўскі**, вучоны-славяназнавец.

**1827** Памёр **Павел Брастоўскі** (**Бжастоўскі**), грамадскі і дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага.

**1893** Нарадзіўся **Кастусь Езавітаў** (г. Дзвінск, цяпер Даўгаўпілс, Латвія), дзеяч нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння, публіцыст, перакладчык, педагог, гісторык.

**1906** Нарадзіўся **Янка Багдановіч** (в. Гібінята, цяпер Валожынскі р-н), пісьменнік, мемуарыст, вязень савецкіх канцлагераў.

**1990** У Вільні ўстаноўлена памятная дошка **Францыску Скарыну**.

**1991** Кананізаваны **Юзаф Каліноўскі**, каталіцкі рэлігійны дзеяч, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**2005** Памерла **Клаўдзія Шышыгіна-Патоцкая**, настаўніца, краязнавец, даследчык гісторыі Нясвіжа. Нарадзілася ў 1935(?) г.

## 18 лістапада

**1700** Пачалася бітва пад Алькенікамі, у якой войска **Сапегаў** пацярпела паражэнне ад "рэспубліканцаў" на чале з **Вішнявецкім** і **Агінскім** (доўжылася 18–19 лістапада).

**1883** Нарадзіўся **Язэп Лёсік** (в. Мікалаеўшчына, цяпер Стаўбцоўскі р-н), грамадска-палітычны дзеяч, мовазнавец, пісьменнік, педагог.

**1902** Нарадзіўся **Міхась Машара** (хутар Падсосна, цяпер Шаркоўшчынскі р-н), пісьменнік, удзельнік заходнебеларускага нацыянальнага руху.

**1937** Расстраляны **Адам Бычкоўскі**, грамадска-культурны дзеяч. Нарадзіўся на Сакольшчыне ў 1889 г.

**1979** Памёр **Гаўрыіл Верасаў**, шахматыст, тэарэтык шахмат.

## 19 лістапада

**1784** (ці 1785) Нарадзіўся **Міхаіл Баброўскі** (в. Вулька, цяпер Беластоцкі пав. Падляскага ваяв., Польшча), вучоны-славіст.

**1991** Створана Беларускае прыватнае агенцтва навінаў (БелаПАН).

**1996** Са станцыі Яцукі (Дзятлаўскі р-н) адпраўлены эшэлон з апошняй ракетай "Тополь". Беларусь стала бяз'ядзернай дзяржавай.

**2004** Памерла **Юзэфа Найдзюк** (дзяв. **Брэчка**), дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША. Пахавана ў Пасадэне (Каліфорнія, ЗША).

## 20 лістапада

**1648** Каралём Рэчы Паспалітай і вялікім князем ВКЛ абраны **Ян Казімір** (1648–1668).

**1901** Нарадзіўся **Міхась Зарэцкі** (сапр. **Касянкоў Міхась**; в. Высокі Гарадзец, цяпер Талачынскі р-н), пісьменнік.

**1922** Нарадзіўся **Уладзімір Кісель** (г. Клецк), удзельнік падпольнай

арганізацыі Саюз Змагання за Незалежнасць Беларусі, вязень савецкіх канцлагераў і турмаў. Памёр 24 жніўня 1999 г. у Гродне. Пахаваны на могілках каля стан. Аўльс пад Гроднам.

**1948** Нарадзілася **Яўгенія Янішчыц** (в. Рудка Пінскага р-на), паэтэса.

**1985** У Беластоку памёр **Юрка Геніюш**, пісьменнік і публіцыст.

**1988** Памёр **Гаўрыла Гарэцкі**, геолаг, географ, эканаміст, дэмограф, дзеяч нацыянальна-культурнага руху.

**1998** Памерла **Яўгенія Шастак**, грамадскі дзеяч, лекар, вязень ГУЛАГу.

**1995** У Оршы пастаўлены помнік **Уладзіміру Караткевічу**.

## 21 лістапада

**1368** У бітве на рацэ Тросна войска Вялікага княства Літоўскага на чале з вялікім князем **Альгердам** пад час паходу на Маскву перамагло войска Маскоўскага княства.

**1830** Памёр **Ян Снядэцкі**, астраном, матэматык, філосаф, асветнік, прафесар Віленскага універсітэта. Пахаваны ў Яшунах (цяпер Шальчынінкайскі пав., Літва).

**1921** (ці 3 лістапада) Нарадзіўся **Янка Юхнавец** (в. Забродак, цяпер Докшыцкі р-н), пісьменнік, дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1937** У Чабаксарах (Чувашская АССР, цяпер Рэспубліка Чувашыя, Расія) расстраляны **Павел Каравайчык**, культурны дзеяч, пісьменнік.

**1926** У Віцебску адкрыўся Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатар імя **Якуба Коласа**.

**1990** Мінскі касцёл Св. Сымона і Алены пасля 46-гадовага перапынку вернуты католікам. Біскуп **Тадэвуш Кандрусевіч** адслужыў урачыстую імшу.

## 22 лістапада

**1654** Расійскае войска пасля трохмесяцовай аблогі захапіла Віцебск. Акупацыя горада доўжылася 13 гадоў.

**1715** Нарадзіўся **Антоні Скарульскі**, рэктар Навагрудскага езуіцкага калегіюма (1760–1764).

**1773** Створана Беларуская рымска-каталіцкая епархія з цэнтрам у Магілёве.

**1836** Памёр **Якуб Фалькоўскі**, педагог, тэолаг, літаратуразнавец.

**1930** Нарадзілася **Вера Бартуль** (дзяв. **Касцюкевіч**), дзеяч эміграцыі ў Вялікабрытаніі і ЗША.

**1944** Памёр **Кузьма Чорны** (сапр. **Раманоўскі Мікалай**), пісьменнік, класік беларускай літаратуры, публіцыст, вязень савецкіх турмаў. Пахаваны на Вайсковых могілках у Мінску.

## 23 лістапада

**1824** Нарадзіўся **Баляслаў Русецкі** (г. Рым), мастак, які працаваў у Беларусі.

**1866** У Кракаве памёр **Адам Кіркор**, беларускі і польскі гісторык, этнограф, археолаг, публіцыст, грамадскі дзеяч.

**1871** Нарадзіўся **Уладзімір Тэраўскі** (мяст. Раманава, цяпер Слуцкі р-н), кампазітар, харавы дырыжор, фальклараст.

**1906** У Вільні выйшаў першы нумар газеты "Наша ніва" (выдавалася да 20 жніўня 1915 г.).

**1938** Расстраляны **Мікола Красінскі**, культурны і рэлігійны дзеяч. Нарадзіўся ў Вілейцы (1886).

## 24 лістапада

**1970** У Клюшчанах Астравецкага р-на памёр **Адольф Клімовіч**, грамадскі дзеяч, журналіст, выдавец, вязень савецкіх канцлагераў.

**1905** Цар **Мікалай ІІ** падпісаў указ, у якім здымаліся ранейшыя забароны на выкарыстанне мясцовых моваў у дзевяці заходніх губернях Расійскай імперыі.

**1996** У Беларусі адбыўся рэферэндум, які скасаваў дзеянне Канстытуцыі 1994 г. У выніку рэферэндума Вярхоўны Савет 13-га склікання быў распушчаны, Дзень незалежнасці перанесены на 3 ліпеня, забаронены купля і продаж зямлі, у заканадаўстве пакінута смяротнае пакаранне.

## 25 лістапада

**1714** Нарадзіўся **Тамаш Жаброўскі** (маёнт. Дзятлава, цяпер Дзятлаўскі р-н), асветнік, архітэктар, астраном, матэматык.

**1795** Кароль Рэчы Паспалітай **Станіслаў Аўгуст Панятоўскі** ў гродзенскім Новым замку адрокся ад трона.

**1910** Нарадзіўся **Змітрок Астапенка** (в. Калеснікі, цяпер Хіславіцкі р-н Смаленскай вобл., Расія), паэт, перакладчык, вязень савецкага канцлагера. У пачатку Другой сусветнай вайны ўцёк з лагера на фронт, загінуў у баі ў Карпатах (кастрычнік 1944 г.).

**1925** У Мінску пачаўся (доўжыўся да 29 лістапада) першы з'езд паэтаў і пісьменнікаў аб'яднання "Маладняк".

**1988** Скончыла жыццё самагубствам **Яўгенія Янішчыц**, паэтэса. Пахавана на Усходніх могілках у Мінску.

**2002** У Гродне выйшаў першы нумар інфармацыйна-аналітычнага бюлетэню "Свой Лад" (выходзіў да траўня 2004 г., усяго выйшла 14 нумароў, рэдакцыя была разгромлена).

**2003** Памерла **Людміла Махнюк** (дзяв. **Каліноўская**), дзеяч культурнага руху ў эміграцыі ў ЗША. Пахавана на беларускіх могілках у Саўт-Рыверы (Нью-Джэрсі, ЗША).

## 26 лістапада

**1805** Нарадзіўся **Яўстах Янушкевіч** (в. Прусы, цяпер Салігорскі р-н),

кнігавыдавец, публіцыст, удзельнік паўстання 1830–1831 гг., мемуарыст. Памёр у 1874 г.

**1837** (ці 2 лістапада) Нарадзіўся **Міхаіл Эльвіра Андрыёлі** (г. Вільня), мастак, ілюстратар, удзельнік паўстання 1863–1864 гг.

**1864** Памёр **Тодар Нарбут**, гісторык, археолаг, краязнавец. Пахаваны ў в. Нача, цяпер Воранаўскі р-н.

**1885** У Канстантынопалі памёр **Адам Міцкевіч**, польскі паэт, цесна звязаны з Беларуссю, асветнік, філамат. Першапачаткова пахаваны ў Парыжы. 4 ліпеня 1890 г. перапахаваны ў Вавельскім замку (Кракаў).

**1891** Нарадзіўся **Янка Станкевіч** (в. Арляняты, цяпер Смаргонскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, мовазнавец, гісторык, перакладчык, выдавец, публіцыст, педагог, дзеяч эміграцыі ў Нямеччыне і ЗША.

**1896** Памёр **Канстанцін Ельскі**, падарожнік, заолаг, географ, геолаг.

**1909** Нарадзілася **Яніна Каханоўская** (Мінск), дзеяч эміграцыі ў ЗША.

**1920** У бітве за Капыль смяротна паранены **Піліп Валодзька**, актыўны ўдзельнік Слуцкага збройнага чыну. Памёр на наступны дзень, пахаваны на могілках каля Семежаўскай царквы.

**1930** Нарадзіўся **Уладзімір Караткевіч** (г. Орша), пісьменнік.

## 27 лістапада

**1900** Нарадзіўся **Вячаслаў Лаўскі** (в. Слачва, цяпер Навагрудскі р-н), грамадска-культурны дзеяч, педагог, адзін з заснавальнікаў беларускага студэнцкага руху.

**1903** Нарадзіўся **Піліп Пестрак** (в. Сакаўцы, цяпер Івацэвіцкі р-н), пісьменнік, дзеяч Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі.

**1920** Пачалося антысавецкае Слуцкае паўстанне (доўжылася да 28 снежня 1920 г.). Нацыянальны Дзень Герояў.

**1921** Нарадзіўся **Уладзімір Тарасевіч** (в. Клешнякі, цяпер Шчучынскі р-н), рэлігійны і грамадскі дзеяч беларускай эміграцыі ў ЗША.

**1938** Расстраляны **Сымон Рак-Міхайлоўскі**, грамадска-палітычны дзеяч, сябар Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, публіцыст, заснавальнік і дырэктар настаўніцкай семінарыі ў Барунах (1920–1922).

**1948** У Таронта створана Згуртаванне Беларусаў Канады.

**1976** На беларускай дзялянцы могілак Фолкнер у Мельбурне (Аўстралія) адбылося урачыстае асвячэнне помніка “На вечны ўспамін спачылых усіх ведамых і няведамых Беларусаў”.

**1996** З удзелам расійскіх вышэйшых дзяржаўных асобаў спынены імпічмент прэзідэнту **Аляксандру Лукашэнку**.

## 28 лістапада

**1923** Створана літаратурнае аб'яднанне "Маладняк" (дзейнічала да 1932 г.).

## 29 лістапада

